

Еўрапейскае гучанне Гюнеш

СТАР. 3



Шакаладная ванна дома

СТАР. 5



Стадыёны, медалі, талісманы

СТАР. 8



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЛЮТАГА 2014 г. СУБОТА № 24 (27634) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## ЗІМА. ПОЎДЗЕНЬ. АЛІМПІЯДА

SOCHI 2014


Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Анатоль Сланеўскі — з Сочы




**Такім чынам, галоўнае відовішча Алімпіяды вы ўжо бачылі. Грандыёзная, нават па расійскіх мерках, цырымонія адкрыцця XXII зімовых Алімпійскіх гульняў не пакінула абыякавым і тых, хто бачыў яе з трыбун стадыёна «Фішт», і, спадзяёмся, тых, хто глядзеў тэлетрансляцыю. Перадаваць жа словамі тое, што адбывалася на працягу трох гадзін, сёння няма сэнсу. Зразумела, расіянамі ўсё было зроблена для таго, каб, як той казаў, не плюхнуцца ў гразь. Здаецца, не плюхнуліся...**

Сёння нас гэта ўжо не хвалюе. Сёння — старты. Літаральна ля трапа самалёта ўдалося пагутарыць з Аляксеем Грышыным, першым і адзіным беларускім алімпійскім чэмпіёнам на зімовых Гульнях (залаты медаль заваяваны ў 2010-м у канадскім Ванкуверы), чэмпіёнам свету ў лыжнай акрабатыцы. Менавіта ён нёс сцяг Беларусі на цырымоніі адкрыцця.

***— Аляксей, кажуць, існуе нейкая непрыемная прыкмета для спартсменаў-чэмпіёнаў. Тыя з іх, хто нясе сцяг падчас адкрыцця Алімпіяды, быццам не могуць паўтарыць свой поспех...***

— Я наогул спаў, калі мне патэлефанавалі і паведамілі, што мне даверана несці сцяг краіны. Наколькі я зразумеў, такім было рашэнне прэзідэнта нашага Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Трэба — значыць панясём. Гэта вялікі гонар, я так лічу. Не ведаю, адкуль ідуць чуткі пра няўдачы. Калі спартсмен настроены на барацьбу, то ніякія прымхі і сурокі не змогуць яму перашкодзіць. Узгадайце таго ж Максіма Мірнага. Ён нёс наш сцяг на цырымоніі адкрыцця Лонданскай алімпіяды два гады назад. І гэта не перашкодзіла яму разам з Вікай Азаранкай заваяваць «золата». Так што не ў забабонах справа. Я з самага дзяцінства марыў выйграць Алімпіяду. Упершыню гэтая думка з'явілся, калі мне было гадоў 10, я выйграў юнацкія спаборніцтвы і, узышоўшы на п'едэстал, зразумеў: у мяне з'явілася мэта. Зразумела, у такім узросце я не мог думаць ні пра славу, ні пра багацце. Толькі перамога — а да яе трэба ісці крок за крокам...

**Беларускія біятланісткі на трэніроўцы.**
**На фота: Дар'я Домрачава і Настасся Дубарэзава.**



Фота БЕЛТА.

***— Але ж мы ведаем, калі прыходзіць апетыт...***

— Апетыт сапраўды прыходзіць. Галоўнае, каб не было такога: ты паставіў сабе мэту, дабіўся яе, а далей — апусташэнне... Я хачу сказаць, што няма ніводнага спартсмена ў свеце, які мае тры медалі чэмпіянатаў свету і тры медалі Алімпіяды. Калі я вазьму тут, у Сочы, трэці медаль, то буду адзіным. І наўрад ці хто ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі зможа дабіцца гэтага ж у такім экстрэмальным відзе спорту, як фрыстайл. Праўда, гэта зусім не азначае, што сюды я прыехаў, маючы «золата» і «бронзу», па «серабро». Толькі па «золата»!

СТАР. 8

## ПАВЕРХІ НАДЗЕІ



**Будаўніцтва новага 10-павярховага корпуса гарадской бальніцы № 1 імя Сямашкі ідзе ў Оршы. У новым будынку размесцяцца неўралагічнае, кардыялагічнае, гінекалагічнае, афтальмалагічнае, рэанімацыйнае і іншыя аддзяленні, аснашчаныя новым сучасным абсталяваннем. Рэканструкцыя бальніцы ідзе за кошт сродкаў абласнога бюджэту.**



Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЧАРГІНЕЦ, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі — старшыня Грамадскага савета па маралі:**

***«Назваць самым выродлівым помнік у Брэсце, які стаіць на крыві тысяч і тысяч людзей, могуць толькі тыя, у каго душа і сумленне выродлівыя. Гэты манумент нагадвае аб падзеях Другой сусветнай вайны і аб тым, што такое фашысцкая агрэсія. Павінны знайсціся аўтарытэтныя асобы, якія скажуць ім (журналістам амерыканскага тэлеканала CNN, якія ўключылі манумент у рэйтынг), што яны глыбока памыляюцца і тым самым абражаюць памяць мільёнаў людзей, якія пацярпелі і загінулі ад рук нямецка-фашысцкіх акупантаў. Падобнага кшталту заявы і такія «суддзі» заслугоўваюць таго, каб іх асудзіла грамадскасць тых краін, дзе яны жывуць, і асудзілі простыя людзі, якія не па чутках ведаюць, што такое зло».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.02.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9670,00 | ▲ |
| Еўра | 13140,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 279,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1114,06 | ▲ |

■ У новым фармаце

## «8 КАНАЛАЎ ПАВІННА БЫЦЬ У КОЖНЫМ ДОМЕ...»

### Калі ў вас ёсць кантракт з аператарам кабельнага тэлебачання, пераходу з «аналага» на «лічбу» вы нават не заўважыце



**Уявіце сабе: вы прачнуліся цёплай летняй раніцай, калі яшчэ толькі-толькі развіднела, пацягнуліся, акінулі адным расплюшчаным вокам пакой, прымушаючы сябе падняцца, намацалі на тумбачцы пульт ад тэлевізара, націснулі на чырвоную кнопку і... На экране з'явіўся толькі шэры «снег». Ніякага прагнозу надвор'я, навін, балбатні вядучых аб чарговым недарэчным сённяшнім «свяце» кшталту дня абдымкаў... Не хочаце, каб так адбылося? Тады ўжо сёння паклапаціцеся аб набыцці новага тэлевізара або спецыяльнай прыстаўкі для прыняцця лічбавага сігналу. 15 чэрвеня 2015 года будуць адключаны ад аналагавага вяшчання апошнія раёны. Як прайшло адключэнне «піянераў»? Што будзе далей і як сябе паводзіць? Пра гэта гутарым з намеснікам міністра інфармацыі Беларусі Дзмітрыем Шэдко.**

***— Засталося менш за паўтара года да адключэння аналагавага вяшчання. Як «лічбу» сустракалі ў першых адключаных раёнах?***

— Як і было запланавана, летась адбылося адключэнне аналагавых перадатчыкаў у чатырох раёнах (Асіповічы, Жлобін, Ясны Лес (Бабруйск), Касцюковічы) у розных абласцях нашай краіны. І працэс гэты быў плаўным, незаўважным для грамадзян. У кожным з раёнаў, дзе знікаў аналагавы сігнал, мясцовыя ўлады, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, Міністэрства інфармацыі зрабілі ўсё для таго, каб людзі не пацярпелі. Была аказана дапамога найбольш сацыяльна неабароненым слаям насельніцтва (тым сем'ям, у якіх няма сучаснага тэлевізара ці няма магчымасці набыць яго, і гэтак далей), праведзена актыўная кампанія ў сродках масавай інфармацыі — і ў рэспубліканскіх, і, асабліва, у мясцовых. Таму ў нас атрымалася рэалізаваць гэты праект так, як ён і павінен адбывацца па ўсёй краіне.

***— Што будзе далей?***

— Мы вельмі спадзяёмся, што такім жа чынам кампанія пройдзе па ўсёй краіне. Дарэчы, наступнымі ў чарзе стаяць Сінкевічы, Шаркаўшчына, Гомель і Беразіно. У гэтых пунктах «лічба» прапішацца 1 красавіка. Адключэнню абавязкова будзе папярэднічаць інфармацыйная кампанія. Будуць сустрэчы з людзьмі, падчас якіх растлумачаць усё незразумелае. Паралельна (мы гэтага доўга дабіваліся) паўсюль, дзе цяпер адключаецца аналагавы сігнал, паступова пачынаюць працаваць так званыя камерцыйныя 2-гі і 3-ці мультыплексы. Чалавек у любым раёне нашай краіны ўжо сёння можа мець абсалютна бясплатна восем дзяржаўных тэлеканалаў, якія ўключаны ў абавязковы агульнадаступны пакет. Цяпер жа беларус атрымае магчымасць і падключэння да камерцыйнага пакета. Па сутнасці, гэта такая ж паслуга як кабельнае тэлебачанне, толькі без кабеля. У дапаўненне да 8 асноўных будуць прапаноўвацца 24 каналы самай рознай тэматыкі па вельмі дэмакратычным кошце.

СТАР. 4

■ Калегія Генпракуратуры

## НЕ «БАБУЛЯ — БОЖЫ ДЗЬМУХАВЕЦ», А МОЦНЫ МУЖЧЫНА З АРСЕНАЛАМ?

**Перад пачаткам традыцыйнай калегіі Генпракуратуры па выніках мінулага года галоўны пракурор краіны Аляксандр КАНЮК адказаў на пытанні журналістаў. Адно з іх датычылася трагедыі, якая адбылася ў маскоўскай школе. У мінулы панядзелак дзесяцікласнік прыйшоў на ўрок з вінтоўкай і забіў настаўніка геаграфіі, а затым паліцэйскага, якога выклікаў школьны ахоўнік... Пасля гэтага расійскія ўлады ўсур'ёз задумаліся аб узмацненні мер бяспекі ў школах.**

— Расійскія калегі маюць рацыю, калі кажуць, што трэба наводзіць парадак у школах, — пракаментаваў Аляксандр Канюк. — У кожнай з іх павінен быць ахоўнік. Прычым гэта павінен быць прафесіянал, фізічна падрыхтаваны, моцны мужчына з нейкім арсеналам. Але не з гумавай дубінкай, якая нічога не дае. Мы, у сваю чаргу, думаем, над алгарытмам сваіх дзеянняў па навядзенні парадку ў беларускіх школах. Гэта ні ў якім разе не павінна быць кампанейшчына. Трэба папярэджваць злачынствы, і новы закон аб прафілактыцы, які ўступае ў сілу 16 красавіка, дае нам у гэтым плане больш паўнамоцтваў.

Генеральны пракурор расказаў таксама аб праверцы, якая праводзіцца на «Віцебскдрэве», пра гучную калійную справу і пра меры, якія прымаюцца ў дачыненні да ананімных інтэрнэт-карыстальнікаў.

### У дачыненні ААТ «Віцебскдрэў» завялі справу

— Мы праводзім праверку «Віцебскдрэва» па даручэнні Прэзідэнта. Як толькі пераканаліся, што ёсць усе падставы для завядзення крымінальнай справы, мы яе завялі. Але не ў дачыненні да канкрэтных асоб, а па факце нанясення шкоды дзяржаве зрывам тэрмінаў мадэрнізацыі. У межах гэтай справы праводзім праверку, устанаўліваем вінаватых, суму шкоды, якая нанесена дзяржаве. Будзем падаваць іскі ў суд аб яе кампенсацыі.

СТАР. 2

■ Курсавая розніца

## ПРАГНОЗ НЕ СПРАЎДЗІЎСЯ?

**Расійскі рубель адваяваў у «замежнікаў» пэўныя тэрыторыі: каля 1,5 рубля ў долара і 60 капеек у еўра. На такой аптымістычнай хвалі аналітыкі Цэнтрабанка Расіі сталі прадракаць яшчэ большае ўмацаванне рубля цягам лютага. Аднак прагноз будаваўся на магчымасці змен у еўразоне: маўляў, пачнецца праграма колькаснага змякчэння, што прывядзе да патаннення еўра адносна долара.**

Але неспадзяванка: пад канец тыдня еўра вырастае адносна долара, бо па выніках пасяджэння Еўрапейскі Цэнтрабанк не аб'явіў аб змякчэннях. Кіраўнік ЕЦБ Марыа Драгі заявіў, што рашэнне аб захаванні такой палітыкі прынята з-за складанай сітуацыі і неабходнасці дадатковай інфармацыі. Вось толькі чакаць яе прыйдзецца яшчэ да сакавіка. Значыць, аб моцным рублі пакуль што можна толькі марыць.

На нашым валютным рынку таксама змены. Еўра вярнуў страчаныя на мінулым тыдні 90 рублёў (плюс 0,7%) і стаў роўны 13140. У тым жа кірунку рухаўся расійскі рубель: падняўся на 6,5 грашовай адзінкі (плюс 2,4%) да 279,5. Традыцыйй прытрымліваўся толькі долар — як і апошнія некалькі тыдняў, вырас на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9670.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ПЫТАННІ МАЙДАНА ЎКРАІНЦЫ ПАДЗЯЛІЛІСЯ ПАРОЎНУ

Амаль палова ўкраінцаў (47%) падтрымліваюць Майдан, не падтрымліваюць — 46,1%, сведчыць апытанне, праведзенае Цэнтрам даследаванняў «Соцыс» сумесна з Кіеўскім міжнародным інстытутам сацыялогіі. Згодна з вынікамі апытання, абнародаванымі ў пятніцу ў прэс-цэнтры агенцтва «Інтэрфакс-Украіна», цалкам падтрымліваюць Майдан 26,8% апытаных; хутчэй, падтрымліваюць — 20,9% рэспандэнтаў. Не падтрымліваюць акцыі пратэсту 31,3% украінцаў; хутчэй, не падтрымліваюць — 14,8%. Разам з тым, большасць апытаных (63,3%) лічыць, што для дасягнення пазітыўнага выніку неабходна садзіцца за стол перамоў (пры гэтым працэс павінен быць публічным). 11,1% рэспандэнтаў перакананы, што для вырашэння канфлікту неабходна прымяніць сілу. Апытанне праводзілася з 24 студзеня па 1 лютага ва ўсіх рэгіёнах Украіны. Усяго было апытана 2400 рэспандэнтаў.

### ДА ПОЛЬСКАЙ КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ ЎПЕРШЫНЮ ПАДАЛІ ІСК АБ ПЕДАФІЛІІ

Жыхар Польшчы ўпершыню ў гісторыі гэтай краіны падаў грамадзянскі іск супраць Каталіцкай царквы, абвінаваціўшы яе святара ў сваім растленні, паведамляе BBC News. У якасці кампенсацыі нанесенай яму маральнай і фізічнай шкоды Марцін К. патрабуе ад царквы 47500 еўра. Святар, ад дзеянняў якога пацярпеўісцец, знаходзіцца ў турме, дзе адбывае двухгадовы тэрмін. У мінулым грамадзянскія іскі па справах аб гвалтаванні малалетніх святарамі падаваліся толькі супраць асоб, але ніколі супраць Царквы як арганізацыі. Кіраўніцтва самой Царквы раней заявіла, што не збіраецца расплачвацца за дзеянні асобных святароў. Іск супраць Польскай каталіцкай царквы пададзены на фоне супрацьстаяння Ватыкана і камісіі ААН па правах дзяцей. Камісія абвінаваціла Ватыкан ва ўкрывальніцтве святароў, западозраных у педафіліі.

### УЛАДЫ ІРАНА АХВЯРАВАЛІ ЯЎРЭЙСКАЙ БАЛЬНІЦЫ 400 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

Урад Ірана ахвяраваў 400 тысяч долараў адзінай у краіне яўрэйскай бальніцы. Як паведамляе The New York Times са спасылкай на агенцтва Mehr, грошы атрымала бальніца імя доктара Сапіра, размешчаная ў Тэгеране. Па інфармацыі The New York Times, грошы ва ўстанову асабіста прынёс Хасейн Ферайдун, брат іранскага прэзідэнта Хасана Рухані. Па словах Ферайдуна, «наш урад паставіў перад сабой задачу аб'яднаць усе этнасы і рэлігіі».


ISSN 1990 - 763X


### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

#### У РАСІІ ПРАПАНУЮЦЬ ВЫКЛЮЧЫЦЬ CNN З КАБЕЛЬНЫХ СЕТАК З-ЗА БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ



Скандал вакол ці то выпадковага неасцярожнага, ці то наўмыснага агрэсіўнага выпаду тэлеканала CNN у адрас помніка абаронцам Брэсцкай крэпасці атрымаў чаканае развіццё. За незадаволенасцю ў сувязі са зняважлівай ацэнкай амерыканскімі журналістамі савецкага ваеннага манумента (уключэннем у рэйтынг самых пачварных помнікаў) у адказ было прапанавана падумаць аб адключэнні вяшчання канала на тэрыторыі Расіі.

«Такая санкцыя — прыпыненне на нейкі час вяшчання CNN у РФ па кабельных каналах — неабходная як паказальная мера», — заявіў член камітэта Савета Федэрацыі па міжнародных справах Ігар Марозаў. Раскамнагляд адрэагаваў аператыўна. Прапанова сенатара будзе вывучана, калі яна паступіць у ведамства, паабяцаў яго прэс-сакратар Вадзім Ампялонскі. На думку сенатара, гэта трэба, каб CNN і іншыя СМІ ведалі «меру і абмежаванні сваёй публічнасці, разумелі, якія адзнакі яны могуць публічна даваць, а якія — катэгарычна не».

Назваўшы характарыстыку, якую дало CNN манументу «Мужнасць», «палітычна некарэктнай і абразлівай для ўсяго расійскага народа», Марозаў нагадаў, што помнік ствараўся як сімвал сілы духу савецкага народа, якія праявіліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны. «Брэсцкая крэпасць для нас — аснова нашага разумення патрыятызму, гераізму, любові да Радзімы, і манумент выглядае так, як мы сабе ўяўляем гэтыя каштоўнасці», — падкрэсліў Марозаў.

### КОРАТКА

Афармленне станцый і рухомага саставу мінскага метро да ЧС-2014 па хакеі будзе завершана да 1 красавіка. Для зручнасці балельшчыкаў расклады гульняў чэмпіянату, што пройдуць у «Мінск-Арэне» і «Чыжоўка-Арэне», будуць размешчаны ва ўсіх вагонах метро і каля кас у вестыбюлях станцый.

Падатковыя плацяжы фізічных асоб Беларусі за 2013 год узраслі ў супастаўных цэнах на 33,9 працэнта да ўзроўню 2012 года і склалі Br3 трлн 13 млрд. У цэлым на ўліку ў падатковых органах рэспублікі знаходзяцца 3 млн 49 тыс. 387 фізічных асоб, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі падаткаў.

Падазронаму ва ўчыненні смяротнага ДТЗ на вуліцы Багдановіча ў Мінску прад'яўлена абвінавачанне. Абвінавачаны, жыхар Наваполацка 1986 года нараджэння, вадзіцель і ўладальнік аўтамабіля Toyota Avensis, сам з'явіўся ў праваахоўныя органы з пакаяннем.

■ Уласны кашалёк

## ПАДСУМАВАЦЬ ДАХОДЫ ЗА ГОД ТРЭБА ДА 3 САКАВІКА

**Пэўная частка падаткаплацельшчыкаў нашай краіны павінна сёлета да першых дзён вясны падаць у падатковыя органы дэкларацыю аб даходах за мінулы год. У сувязі з тым, што 1 сакавіка прыпадае на суботу, то апошняй датай падачы дэкларацыі лічыцца 3 сакавіка. Тут трэба адразу адзначыць, што далёка не ўсе абавязаны наведваць падатковую інспекцыю. Па-першае, дэкларацыі запаўняюць толькі падатковыя рэзідэнты нашай краіны. А гэта фізічныя асобы, якія фактычна знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі больш за 183 дні ў каляндарным годзе. Па-другое, у часткі плацельшчыкаў існуе права падаць такую дэкларацыю, каб потым атрымаць падатковы вылік. Але ёсць і тыя, хто павінен абавязкова «пасябраваць» з падатковай дэкларацыяй.**




Фота БЕЛТА.

### Дэклараваць продаж некалькіх аб'ектаў нерухомасці

Не пазней за 3 сакавіка абавязкова падаць дэкларацыю павінны тыя людзі, што на працягу 5 гадоў прадалі іншым фізічным асобам другую кватэру ці другі жылы дом (гараж, зямельны ўчастак, садовы домік, дачу ці іншую нерухомую маёмасць). За даходы ад продажу такой маёмасці неабходна будзе заплаціць падаткі ў бюджэт. Падаюць дэкларацыю па выніках года і тыя падаткаплацельшчыкі, хто летась прадаў грузавік, аўтобус або другую легкавую машыну; пасля рэалізацыі каштоўных папер, маёмасных правоў, доляў ці паёў у арганізацыях.

СТАР. 2

■ Тэма дня

# «НЕПРЫВАТНЫЯ» ПРАБЛЕМЫ ПРЫВАТНАГА БІЗНЕСУ

## Банкаўская сістэма павінна павярнуцца тварам да малых і сярэдніх прадпрыемстваў

**Якія праблемы патрабуюць вырашэння, каб палепшыць экспартныя магчымасці прыватнага бізнесу? Гэтую тэму абмяркавалі ў Гродне на чарговым пасяджэнні рэспубліканскага Савета па развіцці прадпрымальніцтва.**

**Старшыня рэспубліканскага Савета па развіцці прадпрымальніцтва Пётр ПРАКАПОВІЧ** адзначыў, што ў апошнія гады ў краіне шмат зроблена ў плане прэферэнцый, удасканалення нарматыўнай базы для малога і сярэдняга бізнесу. Аднак яшчэ застаюцца элементы бюракратыі ў рабоце органаў кіравання, перашкоды на шляху развіцця прыватнага бізнесу і яго экспартнага патэнцыялу. І калі гэтыя праблемы цяпер не вырашыць, не ўзмацніць свае экспартныя пазіцыі, то праз некалькі гадоў будзе ўжо позна: рынкі на тэрыторыі Мытнага саюза (а неўзабаве і Еўразійскага эканамічнага саюза) будуць заняты іншымі.

На думку **заснавальніка СТАА «Контэ Спа» Валянціна БАЙКО,** сёння ніхто нікога на рынках не чакае, і таму, каб ажыццяўляць знешнеэканамічную дзейнасць, даводзіцца рызыкаваць. Калі не заплацяць своечасова за адгружаную прадукцыю — прадпрыемству за гэта штраф альбо нават крымінальнае праследаванне. А сёння праблематычна ўкласціся ў вызначаны тэрмін вяртання валютнай выручкі. Адтэрміноўка плацяжу па экспарце, у прыватнасці, у Расію магчыма да 90 дзён. Аднак гандлёвыя сеткі дыктуюць тэрмін 120-180 дзён плюс час на дастаўку тавару. Ёсць, вядома, магчымасць звароту праз аблвыканкам у Нацыянальны банк з просьбай аб адтэрміноўцы, але гэта звязана з пэўнай валакітай. Ды і можна стаць парушальнікам у выпадку, калі ў такім дазволе адмовяць.

Асабліва складана замацавацца са сваёй прадукцыях на знешніх рынках невялікім прадпрыемствам. І тут сваё плячо ім павінна падставіць наша ўжо існуючая таваратправодная сетка ў замежжы, лічыць **старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір КАРАГІН:**

— Трэба прадумаць такую сістэму, каб усе кропкі нашай таваратправоднай сеткі працавалі і на гэтых невялікіх вытворцаў, якія вырабляюць нешта гатовае для экспарту. Вядома, не са стратамі для сябе, але на прымальных для такіх прадпрыемстваў умовах, каб цана іх тавару была канкурэнтаздольнай.

Акрамя таго, Уладзімір Карагін лічыць абсурднай забарону суб'ектам гаспадарання купляць невялікія партыі камплектуючых, сыравіны і матэрыялаў за наяўны разлік:

— Дазвольце тое, што дазволена тым жа расійскім прадпрыемствам. І гэта будзе на карысць нашага будучага экспарту.

Пры гэтым рэаліі цяпер такія, што дзяржаўная падтрымка малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў пытаннях знешнеэканамічных сувязяў практычна адсутнічае. На фінансавым рынку назіраецца востры дэфіцыт эфектыўных і даступных крэдытных праграм для невялікіх прадпрыемстваў, якія адпавядалі б іх рэальным патрэбам. Яны вымушаны працаваць ва ўмовах вельмі дарагіх пазыковых сродкаў, неспрыяльнага доступу да сыравіны, а таксама надзвычай высокіх арэндных ставак.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ПАДСУМАВАЦЬ ДАХОДЫ...

### Даходы з-за мяжы

Спецыялісты падатковай галіны асобна адзначаюць, што абавязкова дэкларуюцца любыя даходы, што былі атрыманы за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны. Падобнымі даходамі лічацца сёлета і крэдыты ад замежнікаў.

Цяпер гэта і даходы ў выглядзе пазык і крэдытаў, атрыманых ад замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць на тэрыторыі Беларусі; ад грамадзян, якія не адносяцца да тых асоб, што пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны, і ад замежных індывідуальных прадпрымальнікаў.

Гэтыя пазыкі і крэдыты дэкларуюцца ў падатковых службах у тым выпадку, калі яны былі атрыманы ў 2013 годзе, але летась пагашаны не былі. Калі крэдытаатрымальнік цалкам вярнуў такія грошы на працягу 2013 года, то падобны даход дэклараваць не трэба. Не трэба дэклараваць пазыкі і крэдыты, атрыманыя ад блізкіх сваякоў і асоб па лініі сваяцтва (муж, жонка). Блізкімі сваякамі лічацца маці, бацька, родныя брат і сястра, дзед і бабуля, дзеці, унукі і праўнукі.

У пададзенай дэкларацыі адлюстроўваюцца грашовыя сродкі, якія яшчэ не вярнулі. На такую суму непагашаных крэдытных сродкаў налічваецца падатак у памеры 12%. Пасля таго, як такая пазыка, атрыманая ад замежнікаў, будзе цалкам пагашана, то падатковыя органы аддадуць раней аплачаны падатак. Запаўняць падагульняючую дэкларацыю будуць тыя, хто атрымаў даходы ад фізічных асоб, што не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у выглядзе дарэння нерухомай маёмасці і (або) па дамовах рэнты бязвыплатна пры ўмове, што такія даходы ў агульнай суме за мінулы год перавысілі 500 базавых велічынь.

Вядома, што пры здачы кватэр гаспадары жылля плацяць штомесяц фіксаваную стаўку падаходнага падатку, аднак... Па выніках года дэкларуюцца даходы, што былі атрыманы ад здачы ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) грамадзянам жылых і нежылых памяшканняў, калі памер падобнага даходу за год склаў больш за 33,1 мільёна рублёў.

Наведаць падатковую інспекцыю трэба будзе і тым грамадзянам, якія вярнулі ўзносы (у тым ліку праіндэксаваныя) пасля спынення будаўніцтва кватэр ці індывідуальных жылых дамоў або ў выпадку патанння будаўніцтва, а таксама тады, калі чалавек выбывае з членаў арганізацый забудоўшчыкаў да заканчэння будаўніцтва жылога дома.

Дэклараваць такія даходы трэба ў сувязі з тым, што на гэтыя ўзносы распаўсюджваўся прынцып маёмаснага падатковага выліку, звязанага з будаўніцтвам ці набыццём жылля. Дэклараваць свае даходы па выніках года павінны і тыя грамадзяне, у каго ўтрыманне падатку з такіх сум не прадугледжана падатковымі агентамі з ліку арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў.

### МАЙ НА ЎВАЗЕ

❍ Дэклараваць свае даходы па выніках года павінны і тыя грамадзяне, у каго ўтрыманне падатку з такіх сум не прадугледжана падатковымі агентамі — арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

❍ Падатак за здачу кватэры павінен плаціць не кватарант, а ўласнік жылля, які атрымлівае адпаведны даход. У Мінску фіксаваны падатак за здачу аднаго жылога памяшкання летась вызначаны ў межах ад 95 да 135 тысяч рублёў у месяц за кожны пакой.

❍ Кароткачасовая арэнда жылля падпадае пад прадпрымальніцкую дзейнасць. Калі чалавек здае кватэру ў кароткачасовую арэнду без адпаведнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, то гэта ўжо ажыццяўленне незарэгістраванай прадпрымальніцкай дзейнасці. У такім выпадку наша заканадаўства прадугледжвае нават канфіскацыю маёмасці, якая выкарыстоўвалася пры ажыццяўленні незарэгістраванай індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасці. У гэтай сітуацыі канчатковае рашэнне прымае суд, калі факты парушэння будуць устаноўлены.

❍ Дэкларацыю аб даходах і маёмасці могуць патрабаваць у любога грамадзяніна ў тым выпадку, калі ў падатковай інспекцыі ўзнікнуць пытанні аб тым, за якія даходы была набыта тая ці іншая маёмасць.

❍ Тэрміну даўнасці па падатковых парушэннях не існуе. Як правіла, праверкі ажыццяўляюцца за апошнія 10 гадоў.

### Запаўняць дэкларацыю лепш у інспекцыі

Непасрэдна дэкларацыю аб даходах за мінулы год падаюць у падатковы орган асабіста ці праз прадстаўніка. Магчыма накіроўваць такі дакумент у інспекцыю па пошце і ў электронным выглядзе.

Разам з тым, спецыялісты МПЗ адзначаюць, што ў дэкларацыях, дасланых па пошце, часам сустракаецца даволі шмат памылак, якія хутка выправіць немагчыма. Таму падаткаплацельшчыку лепш самастойна наведаць інспекцыю і атрымаць там кваліфікаваную кансультацыю ад спецыяліста.

Тут трэба адразу нагадаць, што бліжэй да «часу пік» у падатковых інспекцыях могуць назірацца вялікія чэргі, а вось да трэцяй дэкады лютага там звычайна свабодна. Цяпер прыём дэкларацый ажыццяўляецца падатковымі органамі па агульным графіку з 8.00 да 19.00 у працоўныя дні. Магчыма, што ў лютым асобныя інспекцыі будуць працаваць па лініі дэклараванні і па суботах.

### Прадугледжана адказнасць

У тым выпадку, калі грамадзянін, які абавязаны быў гэта зрабіць, забыўся ці вырашыў не падаваць дэкларацыю, то ён атрымае штраф — 2 базавыя велічыні (зараз гэта 260 тысяч рублёў) плюс па 0,5 базавай за кожны месяц пратэрміноўкі. Аднак потым і падаткі неабходна будзе заплаціць напоўніцу.

Дарэчы, калі дэкларацыю аб даходах за мінулы год неабходна падаваць да 3 сакавіка, то заплаціць падаткі ў бюджэт неабходна будзе да 15 мая.

### Можна атрымаць падатковыя вылікі

Калі чалавек пераплаціў падаходныя падаткі за мінулы год, то праз інспекцыі гэтыя грошы ён можа яшчэ вярнуць. У гэтым выпадку дэкларацыю аб даходах за год падаюць тыя грамадзяне, якія маюць права на атрыманне падатковых вылікаў (сацыяльных, маёмасных і прафесійных), пры ўмове, што абавязак па прадастаўленні такіх вылікаў грамадзянам ускладзены на падатковыя органы. Увогуле ўзор формы падатковай дэкларацыі аб даходах за год можна знайсці на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах (www.nalog.gov.by).

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЗАЯВА

**Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы і Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах аб сітуацыі ва Украіне**

*З трывогай сочым за развіццём сітуацыі ў суседняй сяброўскай Украіне. Занепакоены сур'ёзнай дэстабілізацыяй становішча ў краіне і шкадуем аб ахвярах, да якіх прывяло сілавое супрацьстаянне.*

*Выступаем за ўрэгуляванне палітычнага крызісу ва Украіне шляхам канструктыўнага, цывілізаванага дыялогу пры безумоўным выкананні прынцыпаў вяршэнства закону і без якога-небудзь умяшання звонку ў справы суверэннай дзяржавы.*

*У гэтай сувязі лічым непрымальнымі і контрпрадуктыўнымі заявы і дзеянні асобных замежных палітыкаў і структур, якія непрыкрыта ўмешваюцца ва ўнутрыпалітычныя працэсы ва Украіне.*

*Яркі апошні прыклад — прыняцце Еўрапейскім парламентам 6 лютага 2014 года рэзалюцыі па Украіне, якая змяшчае прадузятыя ацэнкі, а таксама пагрозы і заклікі да санкцый.*

*Упэўнены, што ўкраінскі народ сам зможа знайсці выйсце з сітуацыі, якая склалася, без якіх-небудзь знешніх ультыматумаў і ціску.*

# АБ'ЯДНАНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ СЯБЕ АПРАЎДАЎ

**Практыка паказвае, што стварэнне Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз апраўдала сябе. Такое меркаванне выказаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў падчас наведвання камітэта, паведамляе БелТА.**

Дзяржкамітэт судовых экспертыз пачаў дзейнасць з 1 ліпеня 2013 года. Ужо цяпер можна гаварыць аб станоўчым эфекце — павелічэнні аператыўнасці правядзення экспертыз, іх якасці. Сваю ролю адыграла тое, што камітэт аб'яднаў патэнцыял усіх судовых экспертаў, паколькі быў утвораны на базе экспертных падраздзяленняў органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, Узброеных Сіл, Міністэрства юстыцыі, а таксама Дзяржаўнай службы медыцынскіх судовых экспертыз, падкрэсліў Аляксандр Радзькоў.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта пабываў у лабараторыях дзяржкамітэта, сустрэўся з яго асабовым складам. Аляксандр Радзькоў звярнуў увагу на вялікую адказнасць, якая ўскладзена на спецыялістаў. Яны выконваюць адну з найважнейшых дзяржаўных задач — забяспечваюць прававую абароненасць грамадства, падаючы судам, праваахоўным органам якасна падрыхтаваную доказную базу. «Яны шмат у чым забяспечваюць упэўненасць чалавека ў тым, што калі ён мае рацыю, паводзіць сябе як годны грамадзянін, то ён у бяспецы», — адзначыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Гаворачы аб асабістых якасцях, якія павінны быць уласцівыя супрацоўнікам дзяржкамітэта, Аляксандр Радзькоў назваў высокі ўзровень прафесіяналізму і грамадзянскай адказнасці. «Тут павінны быць найбольш падрыхтаваныя афіцэры. Грамадзяне высокай пробы. На выніках іх працы грунтуецца абвінавачванне ці абарона. Часта за імі вырашэнне лёсу чалавека. Яны павінны гэта разумець, быць да гэтага падрыхтаванымі, быць адпаведным чынам выхаванымі», — падсумаваў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

# НЕ «БАБУЛЯ — БОЖЫ ДЗЬМУХАВЕЦ», А МОЦНЫ МУЖЧЫНА З АРСЕНАЛАМ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мадэрнізацыя мае на ўвазе вызначаныя тэрміны і графікі. Гэта значыць, што прадпрыемства павінна своечасова пачаць выпуск прадукцыі. Але калі гэтага не адбываецца, хто адкажа за тое, што дзяржава ўклала грошы і не атрымлівае выгаду? Гэта ўпушчаная выгада. І яе неабходна спаганяць з вінаватых асоб. Рацыянальнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў і пытанні безгаспадарлівасці — сёлета гэта адзін з прыярытэтных кірункаў нашай дзейнасці.

Журналісты выказалі занепакоенасць, што празмерная ўвага да прадпрыемстваў можа нашкодзіць тым, хто добрасумленна працуе. Ці не стане гэта «паляваннем на вядзьмарак»?

— Ні пра якое «паляванне на вядзьмарак» гаворка не вядзецца. Няма прычын для хваляванняў. Мы гаворым выключна аб беражлівым выдаткоўванні дзяржаўных сродкаў. Калі ў кіраўніка далёка не самага буйнога прадпрыемства 12 намеснікаў ці 50 службовых машын, то такія факты ігнараваць нельга, трэба прымаць меры.

— Акрамя таго, мы праверым выкананне падатковага заканадаўства, у тым ліку Міністэрствам па падатках і зборах, а таксама мясцовымі органамі, — прадоўжыў Аляксандр Канюк. — На жаль, пакуль у Беларусі яшчэ няма разумення таго, што падатковыя злачынствы — адны з самых цяжкіх. Калі не выплаціў падатак, напрыклад, у Германіі — праз дзень будзеш у турме. У нас такога менталітэту яшчэ няма, у нас занадта лёгкае стаўленне да падаткаў.

**Хто адкажа за тое, што дзяржава ўклала грошы і не атрымлівае выгаду? Гэта ўпушчаная выгада. І яе неабходна спаганяць з вінаватых асоб.**

### Пра калійную справу

«Мы будзем падаваць іск у суд і спаганяць матэрыяльную шкоду незалежна ад таго, будзе чалавек прыцягнуты да крымінальнай адказнасці ці не. Гэта датычыцца і калійнай справы, і справы па «Віцебскдрэве», калі віна будзе даказана. У Беларусі прапрацоўваецца пытанне аб змяненні судовай практыкі ў частцы спагнання шкоды. Сёння такое паняцце, як упушчаная выгада, не адносіцца да рэальнай шкоды ў межах крымінальнай справы і не з'яўляецца прадметам даказвання. Але мы будзем заяўляць іскі ў рамках грамадзянскага судаводства і спаганяць гэтую страчаную выгаду.

Калійная справа яшчэ расследуецца, наладжана актыўнае супрацоўніцтва з расійскімі калегамі. Я хачу, каб вы разумелі, што мы не перадавалі ў Расію цалкам справу, а толькі асобныя матэрыялы з яе (Генпракуратура Беларусі дала згоду на выдачу Расіі затрыманага ў Мінску гендырэктара «Уралкалія» і кіраўніка назіральнага савета Беларускай калійнай кампаніі (БКК) Уладзіслава Баўмгертнера). Мы працягваем расследаваць «калійную справу» і выяўляць беларускіх грамадзян, якія маюць дачыненне да гэтай шкоды (следчыя органы Беларусі лічаць, што супрацьпраўныя дзеянні Баўмгертнера і шэрагу іншых топ-менеджараў БКК нанеслі «Беларуськалію» і БКК шкоду ў памеры да $100 млн).

### Пра зневажанні на форумах

Што тычыцца абраз у інтэрнэце, на форумах, то, як адзначыў Генпракурор, нядаўна ўстанавілі факт абразы адной высокай службовай асобы выканкама.

«Вылічыць гэтага чалавека было складана, бо на форумах людзі хаваюцца пад несапраўднымі фота, псеўданімамі. Тым не менш, вылічылі. Гэты чалавек, які «палівaў брудам» чыноўніка, жыве недалёка ад выканкама. На першы раз мы яго папярэдзілі. Будзем і надалей адсочваць правапарушэнні ў інтэрнэце. Людзі павінны разумець, што бясследна гэта не пройдзе».

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Бяспека

# УВОДЗІЦЦА ЧАСОВАЯ ЗАБАРОНА НА ПЕРАВОЗКУ ВАДКАСЦЯЎ АВІЯПАСАЖЫРАМІ

**На тэрыторыі Расійскай Федэрацыі ўведзена часовая забарона на перавозку пасажырамі на борце паветранага судна ў рэчах, што знаходзяцца пры іх, любых ёмістасцяў (кантэйнераў) з вадкасцямі, аэразолямі, гелямі, крэмамі, пастамі. Гэтая мера прынята ў мэтах забеспячэння бяспекі ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульняў у Сочы.**



Выключэнне складаюць лекі, спецыяльныя дыетычныя патрэбы, дзіцячае харчаванне, у тым ліку мацярынскае малако ў колькасці (аб'ёме), неабходным на час палёту, пры ўмове іх ідэнтыфікацыі падчас перадпалётнага дагляду.

Вадкасці і напоі, набытыя ў стэрыльнай зоне аэрапорта пры ўмове наяўнасці дакладнага пацвярджэння здзяйснення пакупкі ў дзень (дні) паездкі, дапускаюцца на борт паветраных суднаў ва ўстаноўленым парадку ў празрыстых запячатаных пакетах ўстаноўленага ўзору, якія забяспечваюць ідэнтыфікацыю іх змесціва.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Мінтранса, з улікам вышэйвыкладзенага, а таксама ў адпаведнасці з просьбай Міністэрства транспарту Расійскай Федэрацыі, у аэрапортах нашай краіны на часовай аснове з 7 лютага ўводзяцца дадатковыя меры бяспекі ў дачыненні да рэйсаў, якія авіяперавозчыкі выконваюць у аэрапорты Расійскай Федэрацыі. Яны аналагічныя тым мерам, што часова ўведзены на паветраным транспарце Расіі.

Для змяншэння часу правядзення перадпалётнага дагляду пасажырам рэкамендуецца загадзя размяшчаць у багаж вадкасці, аэразолі, фарбы і гелі, у тым ліку ёмістасцю менш за 100 міліграмаў, якія плануецца ўзяць з сабой у палёт.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# ВАДАМЕР БЫЎ СПРАЎНЫМ. ТАДЫ Ў ЧЫМ ПРАБЛЕМА?

**25 верасня мінулага года ў мінчанкі Соф'і Васільеўны Рокач замянілі ў кватэры вадамер. І пасля таго ў яе істотна павялічыўся расход вады. Калі да замены лічыльніка ў месяц набягаў кубаметр, дык пасля спачатку шэсць, а затым і ўвогуле — адзінаццаць кубаметраў. Трэба сказаць, што Соф'і Васільеўне — 94 гады, яна пражывала і пражывае ў кватэры адна. Вядома, у такім паважаным узросце самастойна разабрацца ў сітуацыі чалавеку складана. Па гэтай прычыне дапамогі прасіла не яна, а яе 75-гадовая малодшая сястра.**

— Тэлефанавалі ў дыспетчарскую водаканала. Там сказалі, што выклік майстра абыдзецца ў 94,8 тысячы рублёў. Гэта толькі за тое, каб ён паглядзеў вадамер. Але ж да яго замены ніякіх праблем не было, — распавяла тая.

Начальнік участка па замене і рамонце лічыльнікаў «Мінскводаканала» Васіль Ананіч паабяцаў правесці праверку вадамера. Спачатку жанчыне бясплатна замянілі прыбор, на які паступіла скарга, на новы. Неўзабаве Васіль Васільевіч паведаміў, што праведзеная праверка пацвердзіла працаздольнасць таго вадамера: лічыльнік спраўны.

— У кватэры застаецца нядаўна ўстаноўлены новы прыбор. Праз месяц праверым паказчыкі — ці было за гэты час у спажыўца перавышэнне расходу вады, — сказаў Васіль Васільевіч.

Адносна ж вышэйназванай лічбы 94,8 тысячы рублёў спецыяліст патлумачыў: маўляў, гэта кошт паслугі, якая аказваецца прадпрыемствам па правядзенні дадатковай праверкі прыбораў уліку ў міжправерачны перыяд.

— Пасля праверкі прыборы ўстанаўліваюцца з гарантыяй на два гады. Дапусцім, у гэты перыяд грамадзянін па нейкай прычыне засумняваўся, ці правільна працуе вадамер, хоча пераканацца ў яго спраўнасці. Выязджае майстар, здымае лічыльнік, устанаўлівае новы, зняты вязе на базу, правярае на стэндзе, — распавёў начальнік участка па замене і рамонце лічыльнікаў. — Вось з гэтага і складаецца кошт дадатковай паслугі. Калі пасля такой праверкі выявіцца які-небудзь дэфект вадамера, гэта будзе прызнана гарантыйным выпадкам і заплачаныя грошы вернуць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Грошы

# НАЦРЭЗЕРВЫ ЗМЕНШЫЛІСЯ, АЛЕ ЎЗРОВЕНЬ ПАДТРЫМЛІВАЕЦЦА

**Па выніках студзеня золатавалютныя рэзервы Беларусі скараціліся (згодна з метадалогіяй МВФ) на 427,7 млн долараў ЗША і, па папярэдніх звестках, на 1 лютага склалі 6,223 млрд долараў у эквіваленце, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.**

У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў скараціўся на 435,1 млн долараў і на 1 лютага склаў 6,802 млрд. «Асноўным фактарам, які паўплываў на зніжэнне золатавалютных рэзерваў, стала аплата ўрадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме», — заяўляюць у галоўным банку краіны. У той жа час падтрыманню ўзроўню нацрэзерваў спрыяў рост цаны на золата на міжнародным рынку каштоўных металаў.

# НАСЕЛЬНІЦТВА СТАЛА ПРАДАВАЦЬ ВАЛЮТУ

**Беларусы ў студзені былі чыстымі прадаўцамі замежнай валюты, а юрыдычныя асобы — чыстымі пакупнікамі. Аб гэтым гаворыць статыстыка Нацыянальнага банка.**

Так, у мінулым месяцы фізічныя асобы прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты на 787,6 млн долараў ЗША ў эквіваленце, а набылі — 713,1 млн. Такім чынам, чысты продаж валюты за студзень склаў 74,5 млн долараў. Аднак насельніцтва набыло на чыстай аснове 24,4 млн долараў безнаяўнай валюты. А вось продаж фізічнымі асобамі гатоўкі за студзень склаў 710,8 млн долараў, купля — 611,8 млн. Атрымліваецца, што чысты продаж склаў 99 млн долараў. У сваю чаргу, суб'екты гаспадарання — рэзідэнты Беларусі — за студзень прадалі замежнай валюты на 1,6673 млрд долараў, набылі — 1,7564 млрд. Чыстая купля склала 89,2 млн. Юрыдычныя асобы — нерэзідэнты Беларусі прадалі за студзень 74,3 млн долараў у эквіваленце, а набылі — 106,7 млн, прычым чыстая купля склала 32,4 млн.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

■ Час і норавы

# ЗАБАРОНЕНАЯ «КЛУБНІЧКА»

## Сярод прыцягнутых летась да адказнасці за прастытуцыю — 45 мужчын

**Ужо колькі гадоў праваахоўнікі заклікаюць беларусак не спакушацца на абяцанні хутка зарабіць добрыя грошы за мяжой. У шматлікіх тэлепраграмах паказалі ўжо не адзін дзясятак непрыдуманых гісторый, якія пачыналіся аднолькава — нейкая арганізацыя набірала для працы за кардонам гувернантак, танцоўшчыц або пакаёвак. Але чамусьці не ўсе дзяўчаты спяшаюцца прыслухацца да парад і павучыцца на чужых памылках.**

Так, летась супрацоўнікі МУС спынілі дзейнасць арганізаванай злачыннай групоўкі, якая пастаўляла ў Расію беларусак для ўдзелу ў здымках фільмаў для дарослых, а пасля перапраўляла іх у французскія бардэлі. Усяго ж 2013 год адзначыўся перакрыццём амаль трох дзясяткаў каналаў экспарту «жывога тавару» ў восем краін свету. Хоць праблему міждзяржаўнага гандлю людзьмі збольшага вырашыць удалося, але яно застаецца на ўзроўні чалавечага фактару.

— За 10 гадоў асуджана больш за 2 тысячы трафікёраў — гандляроў людзьмі, — гаворыць **намеснік начальніка Упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі Сяргей КОЎТУН.** — Яны намагаліся вывезці за мяжу для сексуальнай і нелегальнай працоўнай эксплуатацыі пяць тысяч чалавек. Цяпер мы можам казаць аб тым, што трафікёры імкнуцца пазбягаць частых наведванняў Беларусі.

Ловяць злачынцаў, як правіла, «на гарачым» — непасрэдна пры спробе вывезці чарговую ахвяру за мяжу. Так, у снежні мінулага года была затрымана трафікёрша з Іспаніі, якая завербавала і намагалася пераправіць туды дзяўчыну для працы ў бардэлі. Сем гадоў турмы атрымаў грамадзянін Германіі, які хацеў вывезці да сябе на радзіму дзвюх жыхарак Гродна з падобнымі мэтамі. Але на праблему трэба пaглядзець з іншага боку — няўжо дагэтуль людзі вераць у гісторыі пра заморскага прынца?

Сексуальная эксплуатацыя, аднак, мае месца і ўнутры Беларусі. Летась яе ахвярамі сталі каля сотні чалавек. Не так даўно была спынена дзейнасць злачыннай групы, якая пастаўляла дзяўчат заможным кліентам у элітныя забаўляльныя і гасцінічныя комплексы сталіцы.

Што адметна, летась на ўлік трапілі 45 мужчын-прастытутак. Усяго ж за платныя любошчы да адказнасці прыцягнулі амаль тысячу чалавек. Кожны шосты выпадак закончыўся арыштам. Але аб'ектамі для інтыму становяцца не толькі дарослыя людзі, якія могуць разумець свае ўчынкі і пралічваць іх наступствы, але і дзеці...

— У красавіку мінулага года краіну абляцела жудасная навіна аб тым, як бацька-выхавальнік дзіцячага дома сямейнага тыпу разам з сынам былі затрыманы па падазрэнні ў гвалтаванні сваіх падапечных, — працягвае Сяргей Коўтун. — Матэрыялы 13 крымінальных спраў ужо перададзены ў суд. А 17-гадовы сын ужо асуджаны на 9 гадоў пазбаўлення волі.

Міністэрства ўнутраных спраў ужо ініцыявала прапанову па ўзмацненні ў заканадаўстве адказнасці за педафілію. Шэраг дэпутатаў парламента выказваецца за вельмі жорсткае пакаранне за гэты ўчынак — да 20 гадоў пазбаўлення волі. Акрамя таго, калекцыянеры дзіцячай парнаграфіі таксама могуць неўзабаве трапіць на лаву падсудных. Падобная практыка існуе амаль ва ўсіх еўрапейскіх краінах.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# СУСЕД НАНЁС БОЛЬШ ЗА 20 УДАРАЎ НАЖОМ

**Упраўленне Следчага камітэта па Мінску завяршыла расследаванне крымінальнай справы па факце забойства Святланы Хіневіч. Жанчына працавала начальнікам аддзела кадраў ААТ «Крышталь» і адначасова з'яўлялася членам Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Дакладна ўстаноўлена, што злачынства не звязана з прафесійнай і грамадскай дзейнасцю пацярпелай, — яно носіць бытавы характар.**

Нагадаю, што ў жніўні мінулага года цела Святланы Хіневіч знайшлі ва ўласнай кватэры са шматлікімі раненнямі. У забойстве падазраецца 35-гадовы нарказалежны, які жыў з ёю ў адным пад'ездзе. Яго, параненага нажом (спрабаваў скончыць жыццё самагубствам) і ў несвядомым стане, затрымалі дома. Але, нягледзячы на тое, што мужчына страціў шмат крыві, урачы паспелі яго выратаваць. Пасля таго, як падазраваны прыйшоў у сябе, яго дапыталі ў прысутнасці адваката. Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, у сваю чаргу, правёў каля дваццаці розных даследаванняў, у тым ліку комплексную псіхолага-псіхіятрычную экспертызу. Высветлена, што абвінавачваны ўдарыў бездапаможную жанчыну нажом не менш за дваццаць разоў, пры гэтым ён знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення і пад уздзеяннем псіхатропных рэчываў. Дзеянні абвінавачванага кваліфікаваныя як забойства, здзейсненае з асаблівай жорсткасцю, з хуліганскіх памкненняў. Акрамя таго, арыштаваны абвінавачваецца ў незаконным набыцці, захоўванні і перавозцы псіхатропных рэчываў.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

# CNN ПРЫНЕСЛА ПРАБАЧЭННІ БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ

**Амерыканская тэлекампанія CNN склала спіс-рэйтынг дзесяці самых выродлівых помнікаў у свеце. У гэты спіс увайшла... скульптурная кампазіцыя «Мужнасць» — адзін з галоўных манументаў Брэсцкай крэпасці. Тамтэйшых журналістаў не задаволіў надта суровы выраз твару салдата.**

На гэты факт вельмі бурна адрэагавалі не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, іншых краінах. Пратэст апублікавала пасольства Расіі ў ЗША. Дырэктар мемарыяла «Брэсцкая крэпасць» Рыгор Бысюк назваў гэты факт не проста абуральным, але абразлівым для памяці ўсіх абаронцаў Радзімы, якія загінулі на вайне. Сваё абурэнне выказалі прадстаўнікі многіх грамадскіх і міжнародных арганізацый.

Пасля гэтага кампанія пакінула на сваім афіцыйным сайце паведамленне, дзе гаворыцца: «Мы разумеем, што ўключэнне Брэсцкай крэпасці ў спіс выклікала абурэнне ў Беларусі і Расіі. Гэта адбылося незнарок, і мы прыносім свае прабачэнні. Артыкул меў на ўвазе гумарыстычны агляд манументальнай архітэктуры па ўсім свеце. CNN прызнае, што помнік для многіх людзей з'яўляецца сімвалам ахвяр, прынесеных салдатамі». І ўсё ж на сайце застаўся артыкул з сумніўным рэйтынгам, хаця ў загалоўку з'явіўся пытальнік. Дарэчы, у спісе нямала помнікаў, якія адлюстроўваюць барацьбу народаў за свабоду сваёй краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, галоўнаму ўрачу ўстановы аховы здароўя «Аршанская цэнтральная паліклініка» Плыткевічу Уладзіміру Цімафеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні загадчыку аддзела па забеспячэнні работы Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Бекасавай Вользе Ігнацьеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю СВЕКРЫВІ.**

■ Гасцёўня

# ГЮНЕШ: «Я ХАЦЕЛА Б ПАСТАВІЦЬ ШЧАСЦЕ НА ПАЎЗУ»



**Яе імя ў перакладзе з азербайджанскага значыць «сонца». Можа, таму яна абрала сцэну, дзе стварае людзям настрой песнямі. Лёс звёў яе з беларускім кампазітарам Фёдарам Жыляком, а той здолеў разгледзець у дзяўчыне талент і падказаць правільны шлях. Цяпер імя Гюнеш вядома не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Пасля леташняга ўдзелу ў міжнародным конкурсе «Turkvision», дзе спявачка заваявала «серабро», геаграфія папулярнасці пашырылася. Вярнуўшыся з конкурсу, яна зноў узялася за працу: падрыхтоўка да канцэрта перад Днём закаханых, рэпетыцыі новага шоу і выпуск новага альбома.**

## ТАЯМНІЦЫ АД СЭРЦА

***— Канцэртная праграма «Што ў гэтым сэрцы» адзначана Нацыянальнай музычнай прэміяй. Чаго каштавала гэта ўзнагарода вашай камандзе?***

— Усё, што мы робім з маёй камандай, — для гледача. І, безумоўна, атрымаўшы ўзнагароду за сваю працу, разумееш, што рабіў усё не дарэмна. Мы былі ў стане шоку, даведаўшыся, як нас адзначылі. Я ніколі не бяруся за нешта з думкай: «За гэта я павінна мець узнагароду!», але такі вынік нас парадаваў. З канцэртнай праграмай «Што ў гэтым сэрцы» мы праехалі па гарадах Беларусі, і аўдыторыі яна спадабалася. Дыплом толькі «засведчыў» гэты поспех. У Мінску мы завершым праграму і працягнем падрыхтоўку новай. Ужо ідзе праца над касцюмамі, некаторыя замалёўкі з'явіліся ў тэатра танца «Гарэм-шоу». Мы ўжо не адзін год працуем з Ясмін, Віталем Моўчанам — для мяне яны лепшыя танцоры краіны.

***— Што чакае публіку на завяршальным шоу ў Мінску?***

— 12 лютага ў ДК МАЗ адбудзецца сольная праграма, прымеркаваная да Дня ўсіх закаханых. Мы чакаем усіх. Мяне прыйдуць падтрымаць калегі. Шкада, што не ўсім змагу даць магчымасць «выказацца» на сцэне. Атрымалася больш чым двухгадзінная праграма, якая невыпадкова названа «Што ў гэтым сэрцы» — я ў чарговы раз буду весці адкрытую размову пра сваё жыццё, дзяліцца таямніцамі і здзіўляць новымі вобразамі, яскравым шоу, дзе будзе бразільскі карнавал на сцэне, наш нумар з «Turkvision» з балетам і іншыя сюрпрызы.

***— А далей — нарэшце адпачняце?***

— Прадоўжым работу над новым альбомам і новай праграмай. Альбом стане ўжо трэцім дыскам за час майго знаходжання на сцэне. Яго адметнасць у тым, што там не будзе ніводнага трэка з усходнімі матывамі, цалкам еўрапейскае гучанне. Будуць кампазіцыі, з якімі я адбіралася на «Еўрабачанне», песні ўкраінскага кампазітара Алега Жоўцікава, беларускіх кампазітараў Леаніда Шырына і Юрыя Вашчука, Фёдара Жыляка, а таксама азербайджанскіх аўтараў Ісы Мелікава і Захры Бадалбэйлі. Можна сказаць, альбом будзе інтэрнацыянальным.

## СЦЭНА ЛЮБІЦЬ НАСТОЙЛІВЫХ

***— Ці змянілася нешта ў вашым творчым жыцці пасля «Turkvision»?***

— Не скажу, каб у маё творчае жыццё конкурс унёс нейкія кардынальныя змены. Я ў міжнародных конкурсах удзельнічаю з часоў першага выхаду на сцэну. У 1999 годзе я пачала працаваць з Фёдарам Жыляком у Баранавічах. Ён з'яўляецца маім настаўнікам і сёння, ён жа прапанаваў мне паўдзельнічаць у міжнародных конкурсах. Таму вопыт ужо быў не маленькі. І, у прынцыпе, я вельмі люблю змагацца, што, думаю, многія заўважылі падчас адборачных тураў на «Еўрабачанне». Пяць разоў удзельнічала. І кожнай спробай імкнулася чымсьці вылучыцца для аўдыторыі, здзівіць і парадаваць яе яркімі вобразамі і песнямі. Ёсць людзі, якія баяцца спаборнічаць, а мяне гэта прыцягвае. На «Turkvision» была жорсткая барацьба сярод 24 краін. І перад фіналам я думала: «Вось заўтра вырашальны дзень. Няўжо мяне не будзе сярод фіналістаў? Я павінна там быць!» Сказала сабе, што павінна ўвайсці ў тройку мацнейшых, — і, як бачыце, атрымалася.

***— Як з'явілася песня «Апошнія ўспаміны»?***

— «Апошнія ўспаміны» — пра мяне. У ёй адлюстраваны кавалачкі майго жыцця. Кампазіцыя расказвае пра закаханую жанчыну і яе ўзаемаадносіны, у якіх ёсць жаданне даць больш другому, але і прысутнічае цень непаразумення, неапраўданых надзей. У песні словы і музыка мае. Калі Гёкхан (жаніх Гюнеш, экс-футбаліст турэцкага «Галатасарая». — **Аўт.**) пачуў песню, то сказаў, што мая кампазіцыя спадабаецца іх слухачу. Тым і натхніў мяне прадставіць гэты твор публіцы з верай, што яго ацэняць і прымуць. Песня сапраўды там спадабалася. Яе круцяць на турэцкіх радыёстанцыях і гавораць пра «Гюнеш з Беларусі».

***— Пасля конкурсу, мабыць, не абышлося і без цікавых прапаноў?***

— Так, мяне запрашалі паўдзельнічаць у розных канцэртах, конкурсах, фестывалях. Напрыклад, у пачатку чэрвеня адбудзецца фестываль кіпрыёцкай музыкі, дзе я буду выступаць не толькі са сваёй конкурснай кампазіцыяй, але і выканаю песні на беларускай мове.



Гюнеш са сваім жаніхом Гёкханам.

**5 ДАСЯГНЕННЯЎ З «КАЛЕКЦЫІ» СПЯВАЧКІ:**

**2001** — 1-я прэмія Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў украінскай песні ім. В. Івасюка, г. Чарнаўцы (Украіна).

**2003** — Гран-пры Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў «Янтарная зорка», г. Юрмала (Латвія); пазней 1-я прэмія на Міжнародным конкурсе папулярнай эстраднай песні «Ялта-2003» (Украіна).

**2005** год — 2-я прэмія Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў «Славянскі базар у Віцебску».

**2005—2012** — фіналістка беларускага нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне». Наогул, Гюнеш — самая актыўная і ці не самая запамінальная з удзельнікаў беларускіх адбораў.

**2011** — узнагароджана медалём Францыска Скарыны.

## ДЗВЕ КРАІНЫ З АДНОЙ ДУШОЙ

***— Чытала, што песні на беларускай мове наогул прыносяць вам удачу...***

— Я люблю спяваць на беларускай мове. З самага пачатку гэтую любоў прывіў мне Фёдар Мікалаевіч, з такімі кампазіцыямі я сапраўды неаднойчы перамагала. Мае самыя яркія творчыя моманты звязаны з беларускай мовай і песнямі на ёй. Выязджаючы за мяжу, заўсёды маю ў рэпертуары некалькі такіх кампазіцый. Нядаўна ездзілі ў Азербайджан, дзе я таксама выконвала песні на дзвюх мовах. Проста ўва мне жывуць дзве культуры.

***— Якім чынам яны ўжываюцца, калі ўлічваць строгае бацькоўскае выхаванне па ўсходніх традыцыях?***

— Азербайджанскія традыцыі сапраўды даволі складаныя, і ў дзяцінстве было не проста зразумець бацькоўскія патрабаванні. А ў выніку мяне выхавалі добрай гаспадыняй. Я, напрыклад, добра гатую нашы нацыянальныя стравы — нават майму маладому чалавеку было складана паверыць у такі мой талент. Артыстку звычайна многія лічаць жанчынай, якая ўмее трымаць у руках толькі мікрафон. А я ўмею ўсё.

**І цяпер Гёкхан вывучае рускую мову, хоча адкрыць свой бізнес у Беларусі. Я ўяўляю, чым ён ахвяруе дзеля мяне і як яму складана, але гэта сведчыць пра яго каханне.**

Былі моманты, калі крыўдзілася на тое, што не магла пайсці на дыскатэку альбо з хлопцамі пад гітару паспяваць вечарам. Я жыла паміж домам, студыяй і музычнай школай. І цяпер разумею: бацька жадаў мне толькі дабра і імкнуўся выгадаваць ідэальную дачку паводле ўсходніх традыцый. Ён заўсёды казаў нам з братам, каб мы не забывалі, што Беларусь — краіна, дзе мы нарадзіліся і выраслі, а Азербайджан — наша этнічная радзіма, таму трэба ведаць іх традыцыі і паважаць свае карані. Цяпер у любой з краін я адчуваю сябе сваёй.

***— Некаторыя называюць «Turkvision» альтэрнатывай «Еўрабачанню». Вы не спыніце свае спробы трапіць на еўрапейскую сцэну?***

— Складанае пытанне. Многія калегі і сябры раяць мне супакоіцца: маўляў, не сышліся зоркі, таму і не складваецца нічога. На што я адказваю: «Усе мае спробы — гэта набыццё вопыту». Усё не дарэмна. Загадваць не хачу, але і катэгарычна адмаўляць верагоднасць магчымых спроб не буду. Мара прадставіць Беларусь на «Еўрабачанні» не пакідае мяне.

***— З-за конкурсу «Turkvision» вы перанеслі вяселле. Як ваш малады чалавек адрэагаваў?***

— У канцы верасня стала вядома, што я прайшла на конкурс і буду прадстаўляць нашу краіну там. Калі даведалася пра дату правядзення, то аказалася, яна супадае з тэрмінамі, на якія мы запланавалі вяселле. Безумоўна, першае пытанне Гёкхана было: «А як жа наша вяселле?» Я адказала: маўляў, не варта непакоіцца, я ўсё паспею. Але тады ён усё ж настаяў, каб перанесці наша свята, і я пачала спакойна рыхтавацца да конкурсу. Шчыра сказаць, была здзіўлена такой рэакцыяй, бо мяне проста маглі б паставіць перад выбарам. Таму я вельмі ўдзячная каханаму за разуменне і падтрымку. Вяселле адбудзецца сёлета ў канцы мая ў Стамбуле.

***— Складана будаваць адносіны «на адлегласці»?***

— Наша першая сустрэча адбылася на Кіпры. Як зараз памятаю: сонца, пляж і ён падыходзіць, цікавіцца, як мае справы. Я адказала па-турэцку, чым здзівіла яго: падумаў, што я турчанка. А калі вярнулася ў Мінск, то мы пачалі перапісвацца ў інтэрнэце. Потым я зноў атрымала запрашэнне прыляцець на Кіпр. Пачаліся пастаянныя пералёты. Праз нейкі час вырашылі, што трэба ці мне пераязджаць туды, ці яму жыць у Мінску. Спачатку здавалася, быццам мне лягчэй пайсці на перамены, бо я валодаю мовай. А потым ён сказаў: «Ты артыстка і таму не можаш пакінуць свае канцэрты». І цяпер Гёкхан вывучае рускую мову, хоча адкрыць свой бізнес у Беларусі. Я ўяўляю, чым ён ахвяруе дзеля мяне і як яму складана, але гэта сведчыць пра яго каханне. Так вось гісторыя і працягваецца.

***— У вашым кліпе «Час не чакае» падзеі «адкручваюцца» назад... Калі б самі так маглі, то дзе адрэдагавалі б сваё жыццё?***

— Я настолькі задаволена сваім лёсам, што, ацэньваючы ўсё пройдзенае, хацела б свой шлях паўтарыць. Зноў пайшла б у школу ў Баранавічах, хацела б сябраваць з тымі ж людзьмі. Не змяніла б свайго рашэння стаць артысткай і прайсці ўсе складаныя этапы станаўлення на сцэне. Выбрала б свайго маладога чалавека. У кожнага з нас здараюцца складаныя часы, якія хочацца забыць і павыкрэсліваць, але іншага жыцця я не хацела б. Зараз лічу сябе самай шчаслівай, таму згадзілася б толькі на паўзу, каб падоўжыць шчасце.

**Алена ДРАПКО**

# КНІЖНЫ КІРМАШ: ТЭМЫ І ВАРЫЯЦЫІ

**Калі добра пашукаць, то тут знойдзеш не толькі амерыканскія коміксы, але і рэдактара, які працаваў з Міхаілам Пташуком**

**На XXI Мінскай міжнароднай выставе-кірмашы хоць і крыху скарацілася агульная колькасць удзельнікаў, усё роўна ёсць на што паглядзець.**

Найбольшую ўвагу прыцягвае французскі стэнд. Кожны год гэтая краіна грунтоўна падыходзіць да падрыхтоўкі. Жоўта-лавандавы павільён, аформлены ў праванскім стылі, прыцягвае ўвагу нават тых наведвальнікаў, якія не чытаюць і не размаўляюць па-французску. Зрэшты, моўны бар'ер у гэтым выпадку не перашкода, бо ўсе сустрэчы з французскімі гасцямі перакладаюцца.

Так, з Францыі прыехаў падарожнік і касмапаліт Патрык Дэвіль, які прывёз свой раман «Чума і халера», што атрымаў самую прэстыжную літаратурную прэмію Францыі «Femina» ў 2012 годзе. Не ўпершыню наведаў Мінск і вядомы французскі культурны дзеяч Ален Флэшэр. Акурат учора адбылася творчая сустрэча з ім і прэзентацыя перакладзенай кнігі «Лабараторыі часу» — эсэ, прысвечаныя кіно і фатаграфіі. Пра ўзаемадачыненні кіно і тэатра распавядае драматург і акцёр Аліўе Балазюк. Дзіцячы пісьменнік Бернар Фрыо гаворыць пра асаблівасці ўспрымання тэксту дзецьмі. Леанід Шмялькоў — мастак-ілюстратар і рэжысёр-аніматар, працаваў над малюнкамі да кніг Бернара Фрыо. А малады пісьменнік Седрык Гра любіць падарожнічаць: пражыўшы некалькі гадоў у Сібіры ды на Далёкім Усходзе, напісаў пра гэта кнігі. Цяпер з'яўляецца дырэктарам французскага альянсу ва ўкраінскім Данецку. Словам, французскі павільён ахапіў бадай усе кірункі сучаснай літаратурнай дзейнасці.



Стэнд Ірана.

Фота БЕЛТА.

Не менш актыўную і насычаную праграму падрыхтавалі і іншыя краіны. На стэндзе Вялікабрытаніі ў адмысловай віктарыне можна выйграць любую з прадстаўленых кніг. Я асабіста паклала вока на таўшчэзную біяграфію славутага «бітла» Джона Ленана. А ў 11 гадзін у нядзелю там будзе публічна чытаць урыўкі з біяграфіі знакамітага гурта «The Rolling Stones» пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі Брус Бакнел.

Нямецкі стэнд па памерах не саступае французскаму. Аформлены ў пазнавальных фірменных зялёна-белых колерах Інстытута Гётэ ў Мінску, нямецкі стэнд прадстаўляе мноства цікавай літаратуры: ад вучэбнай да дзіцячай. Знайшла я ў перакладзе на нямецкую нават творы Данііла Хармса. Уяўляю, якая гэта цяжкая перакладчыцкая праца, шчыраваць над такім тэкстам!

Стэнд ЗША, арганізаваны пры падтрымцы пасольства, сёлета вырашыў пазнаёміць наведвальнікаў з амерыканскімі коміксамі. Гледачам прапануецца не толькі пазнаёміцца са славутымі персанажамі амерыканскай літаратурна-графічнай культуры (Бэтман, Халк, Капітан Амерыка і г.д.) праз коміксы вядомых выдавецтваў Marvel, DC ды іншых, але і самім паўдзельнічаць у іх стварэнні. На вялікім стэндзе кожны ахвотны можа намаляваць кадр з комікса, а напрыканцы выставы прыйсці і ацаніць вынікі калектыўнай творчасці ў камп'ютарнай віктарыне (на выбар па-англійску ці па-руску) адказаць на пытанні пра амерыканскія коміксы. Акрамя таго, прадуманы не толькі віртуальныя праграмы, але і рэальныя. На працягу ўсіх выставачных дзён ладзяцца сустрэчы і майстр-класы з амерыканскім аўтарам Джошам Элдэрам, які паглыбляе ў таямніцы комікс-арту.

Цікавае ўяўленне пра кніжную культуру маюць, напрыклад, іранцы. Яны вось ужо не першы год прывозяць на мінскую выставу не столькі кнігі, колькі вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: паштовачкі, сурвэтачкі, біжутэрыю, куфэркі. Можа, гэта такая аздоба да прадстаўленай кніжнай прадукцыі — падарункавага кшталту альбомаў рэпрадукцый і краявідаў неабдымнай і загадкавай усходняй краіны?

Калі доўга-доўга блукаць па выставе, то можна знайсці яшчэ шмат чаго цікавага. Так, напрыклад, ёсць расійская серыя кніг «Livebook», у якой прадстаўлена сучасная дакументальная проза: гісторыі звычайных людзей пра дзяцінства, каханне ды іншыя жыццёвыя перыпетыі. А на ўкраінскім стэндзе знайшлася не толькі цікавая кніга, але і яе цікавы аўтар, так што можна было нават аўтограф узяць. Галіна Лазарава працавала на Адэскай кінастудыі рэдактарам тады, калі там наш Міхаіл Пташук здымаў свой фільм «Пра Віцю, пра Машу і марскую пяхоту».

— ...А потым беларусы яго ў нас пераманілі, таму што ён быў беларус, — распавядае Галіна Лазарава.

У Мінск яна прывезла кнігу «Княжна Мэры. Творчы выкідыш», прысвечаную не знятаму фільму Кіры Муратавай паводле Лермантава. У кнігу ўвайшлі абсалютна ўнікальныя дакументы: кінасцэнарый фільма, рэжысёрскі сцэнарый з пазнакамі самой Муратавай, стэнаграмы пасяджэнняў, пратаколы, эскізы, фотаздымкі. Словам, усё, што дазваляе прасачыць складаны лёс таленавітага нетрывіяльнага твора ў Савецкім Саюзе ў 1974—1975 гадах.

А ў суботу а 12-й гадзіне на стэндзе «Белкнігі» адбудзецца доўгачаканая сустрэча з беларускай пісьменніцай Святланай Алексіевіч, нядаўняй намінанткай на Нобелеўскую прэмію па літаратуры за кнігу «Час сэканд-хэнд».

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

■ Афганістан: памяць і боль

# ЛЯЦЕЎ ПАД АБЛОКАМІ «ЧОРНЫ» ЦЮЛЬПАН...

**Леанід Сандзюк з вёскі Васюкі Шаркаўшчынскага раёна не вярнуўся з афганскай вайны, але бацька і сястра спадзяюцца, што знойдуцца яго саслужыўцы, тыя, хто ваяваў разам з ім ці проста ведаў хлопца.**

Леанід нарадзіўся і жыў у вёсцы Стуканы Глыбоцкага раёна, адтуль у сакавіку 1981 года яго прызвалі ў армію. Затым сям'я пераехала ў вёску Васюкі Шаркаўшчынскага раёна. Цяпер там жыве яго бацька Веньямін Паўлавіч з дачкой (маці памерла). У пакоі на відным месцы партрэт Леаніда, дзе ён навечна застаўся маладым.

— Спачатку сын служыў у Мар'інай Горцы, пасля трапіў у Туркменістан, а летам ён ужо быў у Афганістане, — распавёў Веньямін Паўлавіч. — У снежні сын пісаў: «Стаім высока ў гарах. Ахоўваем аб'ект. Відаць, тут і давядзецца сустракаць Новы год». У студзені 1982-га ў Стуканы даляцела чарговая вестка: «Новы год сустракалі без снегу, пры тэмпературы плюс 60 градусаў. Гэты год мне запомніцца на ўсё жыццё...» Чаму? Не напісаў, але маё сэрца адчувала, што недаслужыць ён...

У лютым таго ж года Леанід Сандзюк даслаў дадому яшчэ адзін ліст: «Знялі нас з гор. Жывём у палатках. Удзень плавімся ад спякоты, а ноччу мерзнем». Затым настала цішыня... Начамі сын прыходзіў да бацькі ў снах...

— Аднаго дня іду з работы, — згадвае Веньямін Паўлавіч, — а насустрач жонка са слязамі: «Лёнечку забілі. Сыночка ў дамавіне вязуць». У той момант мне здалося, што зямля пад нагамі правалілася...

Пазней прыйшло паведамленне з часці. Камандзір пісаў, што Леанід Сандзюк загінуў, ратуючы сяброў і выносячы з полымя боепрыпасы. З кнігі «Памяць», экземпляр якой потым падарыць бацьку, ён даведаўся, што сын быў цяжка паранены ў час артылерыйскага абстрэлу і памёр ад ран у шпіталі.

У мужчыны і па сённяшні дзень жыве боль, вострыы, нясцерпны. Веньямін Сандзюк спрабаваў знайсці тых, хто служыў разам з Леанідам, праз раённую газету, але не атрымалася. Тым не менш бацька не губляе надзею, што ў Беларусі ці іншых краінах былога Савецкага Саюза жывуць «афганцы», якія ваявалі поплеч з Леанідам, і просіць іх адклікнуцца.

**Кацярына СОСНА,**

*Шаркаўшчынскі раён*

■ Факт

## НЕЛЕГАЛЬНУЮ МАРШРУТКУ АРЫШТАВАЛІ

**У Віцебску мясцовы жыхар перавозіў пасажыраў у нелегальнай маршрутцы. І што дзіўна: пры гэтым не баяўся ездзіць па самым цэнтры горада. У прыватнасці, у ліку іншага спыняўся на прыпынку грамадскага транспарту ля будынка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. На аўто коштам больш як 95 мільёнаў рублёў наклалі арышт.**

— Матэрыял адпаведнай праверкі ў дачыненні да гараджаніна накіравалі ў суд, — паведамілі «Звяздзе» ў інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Віцебскай вобласці.

Законам прадугледжана суровая адказнасць за гэтае правапарушэнне: штраф у памеры да 100 базавых велічынь з канфіскацыяй аўто, а таксама даходу, атрыманага ў выніку нелегальнай камерцыйнай дзейнасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЧУЖЫ КРЭДЫТ НА СВАЕ ПАТРЭБЫ

**У Гродне заведзена крымінальная справа ў дачыненні да 24-гадовай мясцовай жыхаркі, якая падманным шляхам карысталася чужымі грашыма.**

У пачатку мінулага года яна папрасіла калегу ўзяць крэдыт у суме 10 мільёнаў рублёў — быццам для хворай маці, якая лечыцца ў Маскве. Хоць на самай справе маці махляркі з Гродна не выязджала і ў бальніцу не трапляла. Аднак зламысніцы паверылі, а калі надышоў час вяртаць пазыку, яна звярнулася з просьбай аб крэдыце да іншай знаёмай, але ўжо ў значна большым памеры. За кошт гэтай пазыкі была кампенсавана папярэдняя, а астатнюю суму махлярка патраціла на свае патрэбы. Прычым праваахоўнікі не выключаюць, што падманутых ёй людзей можа быць больш, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## НАРКАЗАЛЕЖНЫ ВЫНЕС З ДОМУ НАВАТ УНІТАЗ

**Каб дабыць грошай на чарговую дозу спайсу, 21-гадовы мінчанін пачаў прадаваць хатнія рэчы і ў дадатак — цішком абкрадаць сяброў.**

Напачатку малады чалавек выносіў з дому розныя дробныя прадметы ўжытку, аднак неўзабаве прадаў пыласос, пральную машыну і нават... унітаз. А праз нейкі час «узяўся» і за сябра, у якога скраў залаты пярсцёнак, прадаў яго, а на атрыманыя грошы набыў чарговую дозу. У выніку хлопец патрапіў у поле зроку супрацоўнікаў аддзела крымінальнага вышуку і аддзялення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Цэнтральнага РУУС сталіцы. Быў асуджаны за крадзеж і незаконнае абарачэнне наркотыкаў. А калі вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, зноў узяўся за ранейшае. Напачатку блізкія цярпелі гэта, але калі хлопец прадаў фотаапарат маці, жанчына не вытрымала і звярнулася ў міліцыю...

**Сяргей РАСОЛЬКА**





■ Філатэліст

## ПАМЯЦІ КЛАСІКА

**Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне новую паштовую марку, прысвечаную стагоддзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова.**

У дзень выпуску, 6 лютага, у аддзяленні паштовай сувязі № 3 г. Касцюковічы адбылося спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень». Наклад маркі 60 тысяч. Мастак Мікалай Рыжы.

■ Во даюць!

## ЭФЕКТ ПРЫСУТНАСЦІ

**Кнігу з эфектам прысутнасці стварылі студэнты з медыялабараторыі Масачусецкага тэхналагічнага інстытута (ЗША).**

У кніжны набор уваходзіць спецыяльная камізэлька, якую трэба апранаць падчас чытання. На вокладцы кнігі змяшчаюцца светадыёды, здольныя змяняць свой колер у залежнасці ад настрою чытача. Камізэлька, у сваю чаргу, забяспечвае вібрацыю, фонавую музыку, а таксама змяняе тэмпературу цела пры дапамозе элементаў тэрмаэлектрычнага пераўтваральніка. Таксама камізэлька «сочыць» за тым, на якім абзацы ў пэўны момант знаходзіцца чытач, і стварае эфект прысутнасці.

Пакуль што кніга існуе ў адзіным экзэмпляры, аднак распрацоўшчыкі незвычайнага ўстройства перакананы, што іх вынаходніцтва выведзе працэс чытання літаратуры на новы ўзровень. А звыштэхналагічны спосаб узмацніць уздзеянне на чытача зацікавіць многіх пісьменнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ





УНП 190941434

1. Организатор:
Общество с дополнительной ответственностью ОДО «МассМедиаСервис», адрес: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, офис 811.
2. Наименование рекламной игры: «Волшебство совсем рядом!».
3. Территория проведения – магазины фирменной сети «Корона Техно» в г. Минске, г. Витебске, г. Бобруйске, г. Бресте.
4. Срок начала рекламной игры – 19 декабря 2013 года, срок окончания – 10 февраля 2014 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).
5. Свидетельство № 2289 о государственной регистрации рекламной игры «Волшебство совсем рядом!» от 12 декабря 2013 года, выдано Министерством торговли Республики Беларусь.
6. В рекламной игре приняло участие 955 участников.
7. Призовой фонд рекламной игры по всем призам разыгран в полном объеме.
8. Фамилия, инициалы победителей:

**Приз:** сотовый телефон PRESTIGIO (PAP 5300DUOWHITE, белый) и денежный приз в размере 129 600 бел. руб.

**Розыгрыш № 1:**
Лисова Т.Н., Некраш М.А., Матвиенко Л.С., Зезётко С.Ю., Шаймердинов Р.Р., Рак Д.С., Романчук С.А., Лобанов А.В., Свириденко В.В., Шишковец Л.В., Бабич А.Е., Рылушкина О.И.

**Розыгрыш № 2:**
Зубинович Ю.К., Нестеренко О.А., Лесковец Г.Г., Мазько Е.С., Добродей С.А., Санько О.А., Замушинская Е.В., Мисько О.В., Кузьменкова Л.Л., Каредин В.С., Николаев Н.Н., Ходорович Л.Н.

**Розыгрыш № 3:**
Федорович Е. Г., Пархамович А.М., Прищеп А.А., Онищук А.Г., Лосева Н.В., Иванова А.А., Фурман Н.М., Егорова Т.А., Великода С.С., Зенькевич О.В., Сергейчик В.А., Лаханская А.А.

**Розыгрыш № 4:**
Григорьев А.А., Семенова И.А., Цыганкова И.Б., Рогачевская Е.В., Крючкова Д.В., Язикова И.М., Морозова Л.П., Павловец И.И., Саморядов А.В., Ревотько Т.С., Нестерович Е.В., Знак А.М.

9. Телефоны для справок: Velcom: +375 (29) 632 03 03, МТС: +375 (33) 632 03 03, Life;): +375 (25) 632 03 03, городской телефон: 8 801 100 02 20.

Полные правила рекламной игры были опубликованы в газете «Звязда» от 17 декабря 2013 г. и на сайте: **www.korona.by/company/news.**

Prestigio

Корона ТЕХНО

Свидетельство о гос. регистрации № 2289 от 12 декабря 2013 года, выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

# «8 КАНАЛАЎ ПАВІННА БЫЦЬ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Як можна атрымаць гэту паслугу?***

— Шляхам заключэння дагавора з «Белтэлекамам» ва ўсіх рэгіёнах краіны альбо з CosmosTV на тэрыторыі Мінска і Мінскай вобласці. Гэтыя два аператары атрымалі такое права. З цягам часу, я думаю, будуць далучацца яшчэ аператары па меры вызвалення частотнага рэсурсу. Значыць, будзе канкурэнцыя, магчымасць выбару. І мы вельмі разлічваем на тое, што да 2020 года ў нас будзе каля 400 тысяч абанентаў эфірнага лічбавага тэлебачання. Ёсць жа проста месцы, куды эканамічна нявыгадна праводзіць кабель. Пагадзіцеся: 32 каналы лепей, чым 8.

***— А тым, хто падключаны да CosmosTV даўно, што рабіць?***

— Тых, хто сёння з'яўляецца абанентам кабельнага тэлебачання, працэс пераходу ад аналагавага да лічбавага сігнала абсалютна не павінен турбаваць. За іх усю працу зробіць аператар. Нават у самым крайнім выпадку аператар мае тэхнічныя магчымасці для канвертацыі лічбавага сігналу ў аналагавы, каб ён дайшоў да вашага тэлевізара. Зразумела, што большасць аператараў сёння актыўна ўкараняюць лічбавы фармат. Калі ў вас ёсць кантракт з кабельшчыкам, то хвалявацца няма чаго: вы ў 2015 годзе абсалютна не заўважыце, што нешта змянілася.

***— Атрымліваецца, што камерцыйныя мультыплексы ўвойдуць аўтаматычна ў пакеты Cosmos TV?***

— Не, гэта дзве розныя паслугі. Тое самае, як вы выбіраеце, напрыклад, базавы ці пашыраны пакет «Белтэлекама». Проста як адна з паслуг кампаніі. Гэта будзе асобны дагавор з асобнай паслугай.

***— А як вы ставіцеся да таго, што людзі пераходзяць на CosmosTV, ZALA і інш. замест эфірнага вяшчання?***

— Калі б сёння ўся краіна карысталася кабельным тэлебачаннем, для нас было б нашмат менш пытанняў з пераходам на лічбавае. Нам тады не патрэбны былі б выдаткі на эфірныя перадачы. Міністэрства інфармацыі перад сабою ставіць дзве асноўныя задачы. Па-першае, павінны выконвацца законы, звязаныя з распаўсюджваннем прадукцыі СМІ. У гэтым сэнсе нам абсалютна ўсё роўна, распаўсюджваецца тэлевізійны канал праз кабель, у эфіры, праз мабільны тэлефон, планшэт ці яшчэ нешта. Гэта ўсё роўна застаецца распаўсюджаннем прадукцыі СМІ. Другі момант — гэта пытанне даступнасці інфармацыі для людзей. І з гэтага пункту гледжання мы для сябе вельмі вялікае значэнне надаём менавіта эфірнаму лічбаваму тэлебачанню, бо сёння гэта адзіны эканамічна абгрунтаваны спосаб унутры краіны дабрацца да сельскай мясцовасці, бо кабеля там няма і не будзе ніколі. Ці не будзе да таго моманту, пакуль не знойдуць тэхналогію таннай вытворчасці гэтага кабеля. Хаця ўсё роўна застануцца мантажныя работы. А правесці кабель дзеля чатырох дамоў у вёсцы эканамічна нявыгадна. Таму для нас вельмі важна, што мы ў сельскую мясцовасць даём інфармацыйны пакет, супастаўны з умовамі горада. Я думаю, што па меры вызвалення аналагавых частот камерцыйныя мультыплексы будуць таксама даступнымі ў эфіры і там. Між іншым, мы вельмі разлічваем на тое, што ў гэтым пакеце будзе расці колькасць беларускіх каналаў ці беларускіх версій каналаў. Адаптацыя на нацыянальных умоў заўсёды патрэбна.

***— Значыць, 8 тэлеканалаў павінны быць абсалютна ў кожным доме?***

— Натуральна. З кім бы вы ні заключылі дагавор, дзе б вы ні глядзелі тэлевізар на тэрыторыі Беларусі, аператар абавязаны вам даставіць абавязковыя 8 каналаў. Калі ў вас чаго-небудзь не хапае, ёсць усе падставы для звароту ў Міністэрства інфармацыі, каб сітуацыя была выпраўлена.

***— Быў час, калі назіраўся недахоп на прылаўках магазінаў прыставак для тэлевізараў. Ці ёсць такая праблема сёння?***

— Гандаль гэты баланс ужо выправіў. І думаю, што такіх праблем у 2014 годзе ў нас не будзе. Мы трымаем на кантролі тыя месцы, дзе адбываецца адключэнне аналагавага вяшчання.

***— Ці зменіцца цана на прыстаўкі цягам года?***

— Няма падстаў думаць, што цана значна павысіцца. Напэўна, што так і застанецца ў раёне 200-300 тысяч за прыстаўку простай канструкцыі.

***— Як вы лічыце: лепей набыць новы тэлевізар ці прыстаўку?***

— Што такое тэлебачанне? Чым яно трымае гледача? У першую чаргу якасцю «карцінкі». І я, шчыра кажучы, купляў бы больш сучасны тэлевізар. Бо ён дае цэлы шэраг дадатковых функцый. А прыстаўка... Разумееце, сёння, напрыклад, за розных тэхнічных прычын мы не паўсюль можам запусціць камерцыйны мультыплекс. І, адпаведна, людзі набываюць прыстаўку для таго, каб глядзець 8 абавязковых агульнадаступных праграм. Але, умоўна кажучы, праз год, калі мы частату вызвалім, чалавеку давядзецца замяніць сваю прыстаўку на тую, якую яму выдасць аператар камерцыйнага мультыплекса. І атрымліваюцца лішнія выдаткі. А калі вы ўжо купілі добры сучасны тэлевізар, то камерцыйную прыстаўку дадуць у крэдыт.

***— Але ж у краме могуць прапанаваць тавар, які не будзе адпавядаць усім тэхнічным патрабаванням. Як людзям абараніць сябе?***

— Увогуле продаж такой прадукцыі ўжо забаронены з 1 студзеня 2013 года. Таму спажывец, якому прадалі «несучасны» тэлевізар, безумоўна, мае права на вяртанне грошай і набыццё адпаведнай тэхнікі.

***— У чым галоўны сэнс пераходу на лічбавае вяшчанне?***

— Сэнс у тым, што чалавек атрымае: доступ да інфармацыі, якасць прыёму сігнала, якасць «карцінкі». А ў выніку — патанненне гэтай паслугі, бо замест васьмі перадатчыкаў для асноўнага пакета нам патрэбен толькі адзін.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**Спіс 8 каналаў асноўнага пакета (1-ы мультыплекс)**

1. Беларусь-1
2. Беларусь-2
3. Беларусь-3
4. Агульнанацыянальнае тэлебачанне (АНТ)
5. Сталічнае тэлебачанне (СТБ)
6. РТР-Беларусь
7. НТБ-Беларусь
8. МІР

**ДАРЭЧЫ**

**Апошнімі развітаюцца з аналагавым сігналам Столін, Мазыр, Тракенікі, Калодзішчы, Старыя Дарогі і Салігорск. Поўны графік адключэння можна знайсці на сайце Беларускага радыётэлевізійнага перадавальнага цэнтра www.brtpc.by.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Паход у народ

# АМАТАРЫ ТБ ТАКСАМА ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА ЛІЧБАВЫЯ «РЭЙКІ»

**Ужо сёння 97,5% насельніцтва маюць доступ да новага фармату тэлевяшчання. Яшчэ крыху — і аналагавы сігнал стане тэхналогіяй з мінулага. Як аматары тэлебачання падрыхтаваліся да сустрэчы з ім у новым, лічбавым абліччы? Пра гэта «Звязда» пацікавілася ў жыхароў аднаго з рэгіёнаў Беларусі.**

## ЗРУЧНЫЯ СЭРВІСЫ

Назваць сябе аматаркай тэлебачання Святлана Каспяровіч не можа. Са школьных гадоў яна ахвотней чытае кнігі, чым глядзіць фільмы ды тэлеперадачы. Аднак, як і многія беларусы, калі-нікалі бавіць час і пад «акампанемент» тэлевізара, напрыклад, збіраючыся на працу ці адпачываючы пасля яе. Дзве гадзіны на дзень увага Святланы Леанідаўны аддаецца ў распараджэнне інфармацыйных выпускаў і добрага фільма. Што важна — у новай якасці.

— На лічбавае тэлебачанне наша сям'я перайшла яшчэ два гады таму. Як толькі інтэрактыўнае кабельнае ТБ Zala пачало набываць папулярнасць, муж, які вельмі любіць розныя новаўвядзенні, падключыў яго, — дзеліцца сваім вопытам пераходу на «лічбу» спадарыня Святлана. — Шчыра кажучы, ні разу не пашкадавалі. Якасць «карцінкі» нашмат лепшая ў параўнанні з аналагавай. Ёсць магчымасць запісаць фільм, пераматаць яго назад, а галоўнае, выбраць зручны час, калі і што глядзець.

Праблему, як прыняць лічбавы сігнал, сям'я Каспяровічаў вырашыла двума спосабамі: купілі новы тэлевізар і спецыяльную прыстаўку для старога. А вось з заганамі кабельнага ТБ, калі падчас інтэнсіўных спажывецкіх запытаў яно «падвісае», прыходзіцца мірыцца і дагэтуль. Прычына ў тым, што тэлефонныя сеткі засталіся ранейшымі, а нагрузкі на іх нашмат узраслі.

**Як ні шкада гэта прызнаваць, але для адзінокага пажылога чалавека блакітны экран ледзь не галоўная забава ў жыцці.**

— Перайсці на лічбавае тэлебачанне мы з мужам пераканалі і свякроў. Набылі ёй спецыяльную васьміканальную прыстаўку, таму цяпер тэлевізар мамы не мае праблем з прыёмам сігналу: выява не «сняжыць», не «скача», мае цудоўную якасць колеру. Як ні шкада гэта прызнаваць, але для адзінокага пажылога чалавека блакітны экран ледзь не галоўная забава ў жыцці. Час, калі аднавяскоўцы збіраліся на вячоркі, беззваротна мінуў. Таму цяпер, асабліва доўгімі зімовымі вечарамі, тэлевізар у вёсцы — сапраўднае выратаванне.

## ВЫРАТАВАННЕ ДЛЯ САМОТНЫХ

Марыі Пястрак спяшацца раніцай няма куды. У свае 80 гадоў жанчына прачынаецца хутчэй з першымі пеўнямі, чым з пажаданнямі добрай раніцы ад тэлевядучых. Доўга глядзець тэлевізар ёй не дазваляюць праблемы са зрокам, аднак добры фільм ці серыял ды вячэрні выпуск навін розных тэлеканалаў — абавязковая праграма-мінімум на дзень.

— Заўсёды стараюся сачыць, што адбываецца не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Таму з ахвотай гляджу і расійскае «Время», і беларускую «Панараму». Плюс серыял які-небудзь цягам дня «злаўлю». Вось і атрымліваецца, што не менш за 3-4 гадзіны прысвячаю тэлебачанню, — расказвае Марыя Антонаўна. — Вядома, што вясною, летам і восенню столькі часу перад тэлевізарам не баўлю. То ў агародзе працую, то па гаспадарцы завіхаюся. Ужо не аднойчы ўпэўнівалася: калі моцна баліць галава, трэба ісці працаваць на зямлі. Любая хвароба ўмомант праходзіць! Аднак зімой, калі хатніх спраў становіцца нашмат менш, тэлевізар уключаю часцей. Здаецца, быццам хтосьці ёсць побач і не так самотна ў хаце.

Лічбавым тэлебачаннем спадарыня Марыя пакуль не карыстаецца. Дачка Святлана, праўда, яшчэ год таму паклапацілася і набыла спецыяльную прыстаўку. Аднак бабуля карысталася ёй зусім не доўга, бо апаратура паводзіла сябе не вельмі паслухмяна, увесь час «заядала». Таму сёння Марыя Антонаўна здавольваецца звыклым аналагавым сігналам і плануе перайсці на лічбавы крыху пазней.

## АЦАНІЎШЫ МОЛАДЗЕВЫМ ВОКАМ

Яўген Кушнер, 20-гадовы хлопец, у выбары паміж тэлебачаннем і інтэрнэтам перавагу аддае апошняму.

— Так зручна, дый сам магу выбіраць, што чытаць-глядзець-слухаць, — тлумачыць ён. — Плюс шмат працую, таму часу на прагляд тэлевізара застаецца зусім мала. Раней дома было звычайнае і спадарожнікавае тэлебачанне, летась падключылі лічбавае інтэрактыўнае. І яно, на мой суб'ектыўны погляд, можа стаць нядрэнным канкурэнтам для інтэрнэту. Як мінімум, у дачыненні да старэйшага пакалення з кансерватыўным густам.

Яўген, адзначаючы перавагі лічбавага ТБ, перакананы, што параўноўваць яго з іншым не мае сэнсу. «Лічба» дазволіць вяшчанню актыўна развівацца і прапаноўваць гледачам больш новых і якасных паслуг.

— Глядзець «карцінку» новага стандарту ды на новым тэлевізары — суцэльная прыемнасць. Плюсы такога ТБ можна пералічваць бясконца: вялікі тэматычны асартымент каналаў на любы густ, якасць і хуткасць вяшчання, інтэрактыўныя функцыі перамоткі, спынення ці персанальнага заказу відэа... Зразумела, напачатку без складанасцяў не абысціся. Усё ж старэйшаму пакаленню засвоіць кіраванне новымі тэхналогіямі не так лёгка. Але абсалютна магчыма! Проста трэба трапляць у такт з часам.

❑ ❑ ❑

Сёння па тэлефоне 172 кожны можа даведацца ці ўдакладніць незразумелыя моманты, што датычацца пераходу на лічбавае тэлевяшчанне. Як мы пераканаліся пасля гутаркі з не адным дзясяткам аматараў ТБ, гэтую справу яны не адцягваюць да апошняга моманту. Тэлевяшчанне падрыхтавалася да жыцця на лічбавых рэйках. Глядач сустракае яго ў поўным тэхнічным узбраенні. Засталося толькі зрабіць завяршальны, але не апошні крок насустрач.

**Любоў КАСПЯРОВІЧ**

■ Зваротная сувязь

# «КАЛІ ЛЮБІШ РАДЗІМУ...»

## Чытычы «Звязды» — пра тапаніміку, мову і годнасць беларусаў

**Калядкі — добрыя святкі... Яшчэ і тым, што віншаваць з імі можна доўга. Як, дарэчы, і з Новым годам. Але ж колькі вяровачцы ні віцца, а канец будзе: трэба выносіць ёлку. І трэба, яшчэ раз перачытаўшы, пакласці ў рэдакцыйны архіў віншавальныя паштоўкі, лісты-прызнанні, лісты-пажаданні, у якіх не абышлося і без роздумаў — пра мову, газету, жыццё.**

*«Я выпісваю «Звязду» з 1987 года, бо яе ўсё жыццё выпісваў мой бацька. Ён хадзіў у школу ў вёсцы Верхвень, і нейкі час яго настаўнікам быў Якуб Колас, а калі служыў у войску, то сябраваў з Кандратам Крапівой, — паведамляе* ***Галіна Януараўна РАГОЎСКАЯ з Жодзіна.*** *— У 1937-м тату арыштавалі за тое, што ён чытаў людзям кнігі. Іх было вельмі шмат! Ды такіх, што зараз цаны б не мелі! А тады ўсе іх скідалі ў кучу і спалілі на нашым гародзе. У сям'і забралі вялікі драўляны дом, карову, каня, малатарню... Кампенсацыю за пабудовы толькі абяцалі, а вось за карову заплацілі 30000 рублёў. За іх, як цяпер помню, я купіла фіранкі на адно акно...»*

*«За сваё жыццё, — паведамляе шаноўная Галіна Януараўна, — я прачытала больш як 2 тысячы кніг. А што да «Звязды», то нават фатаграфія ёсць, дзе я з любімай газетай».*

Ксеракопія гэтага здымка, што называецца, дадаецца. Магчыма, для таго, каб мы, тыя, хто стварае «Звязду», маглі яшчэ раз пераканацца, што чытаюць газету людзі вельмі прыгожыя — ва ўсіх адносінах.

Пацвярджэннем таму і ліст з вёскі Вікаравічы Столінскага раёна. *«З юнацкіх гадоў я захапляўся рашэннем шахматных задач. «Звязда» тады друкавала іх, здаецца, раз на тыдзень і прывабіла менавіта гэтым, — паведамляе наш падпісчык з 1961 (!) года* ***Мікалай Аляксеевіч ШЫЛА****. — Потым мяне зацікавілі і артыкулы, бо ў газеце працавалі выдатныя журналісты».*

Шаноўны чытач узгадвае многія прозвішчы, узгадвае часы, калі вельмі ж багатай на нейкія цікавінкі была «Хатняя энцыклапедыя», калі «Звязда» друкавала парады рыбаловам, кулінарам, табліцы першынства па футболе, хакеі... Ён лічыць, што і цяпер гэтыя матэрыялы былі б запатрабаванымі. А яшчэ: *«Нам, чытачам, хацелася б больш ведаць пра няпростую нашу гісторыю. Тым больш, што цяпер раскрываюцца архівы страшных 30-х гадоў, хацелася б гутарак з людзьмі сапраўды знакамітымі, артыкулаў пра розныя куточкі Беларусі і іншых далёкіх краін, хацелася б, каб «Звязда» па-ранейшаму змагалася за беларускасць».*

Гэтай балючай тэме прысвечаны іншыя лісты. *«Хто б што ні казаў, а беларускай мове патрэбна дапамога. У тых, хто лічыць іначай, я спытаў бы, колькі ў нас беларускамоўных садкоў, школ і ўніверсітэтаў, як выкарыстоўваецца першая з дзяржаўных моў у дзяржаўных жа ўстановах? А на тэлебачанні?.. Упэўнены, калі да лепшага нічога не мяняць, — піша* ***Валерый Гаўрыш з ЧАВУСАЎ,*** *— мы страцім мову, страцім усё, што створана нашым народам, нашымі класікамі, бо не будзе каму слухаць беларускія песні, не будзе каму чытаць беларускія кнігі, якія б таленавітыя яны ні былі... А творы ёсць! Нядаўна я перачытаў «Знак бяды» Быкава. Аповесць, здавалася б, а ў ёй — уся гісторыя краіны ад калектывізацыі да пачатку вайны. Цікава, каротка, блізка! Толькі чытай, набірайся розуму ды ганарыся сваёй мовай, сваімі землякамі-беларусамі...»*

*«Ведаю, што арыгінальнай не буду: час ад часу ў прэсе з'яўляюцца абгрунтаваныя допісы то зацікаўленых навукоўцаў-лінгвістаў, то проста неабыякавых людзей пра стан нашай тапанімікі і, у прыватнасці, мікратапанімікі — гэта значыць, назваў крам і кавярняў, айчынных вырабаў і г.д. Ды толькі, прабачце, дзе вынікі?»* — пытае спадарыня ***А. БАЛОШКА з Мінска*** і прыводзіць прыклады, па якія, што называецца, далёка хадзіць не трэба, бо яны ва ўсіх навідавоку, ва ўсіх на слыху: *«Ну вось, напрыклад: ці называе хто ўкраінца (прашу прабачэння!) хахлом, рускага — кацапам ці паляка — ляхам?.. Ну хіба за вочы, шэптам, каб яны не пачулі. Што ж мы, беларусы? Зневажальнымі для сябе «бульбашамі» мы, атрымліваецца, яшчэ і ганарымся, называючы так ваду, гарэлку, ды што там — нават новы гатунак хлеба! Слова «Бульбашъ» пагаспадарску, на ўсю сцяну «разлеглося» ў цэнтры сталіцы — на ўніверсаме «Цэнтральны». Там жа, на паліцах і, вядома ж, на любы густ — прадукцыя прадпрыемства. Яе ў якасці беларускага сувеніра госці краіны вязуць у суседнія Расію, Украіну, Прыбалтыку, у краіны далёкага замежжа. Сведчаннем, прабачце, чаго?..»*

Тут нехта можа запярэчыць аўтарцы ліста, сказаць, што да беларусаў, дзе б яны ні жылі, ставіліся добра, што слова «бульбаш», як правіла, не несла ў сабе знявагі. Але ж і павагі, мусіць, — таксама! Дык чаму б не спыніцца ў яго ўжыванні?

Зрэшты, вернемся да ліста спадарыні Балошкі: *«Не так даўно, піша яна, — апынулася я на адбудаванай Нямізе ў цэнтры сталіцы. І зноў жа шмат чаго не зразумела. Слова гэтае — Няміга — належыць толькі нам, нашай гісторыі, а вось шыльды пабеларуску там, здаецца, ніводнай. Ці яшчэ адзін факт. Досыць недарэчную назву — «Экспансія» — меў піўны бар насупраць цырка, на рагу праспекта Незалежнасці і вуліцы Янкі Купалы. Потым у памяшканні быў рамонт, магчыма, змяніўся ўласнік, які назваў сваю ўстанову не менш экзатычна — «Сплетни»...*

*Карацей, пералік назваў, якія прымушаюць задумацца, выклікаюць сумненні, а то і ўнутраны пратэст, можна працягваць. Пра гэтыя свае пачуцці гавораць многія мінчане, людзі з іншых куткоў краіны. Таму мне вельмі хацелася б ведаць: ці ёсць у Беларусі нейкая дзяржаўная ўстанова, якая кантралюе, зацвярджае (ці адпрэчвае) назвы гарадскіх аб'ектаў і вырабаў айчыннай вытворчасці?»*

Пытанне, можна сказаць, з разраду рытарычных: вядома ж, ёсць! Як паведамілі газеце ў адказ на адзін з крытычных артыкулаў, прысвечаных праблеме мікратапанімікі, кіраўніцтва таго ж Мінгарвыканкама лічыць мэтазгодным і прынцыпова падтрымлівае прысваенне беларускамоўных назваў аб'ектам гандлю, грамадскага харчавання... Тады чаму ж узгадняецца тое, што мы бачым?

Адказ, здаецца, відавочны: за гучным словам «упраўленне» (юстыцыі, гандлю і паслуг — у Мінску, у іншых гарадах і ўстановах) «хаваюцца», так бы мовіць, жывыя людзі. Нехта з іх ведае гісторыю Беларусі і мову прашчураў, а нехта... (Ну сапраўды — хапіла ж розуму на тое, каб прысвоіць імя «Янка»... туалетнай паперы. І знайшліся «ўпраўленні», што яго ўзгаднілі!)

*«Не сакрэт ужо, што прэстыж беларускай мовы падае. Як на мой погляд, — піша спадар* ***Віктар ВАРАНЕЦ з Гродна****, — ланцужок гэты цягнецца са школы. У 90-я гады мінулага стагоддзя адтуль пачаўся масавы сыход педагогаў: нехта падаўся ў «чаўнакі»-прадпрымальнікі, нехта змяніў прафесію і г.д. Як вынік — панізіўся агульны ўзровень ведаў (сведчаннем — штогадовыя нізкія вынікі ЦТ). Але нават з такімі баламі асобным удаецца паступіць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. А далей болей: план па выпуску спецыялістаў там ніхто не адмяняў. Значыць, праз пяць гадоў гэтыя «кадры» прыходзяць у школьныя класы, пачынаюць нешта «сеяць». А што ўзыходзіць? Штогод я з жахам чакаю вясну, калі студэнтам-выпускнікам пачынаюць выпісваць дыпломы. У нашым аддзеле кадраў, дзякаваць Богу, адукаваныя людзі. А пра студэнтаў такога не скажаш. Вось некалькі прыкладаў іх асноўных прэтэнзій: чаму па-руску маё прозвішча (умоўна) Бойко (націск на першы склад) не скланяецца, а па-беларуску яго праскланялі; чаму па-руску Николай, а па-беларуску Мікалай («імёны ж не змяняюцца?») і г.д. Што цікава, многія з абураных спасылаюцца на пашпарт. Я вырашыў пагартаць гэтыя дакументы, бо быў упэўнены, што памылак там быць не можа... Насамрэч — колькі заўгодна! Чытайма: Шостк**о** (выдз.* ***Аўт.****), Сар**о**сек (націск на трэці склад — я сам спытаў у дзяўчыны), Р**е**ната, Анна, Патоцка (па-руску Потоцкая), Ганна Вяч**ы**славаўна, Кацярына Сярге**я**ўна і інш.*

*Вось гэта, па-мойму, страшна. Псаваць галоўны дакумент, з якім чалавеку потым гадамі жыць, ствараць сям'ю, ездзіць за мяжу, карыстацца ў сябе ў краіне...*

*Нельга, — сцвярджае чытач, — працаваць на такіх адказных пасадах і не ведаць мовы тытульнай нацыі. Яе, беларускую, сёння мала любіць. Ёй трэба дапамагаць».*

Як?

*«...Я 20 гадоў адпрацавала даяркай на ферме. І дома яшчэ гаспадарка, — піша* ***Галіна ЯРАШЭВІЧ з вёскі Лугавая Капыльскага раёна.*** *— Але, нягледзячы на стому, мы ўсякі раз чакалі і чакаем пошту. З ёй у нашу хату прыходзяць розныя выданні, але газета «Звязда» — заўсёды. Мы ўсёй сям'ёй любім разгадваць крыжаванкі, чытаць вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з рубрыкі «Алё, народ на провадзе!», цікавімся навінамі, абрадамі. І як жа добра, што падаецца ўсё на нашай беларускай мове!»*

Не ведаю, як іншыя чытачы, я ў гэтым лісце звярнула ўвагу на словы *«ўсёй сям'ёй»*. Хочацца верыць, што ў ёй — у сям'і, у хаце — раслі і растуць дзеці (а мо і ўнукі?), што там гучала і гучыць родная мова, паратунак якой менавіта ў тым, каб на ёй размаўлялі, каб на ёй чыталі, каб сваім рублём падтрымлівалі выданне беларускамоўных кніг, газет і часопісаў, каб на ёй пісалі...

У лісце Галіны Аляксандраўны, дарэчы, амаль ніводнай памылкі. А ўжо добрых слоў на адрас «Звязды»... Як і ў пісьмах **Ларысы Паўлаўны Леановіч з Жыткавічаў, Надзеі Арсенаўны Юшко са Смалявіччыны, Леакадзіі Леанардаўны Казюк з Ваўкавыска...** Тут адно пажаданне чаго вартае: «Божай ласкі і апекі вам!».

То ўзаемна! Як пісаў Ян Скрыган, калі любіш Радзіму, то міжволі думаеш пра лёс яе, варты захаплення і павагі, пра мову, самую блізкую і родную табе. І думаеш, што яна не можа, не павінна памерці.

Застаецца спадзявацца, што кожны, хто напраўду любіць, — думае пра лёс, пра мову... І кожны дзеля гэтага будзе хоць нешта рабіць.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**P.S.** *Не ведаю, як іншыя гарады, Мінск апошнім часам упрыгожваюць вялікія, каляровыя плакаты. На адным — хлопчык з сабакам. Знізу надпіс: «Маё першае слова на роднай мове — «сябар»... На другім — дзяўчына-прыгажуня: яе першае слова — «каханне». На трэцім — сталага веку жанчына. Яе першае слова — «дзякуй»... «А якім будзе тваё першае слова на роднай мове?» — пытаюць яны.*

*Што зрабіць, каб «адказчыкаў» стала больш? Калі ведаеце — пішыце*

■ Традыцыі

# «ГОСЦЯ НЕЛЬГА АДПУСЦІЦЬ, НЕ ПРЫВЕЦІЎШЫ...»

**...Чым даўжэй жывеш на свеце, тым часцей успамінаеш мінуўшчыну, жыццё сваіх бацькоў, іх спагаду і шчырасць, тым часцей думаеш, што мы, беларусы, мабыць, заўсёды выжывалі, дзякуючы сваёй дабрыні, сваёй павазе да людзей.**

На ўсё жыццё мне запомнілася, як пасля вайны каля нашай зямлянкі з'яўляліся двое хлопчыкаў гадоў шасці-сямі. «Падайце што-небудзь», — прасілі яны. І бабуля ці мама заўсёды клалі ім у торбачку хоць пару бульбінак, або кавалачак праснака ці жменьку ячнай крупы. Калі-нікалі малым налівалі ў місачкі нейкага варыва, бо болей і ў саміх нічога не было.

Як гэтыя дзеці з хворай матуляй трапілі да нас з Украіны, не ведаю. Ведаю, што іх маці людзі выхадзілі, і яна яшчэ доўга жыла, працавала ў мясцовым саўгасе. А хлопцы (ды якія ж прыгожыя!) там жывуць і сёння...

Яшчэ ў памяці, як у нас заначавала жанчына з дачушкай, у якой не было пазногцікаў. Я, амаль такое ж дзіця, мала што разумела ў размовах дарослых, але помню, што ўсе яны плакалі, бо дзяўчынка тая была ў канцлагеры і ў яе бралі кроў...

З зямлянкі мы вылезлі ў 1950-м — пабудавалі хату. Саўгас наш быў вялікі, садзілі шмат бульбы, гародніны, а ўбіраць іх з'язджаліся людзі з іншых раёнаў. Памятаю, кватаравалі ў нас шэсць жанчын. Яны вельмі хацелі зарабіць — і грошай, і гародніны — для сваіх сем'яў. А самі — на ўсім эканомілі, харчаваліся бульбай. Мама разумела гэта і ніякай платы за жытло з іх, вядома ж, не брала, наадварот — чым магла частавала: хоць агуркамі, хоць малаком, бо лішняга ж таксама нічога не было.

Але дабро людзі помнілі. Аднойчы дзве нашы «кватаранткі» прынеслі кошык журавін, а нейкі дзядзька прывёз шмат рыбы. Сказаў: «Гэта вам за тое, што жонцы маёй давалі прытулак».

Пазней, недзе з 50-х—60-х гадоў, дома ў нас заўсёды ляжаў кавалачак сала, кумпячка — для госця. Бо калі добры чалавек заходзіў у хату, яго нельга было адпусціць не прывеціўшы, не пачаставаўшы.

Так жылі нашы дзяды, нашы бацькі. Гэтак жывём мы і нашы дзеці. А якія парадкі будуць весці ўнукі, ужо невядома. Але ж дай Бог, каб і яны трымаліся нашых традыцый, адна з якіх — гасціннасць.

**Лідзія ЛУК'ЯНАВА,**

*в. Швабы, Лагойскі раён*

■ Інфарм-укол

# У РЫТМЕ СЭРЦА

## Навошта мы робім электракардыяграму?

**Электракардыяграфія — гэта рэгістрацыя электрычнай актыўнасці сэрца. Метад, які дазваляе хутка і якасна атрымаць інфармацыю аб рабоце сэрца і зрабіць прагноз на бліжэйшы час. Сутнасць даследавання — запіс на паперу токаў, якія кіруюць работай сэрца. Даныя запісваюцца ў выглядзе графіка. Гэты графік і называецца электракардыяграмай.**

— Электракардыяграма — самае даступнае, простае і інфарматыўнае кардыялагічнае даследаванне, якое можна правесці ў стацыянары, паліклініцы, машыне хуткай дапамогі, на вуліцы і дома ў хворага, — тлумачыць **участковы тэрапеўт 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна ПАРХОМЕНКА.** — ЭКГ — гэта дынамічны запіс электрычнага зараду, дзякуючы якому працуе, а дакладней скарачаецца, наша сэрца. Каб ацаніць характарыстыкі гэтага зараду, запіс вядзецца з некалькіх участкаў сардэчнай мышцы (міякарда). Для гэтага выкарыстоўваюцца электроды — металічныя пласціны. Яны накладваюцца на розныя ўчасткі грудной клеткі, запясця і шчыкалаткі. Інфармацыя ад электродаў паступае ў апарат і пераўтвараецца ў дванаццаць графікаў (мы бачым іх на папяровай стужцы або на маніторы апарата), кожны з якіх адлюстроўвае работу пэўнага аддзела сэрца. Даследаванне займае 5-7 хвілін. Столькі ж патрэбна ўрачу для расшыфроўкі выніку. ЭКГ — абсалютна бяспечнае даследаванне і для дзяцей, і для дарослых (у тым ліку цяжарных жанчын).



**У ЯКІХ ВЫПАДКАХ УРАЧ ПРЫЗНАЧАЕ ЭКГ?**

Накіраванне на вышэйназванае даследаванне можа даць урач любой спецыяльнасці, аднак часцей за ўсё гэта тэрапеўт. Самымі частымі паказаннямі з'яўляюцца:

- дыскамфорт, боль у сэрцы, грудзях, спіне, жываце і шыі (гэта абумоўлена разнастайнасцю праяў ішэмічнай хваробы сэрца);
- задышка;
- перабоі ў рабоце сэрца;
- павышаны артэрыяльны ціск;
- страта прытомнасці;
- ацёкі ног;
- слабасць;
- шум у сэрцы;
- цукровы дыябет;
- рэўматызм;
- інсульт.

ЭКГ таксама праводзіцца ў межах прафілактычных аглядаў, падчас падрыхтоўкі да аперацыі, падчас цяжарнасці, перад выдачай дазволу на заняткі актыўнымі відамі спорту, пры афармленні дакументаў на санаторна-курортнае лячэнне і г.д.

Усім людзям пасля 40 гадоў рэкамендуецца праходзіць ЭКГ штогод, нават пры адсутнасці скаргаў (каб выключыць бессімптомнае працяканне ішэмічнай хваробы сэрца, парушэнні сардэчнага рытму, перанесены «на нагах» інфаркт міякарда).

ЭКГ дае магчымасць дыягнаставаць разнастайныя парушэнні сардэчнага рытму і ўнутрысардэчнай праводнасці, выяўляць змяненне памераў поласцяў сэрца, патаўшчэнне міякарда, прыкметы парушэння электралітнага абмену, вызначаць лакалізацыю, памер, глыбіню ішэміі або інфаркту міякарда, даўніну перанесенага інфаркту, дыягнаставаць таксічнае паражэнне сардэчнай мышцы.

У інтэрпрэтацыі даных не абысціся без спецыяліста, які ўлічыць увесь комплекс інфармацыі аб пацыенце — яго скаргі, вынікі агляду і іншых метадаў даследавання.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Салодкае жыццё

# УСЯ... У ШАКАЛАДЗЕ!

## Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся, навошта жанчыны «купаюцца» ў ім і ці дарага гэта каштуе?



### ЗАДОБРЫЦЕ ШЭФА!

Высветлілася, што ў Віцебску шакаладныя ванны не запатрабаваны, бо, паводле слоў супрацоўніц касметычных салонаў, людзей, якія маглі б аплаціць параўнальна дарагую працэдуру, вельмі мала. Адсутнасць попыту адбіваецца на прапанове: пакуль што шакаладныя ванны ў салонах прыгажосці не прапаноўваюць — у адрозненне ад шакаладнага абгортвання.

Супрацоўніцы салонаў прыгажосці, з якімі я пагутарыў, прагаварыліся, дарэчы, што ў апошнія гады з'явіўся новы від медыцынскага турызму — «шакаладны». Расказалі, што некаторыя фірмы дазваляюць сабе раскошу накіроўваць супрацоўніц на шакаладныя абгортванні — у якасці «бонусу» за добрую працу. А быў выпадак, калі калектыў прыватнага прадпрыемства паклапаціўся пра тое, каб іх шэф «выкупаўся ў шакаладзе». Потым, як прызналіся адміністратару салона падначаленыя шчаслiўца, ён прэміраваў сваіх калег.

А закаханыя мужчыны дораць такія падарункі сваім дамам. Шчыра кажучы, і я хацеў бы зрабіць сюрпрыз сваёй — на Дзень святога Валянціна. Каб купалася ў шакаладзе і не плакалася... (Ну, на тэму жаночых прэтэнзій мужчыны могуць напісаць таўшчэзныя тамы).

### «АБГОРТКУ» МОЖНА ЕСЦІ

Для зацікаўленых магу зазначыць, што шакалад, які выкарыстоўваецца для абгортвання, у прынцыпе, можна есці. Робяць жа яго са звычайнай какавы! Але лепш не трэба, бо для працэдуры прымяняецца шакалад са спецыяльнымі касметычнымі дабаўкамі.

У Віцебскім абласным скурна-венерычным дыспансеры, дзе таксама «лечаць» шакаладам, расказалі, што галоўнае супрацьпаказанне — алергія на шакалад. Не рэкамендуюцца шакаладныя маскі, абгортванні і ванны тым, у каго ёсць захворванні крыві, сэрца і сасудаў, цяжкія захворванні дыхальнай сістэмы, злаякасныя і дабраякасныя новаўтварэнні, вірусныя, інфекцыйныя і грыбковыя захворванні, парушэнні цэласнасці скурных пакрываў. Супрацьпаказана шакаладнае абгортванне і цяжарным.

Што датычыцца кошту працэдуры, у Віцебску сярэдняя цана за сеанс — 350 тысяч рублёў. Задавальненне доўжыцца ад 1 да 1,5 гадзіны. Перад тым, як прыйсці ў салон, не трэба ніякіх візітаў да дэрматолага па даведку пра дазвол атрымаць шакаладную асалоду.

У суседняй Расіі кошт шакаладнага абгортвання ў 2 разы большы (інфармацыя спецыялізаваных сайтаў, на якіх рэкламуюць паслугу. — **Аўт.**). Ды і па працягласці працэдуры Беларусь «выйграе». У Расіі шакаладнае абгортванне можа цягнуцца ўсяго 20 хвілін, і каштаваць гэта будзе ад 2,3 тысячы расійскіх рублёў. Таму і не дзіўна, што шмат прыезджых расіян з задавальненнем наведваюць касметычныя салоны Віцебска.

Як расказалі ў адным з салонаў, некаторыя «зоркі» эстрады падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар» «лечацца» шакаладам. Пасля доўгіх угавораў журналісту «Звязды» раскрылі «медыцынскую тайну». У прыватнасці, Надзея Бабкіна і Тамара Гвердцытэлі высока ацанілі якасць шакаладнага «абслугоўвання». Праўда, хацелі прыняць шакаладныя ванны. Але і ад абгортвання не адмовіліся.

### А НАВОШТА?

Унікальнасць шакаладу ў тым, што дзякуючы гармону (трыптафану. — **Аўт.**), які ёсць у ім, чалавек «трапляе ў рай». Нездарма вышэйзгаданы гармон называюць «гармонам шчасця». Шакаладная маска — самы эканомны варыянт з усіх вышэйпералічаных. Такія маскі можна зрабіць і самастойна, толькі трэба купіць у аптэцы без рэцэпту слоічак з адпаведнай прадукцыяй. Шакаладная маска рэкамендуецца для таго, каб паменшыць расцяжкі на скуры (на грудзях, сцёгнах, жываце). Асабліва папулярныя маскі ў жанчын, якія нядаўна нарадзілі, а таксама ў дам, якія мараць пахудзець. Шакаладная маса не толькі сцягвае скуру, але і малодзіць, надае скуры эластычнасць, мяккасць, «дзіцячую» свежасць. Каб зрабіць самастойна шакаладную маску, трэба на чысты ўчастак скуры нанесці невялікі слой шакаладнай масы. І ўжо хвілін праз пяць можна змываць нанесенае.

Шакаладнае абгортванне ў хатніх умовах зрабіць праблематычна. Ну, калі толькі вы ці ваша сяброўка не працуе ў касметалагічным салоне. Бо неабходна прытрымлівацца патрабаванняў тэхналагічнага працэсу. Хоць пры жаданні можна і паспрабаваць зрабіць гэтую працэдуру самастойна. Падчас шакаладнага абгортвання выводзяцца таксіны. У параўнанні з шакаладнай маскай, працэдура больш эфектыўна ўплывае на памяншэнне тлушчавых адкладанняў, а таксама значна павышае эластычнасць скуры, служыць паляпшэнню абмену рэчываў. А ўвесь сакрэт у тым, што, пасля таго як на цела нанесена шакаладная маса, чалавека загортваюць у «тэрмічную коўдру» — спецыяльную плёнку. Дома можна ўжываць і поліэтылен, хоць эфект ад гэтага будзе значна меншым.

Шакаладная ванна — вельмі дарагое задавальненне. Каб цалкам апусціць цела ў шакаладную масу, спатрэбіцца шмат карыснага рэчыва. Тыя, хто «купаўся ў шакаладзе», канстатуюць, што пасля працэдуры быццам зноўку нарадзіліся. І, напэўна, не хлусяць.

Жанчыны яшчэ распавядаюць, што пасля шакаладных ваннаў пачалі адчуваць сябе... больш жаданымі. Дарэчы, гэтая касметалагічная працэдура, як сцвярджаюць сексолагі, спрыяе таму, што і ў самой жанчыны павялічваецца жаданне весці больш актыўнае сексуальнае жыццё. Дык насамрэч ці трэба здзіўляцца, што ўсё больш мужчын у якасці падарунка да святаў уручаюць сваім каханым сертыфікаты на наведванне касметычных салонаў?

Каб паспрабаваць зрабіць шакаладную ванну дома, патрэбна наступнае. Купіце мінімум 200 грамаў какавы (у ідэале неабходна ўсё ж выкарыстоўваць шакалад медыцынскага прызначэння. — **Аўт.**). Какава заліваецца літрам гарачай вады, але не кіпнем. Атрыманы раствор пасля перамешвання выліваем у напоўненую вадой ванну. І наперад — па задавальненне!

Вельмі карысныя для здароўя таксама мядовыя абгортванні. У Віцебску таксама практыкуецца лячэнне прадуктамі з торфу, парафінатэрапія і іншыя «маладзільныя» працэдуры.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ** ■

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН**. Атрымаеце велізарную колькасць знакаў увагі, што вельмі пахвальна для вас, і пераканаецеся ў тым, што неабходны мноству людзей, а вашы светлыя ідэі і бясспрэчныя дасягненні будуць ацэнены партнёрамі па заслугах. Верагодная сустрэча з патэнцыйным працадаўцам, якая можа адбыцца ў нефармальных абставінах. Не бойцеся хуткіх змен, бо пры невялікіх высілках з вашага боку лёгка дамажацеся істотных вынікаў.

**ЦЯЛЕЦ**. Будзеце распешчаны Фартунай па поўнай праграме. Неверагодна прыемныя падзеі, буйныя і не вельмі, будуць сыпацца на вас. Ёсць верагоднасць атрымання вельмі прывабнай прапановы. Майце на ўвазе, што, незалежна ад добразычлівасці вышэйзгаданай багіні, можа спатрэбіцца ўся ваша мудрасць і рашучасць. Не забывайце і пра свае тылы, умацоўвайце і карэкціруйце іх слабыя бакі.

**БЛІЗНЯТЫ**. Пачатак тыдня абяцае быць досыць напружаным, таму не рэкамендуецца рабіць якія-небудзь рашучыя крокі, а ўсе важныя службовыя і асабістыя справы лепш перанесці на сераду. Вялікая верагоднасць адшукаць сродкі для рэалізацыі сваіх ідэй і атрымаць ад навакольных падтрымку сваіх пачынанняў.

**РАК**. На пачатку тыдня найбольш правільным учынкам стане ўдумлівая падрыхтоўка да рашучых дзеянняў, якія чакаюць вас напрыканцы яго. Паспрабуйце не паддавацца на прапанаваныя вам вар'яцкія ідэі і не ўвязвайцеся ў авантуры, хай нават яны абяцаюць выдатныя перспектывы.

**ЛЕЎ**. Тыдзень можа надаць вам такія сілы, што вы будзеце гатовыя хоць горы звярнуць. Але тым не менш некаторыя падзеі і справы не будуць здзяйсняцца так хутка, як хацелася б. У гэтым выпадку будзе дастаткова запасціся цярпеннем і часткова перанесці рэалізацыю планаў на наступны месяц. У зносінах з калегамі па працы, сябрамі і блізкімі варта імкнуцца да разумнага кампрамісу і абдумваць кожны свой крок, а не спяшацца рабіць паспешныя высновы.

**ДЗЕВА**. Вельмі падыходзячы час для самаадукацыі і развіцця здольнасцяў. Вучыцеся быць сабранымі і ўраўнаважанымі, пазбягайце магчымых непрыемнасцяў і праектаў з намёкам на авантурнасць. Так вы выключыце наступствы ў выглядзе расчаравання і засмучэння. Калі сітуацыя, якая склалася, прывядзе вас у тупік, не прапануючы запаснога выйсця, вы заўсёды можаце разлічваць на дапамогу сяброў.

**ШАЛІ**. На гэтым тыдні самым лепшым упрыгожаннем, апроч моднай адзежы і сучаснай стыльнай прычоскі, будуць такія выдатныя якасці, як дыпламатычнасць і тактоўнасць. Навакольныя людзі шануюць і паважаюць вас, паспрабуйце прыняць гэта як факт і не напружваць свет жаданнем бачыць яго ля сваіх ног, трохі суцішце свае апетыты. Пажадана не забываць пра хатнюю ўтульнасць і паспрабаваць вылучыць больш часу для навядзення парадку і пазбаўлення ад старых рэчаў і непатрэбнага хламу.

**СКАРПІЁН**. Новыя ідэі і планы атрымаюць магчымасць увасобіцца ў жыццё, і начальства ўсяляк стане спрыяць гэтаму працэсу. Самае галоўнае — не спыняцца ў сваім руху наперад: дасягненне мэты будзе забяспечана своечасова, толькі перастаньце мітусіцца і спяшацца. Цяпер Фартуна да вас вельмі добразычлівая — карыстайцеся момантам і не выпускайце свой шанц.

**СТРАЛЕЦ**. Першую палову тыдня пажадана прысвяціць абнаўленню вашага іміджу, і ўжо ў чацвер ваша свежае аблічча і бязмежнае абаянне могуць стаць прычынай поспеху ў шматлікіх сферах дзейнасці. Тыдзень будзе спрыяць атрыманню новых ведаў і знаёмству з новымі людзьмі. Можаце атрымаць важную навіну, здольную аказаць моцны ўплыў на ваша жыццё, так што прадумайце ўсе дэталі і паспрабуйце не дапускаць нядбайнасці ў яе выкарыстанні.

**КАЗЯРОГ**. Калі ў вас засталіся нявырашаныя праблемы, пажадана вырашыць іх у найбліжэйшыя дні, каб не цягнуць за сабой цяжкі груз. Новыя перспектывы будуць залежаць выключна ад вашай самадысцыпліны і актыўных дзеянняў. Некаторая безуважлівасць можа прывесці да недарэчнай забыўлівасці і спазненняў, таму ўсю важную інфармацыю лепш дзе-небудзь зафіксаваць.

**ВАДАЛЕЙ**. Не ўспрымайце ўсё, што адбудзецца на гэтым тыдні, занадта сур'ёзна, але задумайцеся аб планах на будучыню. Нягледзячы на тое, што ў прафесійнай сферы ўсё будзе складацца досыць паспяхова, з верагодным павышэннем па службе ці атрыманнем прэміі, рэкамендуецца задумацца пра рост прафесійнага ўзроўню ці нават пра засваенне новай прафесіі.

**РЫБЫ**. Не забывайцеся, што вы з калегамі працуеце ў адной камандзе, будзьце шчодрыя з імі і не ўпускайце магчымасці падзяліцца назапашаным прафесійным досведам: гэта павінна прынесці немалы прыбытак. У сярэдзіне тыдня маецца рызыка прыняць няправільнае рашэнне з-за нежадання ўважліва разабрацца ва ўзніклых праблемах. У суботу таксама варта быць не менш уважлівымі, каб нязначная памылка не выклікала лавіну непрыемных наступстваў.


*Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд № 88»*

**20 февраля 2014 года**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Мостоотряд № 88»**

**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О реорганизации ОАО «СМТ № 8» путем присоединения к нему ОАО «ДСУ № 64, г. Борисов», ОАО «Мостоотряд № 88».
2. Об утверждении цены выкупа акций, выпущенных ОАО «Мостоотряд № 88».
3. Об утверждении договора о присоединении к ОАО «СМТ № 8» ОАО «ДСУ № 64, г. Борисов», ОАО «Мостоотряд № 88».
4. Об утверждении передаточного акта.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 12 февраля 2014 г. с 13.00 до 16.45 по месту нахождения Общества у председателя наблюдательного совета, а в день собрания – в помещении, где оно будет проводиться – в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

Регистрация участников собрания с **15.00** до **15.25** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 20 февраля 2014 года в 15.30**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 11 февраля 2014 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

УНП 100299744 *Наблюдательный совет*

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

**по объекту**
**«Строительство двух 19-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий. Жилой дом №1 по генплану»,**
*опубликованную в газете «Звязда» 29.11.2013 года.*

**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, помещение 3, каб. 4, 6. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8(029) 654 10 10.**

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 2-, 3-, 4-, 5-комнатные квартиры.**

Стоимость 1 кв.м 2-комнатных и 3-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 450 (одна тысяча четыреста пятьдесят) долларов США, при 100% единовременной оплате стоимость 1 350 (одна тысяча триста пятьдесят) долларов США.

Стоимость 1 кв.м 4-комнтантных и 5-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 300 (одна тысяча триста) долларов США, при 100% единовременной оплате стоимость 1 250 (одна тысяча двести пятьдесят) долларов США.

УНП 100070331

**Суд Центрального района г. Минска** просит граждан, а также юридических лиц сообщить все известные сведения, в том числе о месте пребывания, в отношении БУРЛОВА Валерия Петровича, 07 августа 1949 года рождения, уроженца г. Минска, зарегистрированного по адресу: г. Минск, ул. Нововиленская, 5-1, последнее известное место пребывания — там же.

Указанные сведения необходимо сообщить суду по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 21-206, в течение 2 месяцев с момента опубликования данного объявления.

УНП 100055817

**И З В Е Щ Е Н И Е**
**о проведении 18 марта 2014 года открытого аукциона по продаже объекта недвижимости.**
**Продавец, юридический адрес:**
**Открытое акционерное общество**
**«Жлобинская швейная фабрика»,**
247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 17, тел. (02334) 2 26 90

| № лота | Наименование объекта (лота) | Краткая характеристика и адрес объектов (лота) |
|---|---|---|
| 1 | **Двухэтажное изолированное нежилое помещение, инв. № 320/D-29112** | Назначение: помещение неустановленного назначения. Общая площадь: 359,3 кв.м |
| | Адрес объекта | г. Жлобин, ул. Петровского, 17-3В |
| | Начальная цена продажи объекта (лота) с НДС | **1 022 400 000** белорусских рублей |
| | Задаток | **500 000** белорусских рублей |

Аукцион состоится **18 марта 2014 г. в 11.00** по адресу: г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд.

Организатор торгов – Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45, 2-й подъезд.

Возможность ознакомиться с объектом предоставляется продавцом в срок **по 12 марта 2014 г.** включительно.

Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок **по 12 марта 2014 года с 9.00 до 17.00 по рабочим дням** представить в адрес организатора аукциона необходимый пакет документов.

Телефоны организатора аукциона для справок: (02334) 2 18 18, 3 14 08.

**Полный текст извещения опубликован в газете «Новы дзень» № 10 (12008) от 07.02.2014 года, а также в интернете на сайте Жлобинского райисполкома gisp.gov.by.**

УНП 490317354

**17 марта 2014 г. в 16.00**
**состоится очередное общее собрание акционеров**
***ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ»***

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Итоги финансово-хозяйственной дятельности общества за 2013 год и основные направления деятельности общества в 2014 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков общества за 2013 г.
4. О выплате дивидендов и утверждении распределения прибыли и убытков общества за 2013 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2014 году.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

**Местонахождение ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ»:** Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Место проведения собрания: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Время регистрации в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 10.03.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

*УНП 200034706* **Наблюдательный совет**

**ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ**

| | |
|---|---|
| **Полное наименование и местонахождение покупателя акций, контактный телефон** | Открытое акционерное общество «Бреставтоторгсервис», 224007, г. Брест, ул. Московская, д. 364, тел. 8 0162 40 92 00 |
| **Полное наименование и местонахождение эмитента, акции которого приобретаются** | Открытое акционерное общество «Бреставтоторгсервис», 224007, г. Брест, ул. Московская, д. 364 |
| **Цель приобретения акций** | Для последующего аннулирования |
| **Количество акций, которое намеревается приобрести покупатель** | 73495 штук |
| **Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций** | 224007, г. Брест, ул. Московская, д. 364, ОАО «Бреставтоторгсервис» |
| **Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции** | 4900 рублей |
| **Срок, форма и порядок оплаты акций** | В течение 5-ти рабочих дней с момента совершения сделки по безналичному расчету. |
| **Даты начала и окончания срока представления предложений акционеров о продаже акций** | 17 февраля 2014 г. по 25 февраля 2014 г. |
| **Даты начала и окончания покупки акций (заключение договоров купли-продажи акций)** | 03 марта 2014 г. по 07 марта 2014 г. |

УНП 200274439

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН в Ушачском районе Витебской области**

Организатор: Веркудский сельский исполнительный комитет

| Лот | Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер | Условия и ограничения, инженерно-геологические условия* | Сумма подлежащих возмещению затрат на формирование и регистрацию участка, руб. | Начальная цена лота, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Горы 1, д. 6, Ушачского р-на Витебской обл., площ. 0,2282 га, кадастровый № 224980902601000013** | - земли в водоохранных зонах водных объектов оз. Черствядское | 4758980, кроме того, плюс расходы на организацию и проведение аукциона | 5 000 000 Задаток 10% 500 000 |
| 2 | **д. Городок, Ушачского р-на Витебской обл., площ. 0,25 га, кадастровый № 224980902101000043** | - земли в водоохранных зонах водных объектов оз. Паульское | Только расходы на организацию и проведение аукциона | 20 000 000 Задаток 10% 2 000 000 |

** Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры: возможность подключения к инженерным сетям.*

Целевое назначение участка — для строительства и обслуживания жилого дома, назначение в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества 1 09 02 — земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома).

1. **Аукцион состоится 12 марта 2014 года в 12.00 в здании Веркудского сельского исполнительного комитета по адресу: 211493, аг. Веркуды, ул. Школьная, д. 13, Ушачского р-на Витебской обл., 2-й этаж. Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений и документов 06.03.2014 г. до 17.00.**

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

3. *Сумма задатка перечисляется на р/с № 3641328021084 ф-л № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк, код 150801648, УНН 300007073, код платежа 04901, получатель — Веркудский сельисполком.*

**Контактные номера тел.: 8 02158 25 424, 8 02158 25 447.**

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТОРГРАЗВИТИЕ»!**

**Приглашаем Вас принять участие в общем собрании акционеров ОАО «Торгразвитие»,**

которое состоится 4 марта 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Вильямса, 45, каб. № 23.

**Начало регистрации** участников собрания с 10.00 до 10.30

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2013 году и основных направлениях деятельности Общества на 2014 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2013 году.
3. О результатах аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 год.
4. Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса за 2013 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2013 год и выплате дивидендов за 2013 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2014 году и 1 кв. 2015 года.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. Определение размера вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

*УНП 100041437* **Наблюдательный совет**

**ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ**

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **Лот № 1** Изолированное помещение с инвентарным номером 250/D-35091, назначение – административное помещение, наименование – административно-бытовое помещение, общей площадью 326,6 кв.м, расположенное по адресу: Полоцкий район, Экиманьский с/с, 17-1 **Первоначальная стоимость –** 469 341 931 рублей. **Лот № 2** Изолированное помещение с инвентарным номером 250/D-35090, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, общей площадью 299.8 кв.м, расположенное по адресу: Полоцкий район, Экиманьский с/с, 17-2 **Первоначальная стоимость –** 435 812 781 рублей. **Лот № 3** Капитальное строение с инвентарным номером 250/С-192, назначение – здание специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция, общей площадью 49,3 кв.м, расположенное по адресу: Полоцкий район, Экиманьский с/с, 21/2 **Первоначальная стоимость –** 79 980 512 рублей. **Лот № 4** Помещение транспортного назначения с инвентарным номером 250/D-31123, общей площадью 311 кв. м, расположенное по адресу: Полоцкий район, Экиманьский с/с, 17-3 **Первоначальная стоимость –** 505 130 552 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | Коммунальное унитарное производственное проектно-строительное предприятие «Полоцксельстрой» |
| **Информация об обременениях** | Аренда |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. «Правды», 32, 04 марта 2014 года в 11.00 |
| **Справочная информация** | Главное управление юстиции Витебского облисполкома 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 34 Судебный исполнитель Трашков Игорь Сергеевич, тел. 8 021 260 54 79, факс 8 021 260 08 17 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет Главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО СБ «Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 10.00 04.03.2014. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

УНП 300058888

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**(о проекте строительства «Жилая многоквартирная застройка со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого в г. Минске. 3-я очередь строительства. Жилой дом № 4 по генплану»)**

**Информация о застройщике**: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30 – 17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства – 16 месяцев.
2. Жилой дом № 26 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
3. Жилой дом № 22 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.

**Информация о проекте и об объекте строительства:**

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома со встроенным административным помещением, в том числе с привлечением к строительству не менее 10% общей площади жилых помещений граждан, из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска и осуществляющих строительство по направлениям администраций районов г. Минска.

Положительное заключение государственной экспертизы № 126-15/13 от 18.03.2013 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Фрунзенский район, жилой дом № 4 по генплану в жилой многоквартирной застройке со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого. 3-я очередь строительства.

**Характеристика объекта.**

Объект – 131-квартирный, 19-этажный крупнопанельный жилой дом серии М-111-90 со встроенным административным помещением общей площадью 68,57 м² и помещением товарищества собственников на первом этаже. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся с выполнением в полном объеме отделочных, сантехнических и электротехнических работ, предусмотренных проектно-сметной документацией.

Административное помещение строится без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды).

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска и осуществляющих строительство по направлениям администраций районов г. Минска:

**Для нормативной площади:**
- с государственной поддержкой – **6 776 000 руб.;**
- без государственной поддержки – **7 247 000 руб.**

**Для площади, превышающей нормативную площадь:**
- с государственной поддержкой – **12 727 000 руб.;**
- без государственной поддержки – **13 162 000 руб.**

**Стоимость 1 м² для административного помещения – 14 800 000 руб.**

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс-мажорных обстоятельств и других, не зависящих от застройщика причин. При этом застройщик при достройке объекта вправе применять индексацию стоимости выполняемых работ в течение всего дополнительного срока строительства. Изменение цены объекта долевого строительства также возможно в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, если они оказали влияние на цену объекта долевого строительства.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 3531 от 22 ноября 2012 г., свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 29 декабря 2012 г. № 500/1001-1788. Площадь земельного участка – 4,1803 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 131.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие не несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Начало строительства жилого дома – 3-й квартал 2013 г., предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 3-й квартал 2014 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 3531 от 22 ноября 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Для заключения договора создания объекта долевого строительства предлагается административное помещение, расположенное на первом этаже жилого дома общей площадью 68,57 м².

Гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, по направлениям администраций районов г. Минска, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 10 квартир, из них 1 однокомнатная квартира общей площадью 45,17 м² жилой площадью 17,96 м², 5 трехкомнатных квартир общей площадью 78,05 м² жилой площадью 45,1 м², 2 трехкомнатные квартиры общей площадью 77,8 м² жилой площадью 45,1 м², 2 трехкомнатные квартиры общей площадью 81,77 м² жилой площадью 45,1 м².

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:**

Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет № 1, тел. 207-19-15), ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник-четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 4 (221)



■ Дзеля памяці

# АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ І ЯГО СЦЯГ

*Увесь 2014 год праходзіць пад знакам юбілею народнага паэта*

**Класікамі літаратараў называюць людзі. Вядома, за што: калі было напісана шмат, напісана адметна пра тое, што адлюстроўвала час і яго дух. А гэта значыць, што ў нейкі момант імёны класікаў пачынаюць успрымацца нават без уліку іх творчасці ці праз невялікую яе частку, найбольш разрэкламаваную ці цытаваную.**


library.mogilev.by.
Аркадзь Куляшоў — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Мінск, 1946 г.

Імя Аркадзя Куляшова, класіка беларускай літаратуры савецкага часу, прыходзіла ў нашу свядомасць з дзяцінства — спачатку праз верш пра «юнака на дапросе» ды паэму «Сцяг брыгады». Вобраз паэта складваўся такі: ідэя, найперш ідэя, патрыятызм, патрыятызм у абсалюце, памножаны на ідэю. У прынцыпе, так і ёсць: Куляшоў пісаў пра савецкую радзіму, правадыра, камуністаў, пісаў правільна, узнёсла. Нібыта нават быў не вельмі задаволены падыходам Міхася Чарота, які рэдагаваў яго першы зборнік і імкнуўся прыбраць залішнюю ўзнёсласць. Але ж гэта толькі ўмацоўвае ў думцы, што, здаецца, Куляшоў шчыра верыў у тое, пра што пісаў. Аднак шчыра верылі многія (мільёны). А пісаць з перакананнем і пераконваць іншых маглі адзінкі. Таму што адной шчырай веры мала для таго, каб пісаць вершы і паэмы, мала нават навучыцца рыфмаваць радкі. Найперш трэба нарадзіцца паэтам. Потым трэба ім стаць — перад людзьмі.

Куляшоў не толькі нарадзіўся паэтам у Беларусі, але і стаў ім тут. Не, стаў не тады, калі атрымліваў высокія дзяржаўныя прэміі (нават сталінскія) ці ордэны за працу на літаратурнай ніве. Стаў, калі яго радкі запалі ў душу. Пасля «правільнага» вывучэння творчасці гэтага паэта ў школе, мяне, напрыклад, вельмі ўразіла, калі ў адным з канцэртаў, дзе спявалі «Песняры», аб'явілі песню на верш Аркадзя Куляшова. Тады гэта было адкрыццё: можна пісаць пра стальных людзей і ў той жа час быць лірыкам, словы якога гучаць пранікнёна: «Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая...» І гэтыя словы не трэба было вучыць наўмысна, яны самі прыйшлі, самі засталіся. Самі ўзнікаюць у некаторыя моманты, калі ўсё не так і сэрца разрываецца: «Стаю на ростанях былых, а з паднябесся// Самотным жаўранкам звініць і плача май». Адкрыццё было вельмі нечаканым: песні ж звычайна маюць свой лёс, які ў свядомасці больш стасуецца з імёнамі выканаўцаў. Але ж у беларускай культуры песні, створаныя не «на словы», а «на вершы», маюць не проста папулярнасць, яны набываюць статус мастацкіх твораў. Гэта быў іншы Куляшоў. Ён такім адкрыўся аднойчы — не стальны, хоць і загартаваны жыццём, вайной, іншымі выпрабаваннямі, як прызнаваўся сам у адным з вершаў:

*Пашанцавала тройчы мне,*
*Я тройчы, выпрастаўшы рукі,*
*Ляжаў не ў ложку, а ў труне...*
*Я знаю, што такое мукі.*

Шмат што ў разуменні і адчуванні паэтаў залежыць насамрэч ад нас саміх, ад таго, што мы прачыталі ў іх радках. Што прачыталі, можа быць, і паміж імі. Таму што другім моцным уражаннем ад творчасці Куляшова для мяне была паэма «Хамуціус». Сам факт, што ён у 1975 годзе звярнуўся да асобы Кастуся Каліноўскага, здаецца неверагодным: гэта той час, калі галоўнымі дзейнымі персанажамі ўсіх сфер былі партыйныя босы, якія «вяшчалі» з трыбун. Праўда, былі героі — тыя, хто здабыў перамогу на франтах апошняй вайны. Але Куляшоў паказаў іншага героя, з «нямоднага» ў той перыяд часу, які аддаў жыццё за радзіму. Героя іншага гатунку, які ўвасабляў іншы патрыятызм. Проста Куляшоў быў беларускім паэтам...

Ён пакінуў пасля сябе каля 30 кніг паэзіі. Першыя зборнікі, як, напрыклад, «Росквіт зямлі» (1930), «Медзі дождж» (1932), «Па песню, па сонца» (1932), прадстаўлены на выставе «...І сэрца абпалена смагай радка», што 6 лютага, у дзень 100-гадовага юбілею паэта, адкрылася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. Тут жа можна пабачыць пераклады яго вершаў на ўкраінскую, польскую, рускую, англійскую, літоўскую, армянскую, нават мангольскую мовы. Сам Аркадзь Куляшоў таксама займаўся перакладамі: дзякуючы яму па-беларуску можна прачытаць «Цыганоў» і «Яўгена Анегіна» Пушкіна, лірыку Лермантава, Ясеніна, Маякоўскага і іншых рускіх паэтаў. Куляшоў, між іншым, меў дачыненне да развіцця беларускага кіно ў савецкі час, таму што з'яўляўся галоўным рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм» і нават спрычыніўся да стварэння сцэнарыяў такіх фільмаў, як «Чырвонае лісце», «Першыя выпрабаванні», «Запомнім гэты дзень».

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры прадставіў да юбілею рукапісы, нататнікі, узнагароды народнага паэта Беларусі — усё можна пагледзець на выстаўцы. У дзень нараджэння Куляшова адбылася музычна-паэтычная вечарына, дзе гучалі словы — яго і пра яго. Адметна, што нашчадкі Аркадзя Куляшова працягваюць служыць беларускай культуры, напрыклад, унук Уладзімір Бербераў стварыў фальклорны ансамбль «Ліцвіны». Праўнучка Алеся Іса — маладая мастачка. Але калі слухаеш іх песні і глядзіш малюнкі, то думка прыходзіць адна: буйная рака заўсёды мае свой выток. Як і творчасць.

Аркадзь Куляшоў пражыў не надта доўгае жыццё (64 гады). Але ў яго паэзіі працягваецца жыццё духу, які ўсё ж бессмяротны. І галоўнае ў яго творчасці тое, што праз яе ў складаны савецкі час штучнай рыторыкі прабіваліся промні святла беларускага слова. Нават тады, нават у глабальным утварэнні пад назвай Савецкі Саюз заяўлялася пра адметнасць беларускай культуры — праз літаратуру.

100-годдзе Аркадзя Куляшова, якое адзначаецца ў краіне сёлета, — нагода для таго, каб звярнуцца да беларускага слова і айчыннай паэзіі. Насамрэч яна была яго сцягам, які трэба было ўтрымаць і перадаць наступным пакаленням.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Аркадзь КУЛЯШОЎ

### ДА ПАЭЗІІ

*Я — вязень твой, а ты — мая турма,*
*Асуджан я любоўю пажыццёва.*
*Зняволенне маё датэрмінова*
*Ты скараціць спяшаешся дарма.*

*Дарэмна, заняволіўшы другога,*
*Ты варту памяншаеш мне ўдвая -*
*Не мае сэнсу гэта засцярога*
*І гэтая прадбачлівасць твая.*

*Я не збягу, пазбаўлены нагляду,*
*Не перастану ланцугом грымець,*
*Штодзень хадзіць на шпацыр па раскладу,*
*Галадаваць і ў карцары калець.*

*Не можаш ты мяне пазбавіць мовы,*
*Змяніць мой лёс уладаю сваёй,*
*Не ты мяне абрала — вязень твой*
*Абраў цябе на тэрмін пажыццёвы.*

### ❐❐❐

*Не сустракацца*
*мне больш ніколі*
*З маім маленствам*
*у чыстым полі,*
*З маім юнацтвам*
*у лесе цёмным,*
*З маім ваенным*
*жыццём бяздомным.*
*Па ціхіх вулках,*
*па трактах гулкіх*
*Прайшлі маленства,*
*юнацтва леты*
*І, перакуленыя ў рачулках,*
*Сплылі з вадою*
*на край планеты.*
*Яны ўжо —*
*кропля святла ў сусвеце.*
*А я, не вечны і нецярплівы,*
*Чакаць не згодны,*
*што нехта недзе*
*Праявіць некалі*
*іх негатывы.*
*Мне б хуткасць думкі,*
*бляск уяўлення,*
*Каб мог я словам*
*дагнаць праменне*
*І нечаканым*
*спыніць экранам*
*Гады былыя*
*на вокамгненне.*
*Я б галавою*
*прыпаў ссівелай*
*Тады б да ног іх,*
*ад шчасця плакаў,*
*У чыстым полі*
*паперы белай,*
*У цёмным лесе*
*чарнільных знакаў.*

# «ВЫ ЎСЁ, ВЫ ЎСЁ ПЕРАЧЫТАЙЦЕ...»

**Славутыя паэты Аркадзь Куляшоў і Аляксей Пысін нарадзіліся ў вёсках суседніх раёнаў — Касцюковіцкага і Краснапольскага. Ды зблізіла іх не зямляцтва, а паэтычная творчасць. Куляшоў і Пысін шчыра сябравалі, сачылі за публікацыямі адзін аднаго, дарылі адзін аднаму свае кнігі з аўтографамі.**

Аркадзь Куляшоў яшчэ па першых зборніках свайго земляка заўважыў яго талент, Божую іскру паэзіі. У лісце хоцімскаму краязнаўцу Міхасю Ласоўскаму ён пісаў: «Таленавітых хлопцаў у нас шмат. Калі пералічваць, дык атрымаецца вялікі спіс. Мне, як магіляўчаніну, хочацца назваць свайго земляка Аляксея Пысіна. Гэта вельмі здольны самабытны паэт».

Высока цаніў творчасць Аркадзя Куляшова Аляксей Пысін: «У асобе Аркадзя Куляшова наша сціплая ў бярозах і соснах зямля магілёўская, зямля беларуская дала свету вялікага паэта».

Калі Куляшоў пайшоў з жыцця, то Аляксей Пысін стаў шчодрым прапагандыстам паэтычнай творчасці свайго сябра. І ў Магілёве, і ў раёнах вобласці на літаратурных вечарынах сардэчна і задушэўна гаварыў ён слова пра Куляшова. Па ініцыятыве і пры самым актыўным удзеле Пысіна ў Саматэвічах Касцюковіцкага раёна, дзе нарадзіўся вядомы паэт, сталі рэгулярна ладзіцца куляшоўскія чытанні. У іх бралі ўдзел вядомыя літаратары з Мінска. Арганізатарам іх кожны раз быў Аляксей Пысін. Па яго падказцы артыст Валянцін Ермаловіч з навучэнцамі вучылішча культуры падрыхтаваў канцэртную праграму, прысвечаную жыццю і творчасці Куляшова. І ў Магілёве, і ў раёнах вобласці праведзены дзясяткі куляшоўскіх канцэртаў. Нярэдка ў іх браў удзел Аляксей Пысін. Вось што ён казаў пра Куляшова: «...Мы рэдка сустракаем хлебароба ў горадзе, але кожны дзень бачым хлеб на нашым стале і заўсёды паважаем салаўя, калі слухаем яго спеў. Мы не кожны дзень рупім сонца ў вочы, але заўсёды і ў сонечную, і ў пахмурную часіну мы адчуваем яго цяпло і ласку. Такім быў Аркадзь Куляшоў: сціпла непаказны і ў той жа час арганічна прысутны і ўжо вечны, як хлеб і сонца.

*Я ўпарты, не кіну пачатыя справы,*
*Каменне крышу, разграбаю пяскі,*
*Пад спіны аматараў лёгкае славы*
*Пракладваю рэчышча*
*ўласнай ракі.*

Паэт здабываў самародкі, залатыя крупінкі паэзіі. Для гэтага і крышыў каменне, разграбаў пяскі, не жадаючы ўяўнай славы. Затое свяціў агнём сапраўдным, агнём нязгасным свайго сэрца».

**Аляксей ПЫСІН — аўтар верша «Памяці Аркадзя Куляшова»:**

*Калі б вясне, Дняпру і чайцы*
*Па-свойму мог сказаць я так:*
*Вы ўсё, вы ўсё перачытайце,*
*Што напісаў пра вас зямляк.*
*Ды ведаю — наіўна гэта,*
*І лес, і поле, і рака —*
*Яны суаўтары паэта*
*Ў стварэнні слова і радка.*
*І пэўна, ужо ад іх пачуў ты,*
*Хто светла ўзвеяў земляку*
*Баладны боль і смутак чуйны,*
*Што ў тым жа слове і радку.*
*З ім акіяны размаўлялі,*
*Вяла з ім вечнасць дыялог.*
*Сяброў, што тайна давяралі,*
*Выслухваць і бязмоўных мог.*
*Былі шляхі і цень прывала,*
*І пік з глыбіннай вышынёй...*
*У лесе вогнішча сплывала*
*Перад нязведанай мяжой.*
*І што яму агонь высвечваў,*
*Што заштрыхоўваў побач змрок?*
*Размова з вечнасцю — не веча,*
*Ды промнем вечнасці — радок.*
*У ім і сінява, і чырвань,*
*У ім усё, чым даражым,*
*Усё, што будзем перачытваць*
*Мы без яго жыццём сваім.*

Куляшоўскія чытанні праводзяцца штогод 6 лютага ў Касцюковічах і Магілёве. А ў сёлетні юбілей яны праходзяць на зямлі магілёўскай і беларускай паўсюдна.

**Віктар АРЦЕМ'ЕЎ**

■ Трэба бачыць

# ВЯРНУЦЬ МОДУ НА МАСТАЦКУЮ АДУКАЦЫЮ

## спрабуюць на выстаўцы, прысвечанай славутаму каледжу імя Ахрэмчыка

**Прыйсці на адкрыццё выставы «Парнат 84-11Б» у Нацыянальны гістарычны музей варта было хаця б таму, каб паглядзець, як мастацтвазнаўца і тэлевядучая Таццяна Бембель частуе наведнікаў кефірам з чайніка і батонам з канфіцюрам. Але гэта не проста акт добрай волі, гэта частка канцэпцыі. Менавіта такім некалі быў падвячорак навучэнцаў славутага Парната, як з любоўю называюць гімназію-каледж мастацтваў імя Ахрэмчыка яго навучэнцы. І менавіта ў 1984 годзе 11 «Б» клас (у складзе Юрыя Якавенкі, Сяргея Расолькі, Алега Усціновіча, Ілоны Касабукі, Таццяны Зазулі, Віктара Санько, Дзмітрыя Галуцкага, Аляксандра Жукава, Таццяны Крупскай, Уладзіміра Старушанкі, Руслана Вашкевіча, Пятра Пархімовіча, Алы Урублеўскай, Андрэя Сіцько, Ларысы Курылы, Валерыя Таргонскага) скончыў мастацкае навучанне ў Парнаце і выйшаў, так бы мовіць, у адкрыты «космас». Стварэннем канцэпцыі выставы, зборам усіх выпускнікоў і, уласна кажучы, вяртаннем моды на Парнат займаліся куратары выставы — мастацтвазнаўца Таццяна БЕМБЕЛЬ і мастак Руслан ВАШКЕВІЧ.**

— Мы не ведалі, што за прадукт у выніку атрымаецца, — распавядае Руслан Вашкевіч. — Нам быў важны чалавечы фактар, мы не былі ўпэўнены, наколькі гэта будзе мець дачыненне да сучаснага мастацтва. Але пляцоўка гістарычнага музея для гэтай выставы — спецыяльнае, асэнсаванае, куратарскае рашэнне. Каледж Ахрэмчыка мае дачыненне да гісторыі горада, да жывой культуры Мінска. І гэтым праектам мы хацелі вярнуць моду на Парнат.

Яшчэ ў выставачнай зале пахне свежымі батонамі!.. Яны акуратненька складзены ў кніжнай шафе... І спачатку гэтая інсталяцыя здаецца неверагодным вобразам, сімвалам, метафарай, арт-аб'ектам. А калі чытаеш перадгісторыю Таццяны Бембель, аказваецца, што гэта дакументальны факт, гістарычна праўдзівая шафа з батонамі. Тады, калі, напрыклад, сам Вашкевіч вучыўся ў Парнаце, хіба што батон навучэнцам каледжа-інтэрната (тады там дзеці жылі па 10-20 чалавек у пакоі! Цяпер умовы змяніліся: жывуць, як у летніку, па двое-трое) выдаваўся ў неабмежаванай колькасці. Уся астатняя ежа была парцыённай. Таму батон быў для парнатаўцаў сімвалам свабоды. Будучыя мастакі і музыкі (апошнія вучыліся ў паралельным «А» класе) набіралі сабе яго ў неабмежаванай колькасці, дасталі адтуль мякіш, залівалі павідлам, і атрымліваўся непараўнальна смачны гіганцкі піражок...

Выстава ў гістмузеі амаль напалову складаецца з такіх арт-аб'ектаў, якія, па сутнасці, з'яўляюцца народнай творчасцю, проста яе тут і цяпер узнавілі ў іншых сцэнах, вярнулі з запаснікаў памяці, нагадалі пра забаўныя і кранальныя моманты мастацкага мінулага. Вось стаіць ванна з глінай (прывітанне, скульптары!), вось — прыложкавая тумбачка з туалетнай паперай, зубной пастай і кіпяцільнікам, а вось — пасылка з амаль магічным надпісам «Бясцэннае» на драўлянай скрыні. У такіх парнатаўцам прысылалі з дому яблыкі.

— Наш каледж заўжды быў вельмі запатрабаваны, таму што тут сур'ёзная акадэмічная падрыхтоўка, распавядае **Людміла ШАХАВА, кіраўніца міжнароднага аддзела гімназіі-каледжа мастацтваў імя Ахрэмчыка,** якая доўгі час з'яўлялася яго дырэктарам. — Мы набіраем дзяцей з усіх рэгіёнаў Беларусі ў другі клас на музычнае аддзяленне і ў пяты клас на музычнае і мастацкае аддзяленні. Ніколі не было недабору. Заўжды ёсць запатрабаванасць мастацтва. Апошнія гады конкурс трымаўся ад 2 да 4 чалавек на месца.


Дыпломная праца Пятра Пархімовіча. Кажуць, што сённяшнія выпускнікі Акадэміі мастацтваў так маляваць ужо не ўмеюць.

Тое, што беларуская мастацкая адукацыя заўжды была на вельмі высокім узроўні, а нашы творцы (станковыя мастакі, кніжныя графікі, музыкі і г.д.) пастаянна прызнаюцца найлепшымі ў свеце на розных міжнародных фестывалях і конкурсах — бясспрэчны факт. Але калі ўсё так і Парнат запатрабаваны і сёння, чаму раптам спатрэбілася вяртаць моду на яго? Тут выставачны праект Бембель і Вашкевіча закранае больш грунтоўныя грамадскія і культурніцкія пытанні.

— Няма запатрабаванасці ў спецыялістах, якія тут рыхтуюцца, у нашай канкрэтнай краіне... — лічыць мастак Руслан ВАШКЕВІЧ. — Тое, што такая база, як Парнат, ёсць — гэта цудоўна. Але гэта такая сабе гульня ў бісер: рыхтуюць добрых прафесіяналаў, выканаўцаў, рамеснікаў, якіх потым невядома што чакае ў рэальным жыцці. Іх вучаць, вядома, не праектнаму мысленню: гэта студыя, рамяство, узаемавыручка — такі «спецназ» ад мастацтва. Людзі, гатовыя справіцца з любой пастаўленай задачай. Але дзе гэтыя задачы?.. І таму людзі раствараюцца ў прасторы пасля вучобы. І гэта — праблема, хутчэй, не самога Парната... Вось заробак маленькі ў выкладчыкаў. Таму ідуць туды не самыя лепшыя «байцы» сучаснага мастацтва... Але ж дзеці прыходзяць таленавітыя. Трое маіх дзяцей там вучацца, я ведаю гэта знутры. Гэтае новае пакаленне — вось дзе сіла, вось дзе «канверсоўная валюта». Вось каго можна было б прасоўваць, паказваць. Таленавітыя людзі з-за незапатрабаванасці бляднеюць, пачынаюць самакапаннем займацца...


Таццяна Бембель частуе ўсіх парнатаўскім падвячоркам: бутэлька кефіру, паўбатона.

Крытыка на адрас творчых навучальных установаў гучыць даўно. Напрыклад, вучаць будучых рэжысёраў, мастакоў або нават дызайнераў паказваць сябе, шукаць свой почырк і стыль, нешта адметнае. А ў выніку пасля заканчэння вучобы яны аказваюцца выкінутымі ва ўмовы жорсткага рынку, дзе ні пра які почырк, стыль і самавыяўленне і ведаць ніхто не ведае. Хіба што трэба зрабіць канкрэтную рэкламную афішу для канкрэтнага заказчыка ў пэўны тэрмін. Але ёсць прастора для канкрэтных задач: каб тыя ж лядовыя палацы, іншыя значныя аб'екты зрабіць годнымі, адмысловымі ў сэнсе архітэктуры, дызайну і мастацкага афармлення — колькі б творчых прафесіяналаў можна было задзейнічаць!.. Гэта, вядома, вобразна кажучы. Прыкладных сфер для мастакоў можна прыдумаць шмат. А то атрымліваецца, што выдатныя мастакі ў нас ёсць, а добры дызайн для самых буйных аб'ектаў і мерапрыемстваў зрабіць асабліва няма каму... Проста нейкае звяно ў гэтым ланцужку згубілася.

На выставе «Парнат 84-11Б» сабралі нават тых выпускнікоў, хто даўно знік з поля зроку або за мяжой, або ў глухіх вёсках. Так, можна пабачыць жывапіс на бяросце Уладзіміра Старушэнкі. Ён пэўны час працаваў лесніком, цяпер — мастак ва ўзорным вясковым лялечным тэатры. Таццяна Зазуля знарок на выставу прыехала з Санкт-Пецярбурга, дзе яна працуе на прадпрыемстве вядучым дызайнерам адзення. Аляксандр Жукаў, пра якога аднакурснікі таксама даўно не чулі, аб'явіўся і аказаўся цудоўным разбяром па дрэве. Ён жыве ў Маладзечне і выразаў з дрэва для выставы... батон! Выглядае ён амаль як сапраўдны.

> ВАРТА НАВЕДАЦЬ:
> *Выстава «Парнат 84-11Б» — гэта яшчэ і шмат іншых спадарожных мерапрыемстваў. Так, 13 лютага а 15 гадзіне адбудзецца лекцыя-дыялог «Тэорыя і практыкі паўсядзённасці» культуролага Ганны Вашчынчук. 18 лютага а 17-й пройдзе канцэрт гурта Apple Tea, некаторыя ўдзельнікі якога — выпускнікі Парната. 21 лютага а 12-й пройдзе «круглы стол» «Парнат і яго роля ў фарміраванні мастацкай эліты Беларусі».*

Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.


Жывапісныя творы Руслана Вашкевіча. Канструктыўна.

Усіх гэтых людзей мастацтва ў той ці іншай ступені паланіла на ўсё жыццё, і Парнат для іх значыць нашмат больш, чым проста школа. Безумоўна, калі б вы правучыліся разам з некім з пятага класа, жывучы ў адным доме, як у адной сям'і, вызнаючы адну ідэю — мастацтва — наўрад ці вы б калі-небудзь забыліся на такое! Так і гэтыя творцы: хтосьці больш, хтосьці менш запатрабаваны, але жывуць мастацтвам, ствараюць яго. А мы часта пра іх не дбаем, не беражом іх, нават не ведаем пра людзей, якія могуць і ўмеюць працаваць на карысць і імідж сваёй краіны. І спахопліваемся надта позна, калі ўжо незразумела, чый гэта мастак: рускі, польскі ці ўсё ж беларускі...

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ Фестывалі

# РАЗУМЕННЕ ЦЕЛА

## Лютаўскія (з)рухі тэатральнай «ПлаStформы»

**Фестываль пластычных і эксперыментальных тэатраў пройдзе ў Мінску з 10 па 16 лютага. У параўнанні з першым форумам, сёлета ён павялічыўся: па колькасці дзён і пляцовак, а таксама дадатковых мерапрыемстваў у выглядзе майстар-класаў, паведаміў аўтар ідэі, кіраўнік тэатра «ІнЖэст» Вячаслаў Іназемцаў. Менавіта гэты тэатр адкрые форум спектаклем «Рамонт» 11 лютага ў Палацы культуры чыгуначнікаў. Другой сцэнай для выступленняў стане Маладзёжны тэатр эстрады. Галерэя «Ў» выбрана месцам для дыскусій, якія ў рамках «ПлаStформы» не проста вітаюцца, а нават плануюцца.**

Пасля першай «ПлаStформы», якая прайшла летась, было шмат абмеркаванняў. Асноўная выснова: фестываль, які ладзіўся выключна з ініцыятывы і на энтузіязме апантаных людзей, на іх страх і рызыку, выклікаў дастатковую цікавасць у гледачоў і не сышоў у страты. Значыць, людзям хочацца разваг пра свет і жыццё, якія можна выказаць прыгожа і моцна без слоў, а толькі праз рухі. Тады ўсё атрымалася — сталі думаць пра другі фестываль. Тут і падтрымка падаспела: сёлета «ПлаStформу» падтрымаў Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт Карпарэйшн», а праз яго ўскосна Міністэрства культуры. Хоць клопат міністэрства больш скіраваны ў бок фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску. Але яго даўно недастаткова, таму што тэатр, які даносіць думкі і ідэі праз цела, развіваецца, з'яўляюцца новыя формы, жанры, стылі, якія цяжка нават бывае ўпісаць у існуючы фармат. І вось таму патрэбна «ПлаStформа» не проста як пляцоўка для паказаў, а як магчымасць дыялогу, абмену думкамі, вопытам. Акрамя таго, творчасць мае шмат праяў, якія не ўпісваюцца ў агульны тэатральны кантэкст, і яна мае права на развіццё.

— Можа быць, нам варта сумесна ствараць уласную лабараторыю. Мы ўсе варымся ва ўласным творчым працэсе, існуем у інфармацыйным вакууме. Нам трэба змяшацца, — разважае Вольга Скварцова, якая прадстаўляе Skvo's Dance Company.

Невядома, як там з абменам артыстамі, але абмен ідэямі ў творчасці вельмі патрэбны, таму што стварае магчымасць для прафесійнага росту. Эксперыменты ў творчасці хоць і адбываюцца з нейкіх унутраных штуршкоў ці то асобных людзей, ці то калектываў аднадумцаў, але, як правіла, яны адлюстроўваюць мастацкі кантэкст, які існуе ў краіне, у гэтым выпадку ў тэатральным асяродку. І цяжка не пагадзіцца з тым, што нашы тэатры ў большасці сваёй традыцыйныя і працуюць у выверaных напрамках, што дакладна падабаецца публіцы, для якой важна сачыць за сюжэтам, каб усё разжавалі і данеслі даступна. Тут — зусім іншае мастацтва. Але ж таму і хочацца свежых ідэй, новых формаў, іншага адлюстравання рэчаіснасці, прычым хочацца гэтага найперш самім творцам:

— Сёлета мы пастараліся сабраць усе найбольш значныя групы, якія праявілі сябе ў галіне пластычнага тэатра, — адзначае Вячаслаў Іназемцаў. — Паступіла шмат заявак, мы вялі адбор і адсейвалі некаторыя калектывы.

У праграму трапілі такія калектывы, як эксперыментальны тэатр «T(e)=Art», тэатр танца «Каракулі», тэатральная лабараторыя Fortinbras, Skvo's Dance Company, адэкватны тэатр «вКубе», Віцебск прадстаўляць тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі Дзіяны Юрчанкі і студыя сучаснага танца «Паралелі», Гродна — танец-тэатр «Галерэя», з Магілёва прыедзе Laboratory Figures Oskar Schlemmer, з Гомеля — група сучаснай харэаграфіі Quadro.

Беларускі форум падтрымаюць сваёй прысутнасцю замежныя госці, напрыклад, польскі Teatr Formy (Вроцлаў). Майстры з Польшчы правядуць майстар-класы. Але і ў беларускіх майстроў пластычнага тэатра будзе магчымасць павучыцца. Вучыцца разумець пластычны тэатр, дарэчы, трэба і гледачу — дзеля гэтага прадугледжаны лекцыі для ўсіх зацікаўленых. Таму што цела ў сучасным мастацтве — гэта інструмент, праз які даносіцца ідэя альбо ствараецца вобраз. Каб разумець мову цела, трэба хадзіць і глядзець...

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ТАЛЕНАВІТЫХ

**У Магілёве адсвяткавалі юбілей студыі, адкуль пачаўся творчы шлях Алены Ланской і Івана Буслая.**

Фота БЕЛТА.



Народная студыя вакалу «Дружбакі і сяброўкі», якая створана на базе Магілёўскага эканамічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа, адзначыла 15 гадоў. Сёння гэта адна з лепшых кузняў юных талентаў у Магілёве. Яе выхаванцы неаднаразова прызнаваліся пераможцамі і прызёрамі абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Менавіта яна стала стартавай пляцоўкай для заслужанай артысткі Беларусі Алены Ланской і пераможцы конкурсу эстрадных выканаўцаў «Сярэбраны грамафон» Івана Буслая. Разам з іншымі выхаванцамі студыі, якія прыехалі на свята, яны прынялі ўдзел у канцэрце на сцэне Палаца культуры вобласці.

Падчас святкавання танцавальны гурт «Дэнсхаўз», які ўваходзіць у склад студыі вакалу, быў прызнаны народным, а сама студыя ў чарговы раз пацвердзіла гэта ганаровае званне. Віноўнікам урачыстасці былі ўручаны Ганаровыя граматы і падзякі ад аблвыканкама, а таксама неабходныя для творчай працы падарункі ад спонсараў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «СВЯТА ДЗЯЦІНСТВА»

**Цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна г. Мінска адзначае «Свята дзяцінства» — дзень адчыненых дзвярэй, які праводзіцца ў музеі развіцця адукацыі ў апошнюю суботу месяца.**

Мерапрыемства стала ўжо традыцыйным. Яно дапамагае не толькі прыцягнуць вучняў да наведвання гурткоў, але і дае магчымасць пазнаёміць «дзяцей цывілізацыі» з прадметамі мінулага: пёравай ручкай, лічыльнікамі, сшыткам з прамакаткай, а таксама са школьнай формай, у якой сядзелі за партамі іх бабулі і дзядулі.

Апошні дзень адчыненых дзвярэй падвёў вынік навагоднім святам: малым паказалі фільмы пра гісторыю ёлачных цацак, прапанавалі прыняць удзел у гульнявой праграме «Персанажы зімы», а дзеці з гуртка «Батлейка» паказалі аднагодкам цацачныя спектаклі.

**Любоў БЯЛЯЕВА.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ»

информирует юридических и физических лиц о строительстве объекта:

**«Группа многоквартирных жилых домов по генплану №№ 11, 12, 13 в микрорайоне № 1 реконструируемой застройки в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)» (без наружных инженерных сетей) (далее – Объект)**

**ЗАСТРОЙЩИК** по Объекту – ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 15.05.2008 г., в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191024785. **Адрес**: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 16, пом. 2Н, каб.1, тел. 306-06-11. Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.30, выходные дни – суббота, воскресенье.

Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. В. Игнатовского, д. 8 (2009-2010 гг.).

**Объект состоит** из домов №№ 11, 13 (конструкции ОАО «МАПИД») и № 12 корпус 1, 12 корпус 2 (конструкции ОАО «МДК»), по генплану в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево), инженерных сетей и инженерно-транспортной инфраструктуры. Первым этапом предусмотрено строительство жилого дома № 13 по генплану. Дома запроектированы с техническим подпольем и теплым чердаком, предусмотрено центральное отопление. Благоустройство дворовой территории: детская игровая площадка, места для отдыха взрослых, малые архитектурные формы.

К долевому строительству предлагается вторая очередь строительства Объекта жилой дом № 13 по генплану на 445 квартир, состоящий из десяти подъездов 10-этажных секций серии КПД М464-У1.

**Цель проекта строительства** – исполнение решения Мингорисполкома «Об изъятии, предоставлении земельных участков, прекращении права частной собственности на земельный участок и разрешении строительства» № 336 от 14 февраля 2013 г.

**Условия оплаты стоимости объекта долевого строительства:**

Начало строительства объекта (ж/д № 13): – июнь 2013 года.

Окончание строительства объекта (ж/д № 13): – четвертый квартал 2014 г.

Общая площадь квартир объекта (ж/д № 13): – 26 362,04 м² (445 квартир).

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, вентшахты, коридоры, крыши, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых домов и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

***Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, <u>не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий</u>, предоставляются в*** жилом доме № 13 по генплану следующие квартиры:

а) **7 (семь) однокомнатных** квартир со строительными номерами №№ 139, 234, 239, 343, 352, 385, 388 по цене **13 500 000** (тринадцать миллионов пятьсот тысяч) рублей 1 м² объекта долевого строительства с оплатой 100% стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора;

б) **12 (двенадцать) трехкомнатных** квартир со строительными номерами №№ 5, 8, 25, 33, 36, 50, 66, 70, 81, 115, 119, 123 по цене **11 500 000** (одиннадцать миллионов пятьсот тысяч) рублей 1 м² объекта долевого строительства с оплатой **не менее 40%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора. При оплате **100% стоимости** объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора цена объекта долевого строительства составит **11 000 000** (одиннадцать миллионов) рублей за 1 м².

Цена 1 м² объекта долевого строительства сформирована на 31.12.2013 г. и является фиксированной на указанную дату и дифференцированной в зависимости от количества комнат.

Квартиры передаются дольщикам без чистовой внутренней отделки.

Условия ознакомления дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком.

**Застройщик имеет следующие разрешительные документы**:

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – Акты выбора размещения земельного участка, утвержденные председателем Мингорисполкома 27.04.2011 г. и 08.12.2011 г.;
- решение Минского городского исполнительного комитета от 14 февраля 2013 года № 336 о разрешении строительства объекта;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков:

временного пользования № 500000000006006946, площадью 1,2992 га;

постоянного пользования 500000000006006868, площадью 0,5571 га;

постоянного пользования 500000000006006869, площадью 0,0098 га;

постоянного пользования 500000000006006870, площадью 0,0081 га;

постоянного пользования 500000000006006871, площадью 0,0079 га;

- проектно-сметная документация, прошедшая государственную экспертизу (экспертное заключение, выданное РУП «Главгосстройэкспертиза» от 09.11.2012 г. № 995-15/12);
- договор строительного генподряда № 07-03/1 от 07.03.2013 г., заключенный с ОАО «МАПИД»;
- договор о долевом участии в финансировании проектирования и строительства инженерной и транспортной инфраструктуры № 11/И-2012 от 16.05.2012 г., заключенный с КУП «УКС администрации Фрунзенского района г. Минска»;
- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на проведение строительно-монтажных работ от 04 июня 2013 г. № 2-208Ж-015/13.

**Информацию об объекте долевого строительства**, планировках квартир и условиях заключения договоров можно получить у Застройщика по телефону 8 (017) 3060611, или в риэлтерской организации ООО «ДИНАС» (сайт **www.dinas.by,** тел. 8 (017) 2339610).

---

УНП 600010848

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | **ЛОТ № 1**<br>**Здание пищеблока**, общей площадью 60,5 м² с инвентарным № 631/С-61409, одноэтажное, кирпичное, с двумя сараями, уборной.<br>Начальная цена: **108 611 348** рублей без учета НДС 20%.<br>Объект расположен по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, ул. Старая, д. 56А<br>**ЛОТ № 2**<br>**Здание сезонного проживания**, общей площадью 107,5 м² с инвентарным № 631/С-61408, двухэтажное деревянное.<br>Начальная цена: **84 408 910** рублей без учета НДС 20%.<br>Объект расположен по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, ул. Старая, д. 54А.<br>**ЛОТ № 3**<br>**Здание общежития № 2**, общей площадью 124,0 м² с инвентарным № 631/С-61411, одноэтажное, деревянное с пристройкой, навесом, двумя уборными.<br>Начальная цена: **165 048 492** рубля без учета НДС 20%.<br>Объект расположен по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, ул. Старая, д. 48А.<br>**Объекты расположены в водоохранной зоне Вилейского водохранилища.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены.<br>Все желающие могут ознакомиться с документацией и объектом в ОАО «Алая заря». |
| **Порядок оплаты** | Победитель аукциона возмещает организатору фактические затраты, связанные с организацией и проведением аукциона и объявления в средствах массовой информации, которые сообщаются участникам до начала аукциона. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 20 календарных дней на р/с Продавца с момента заключения договора купли-продажи, который будет заключен с Победителем в течение 10 календарных дней после проведения аукциона. |
| **Сумма задатка** | **10%** от начальной цены на р/с 3012162241013 в ЦБУ № 504 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Молодечно, код 369, УНП 600182305, получатель: Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс» |
| **Продавец** | **ОАО «Алая заря»** Минская обл., Вилейский р-н, Кривосельский с/с, аг. Ерхи, ул. Новая, 9 тел.: 8(01771) 7-43-32, 7-43-35, 7-43-33 |
| **Организатор аукциона** | **Коммунальное Строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс»** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 11 |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность |
| **Информация по земельным участкам** | Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621383416601000184, расположенном по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, площадь – 0,1039 га, назначение – земельный участок для размещения объектов общественного питания (для обслуживания здания пищеблока);<br>Лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621383416601000182, расположенном по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, площадь – 0,1071 га, назначение – земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения (обслуживания общежития № 2);<br>Лот № 3 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621383416601000181, расположенном по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, площадь – 0,0582 га, назначение – земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения (обслуживания здания дома сезонного проживания); |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **18.02.2014 до 16⁰⁰,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 11, Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс», тел.: (8-0176) 73-00-13, (факс) 75-19-20; 8-044 710-74-60 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **24.02.2014 в 15⁰⁰**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 11, Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс» |
| **Условия проведения аукциона** | Продавец имеет право отказаться от проведения аукциона не позднее чем за три дня до даты его проведения. |

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - капитальное строение, инв. № 401/С-21527 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2 с принадлежностями: пристройка (38 кв.м), ограждение бетонное (114 кв.м), ограждение бетонное (142 кв.м), ограждение бетонное (37 кв.м), ограждение бетонное (121 кв.м), ворота металлические, калитка металлическая, площадка для мусора (9 кв.м), асфальтированная площадка (551 кв.м), навесы (2 ед. 46 кв.м), навес (45 кв.м), навес (47 кв.м), водопроводная сеть (16 м.п.), электрическая сеть (18 м.п.), электрическая сеть (20 м.п.), ограждение из металлической сетки (27 м.п.), ограждение площадки для мусора (4 м);<br>- капитальное строение, инв. № 401/С-21530 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/1;<br>- капитальное строение, инв. № 401/С-21529 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание павильона «Модуль»), расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/2;<br>- капитальное строение, инв. № 401/С-21528 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – уборная), расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/3;<br>- зеленые насаждения |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422050400000200439 площадью 1,4383 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений рынка) |
| **Начальная цена продажи** | 2 858 907 600 (два миллиарда восемьсот пятьдесят восемь миллионов девятьсот семь тысяч шестьсот) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 285 890 760 (двести восемьдесят пять миллионов восемьсот девяносто тысяч семьсот шестьдесят) белорусских рублей |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин) общей площадью 235,7 кв.м. |
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Кстинская, 18 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422080407101000085 площадью 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина) |
| **Начальная цена продажи** | 1 097 200 000 (один миллиард девяносто семь миллионов двести тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 109 720 000 (сто девять миллионов семьсот двадцать тысяч) белорусских рублей |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230003, г. Гродно, Озерское Шоссе, 41, тел. 74-68-07 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 21 февраля 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.11.2013 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 17 февраля 2014 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

---

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» <u>13 марта 2014 года</u> проводит <u>3-ий</u> открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 36 | Грузовой Кам-АЗ-43105 шасси № 500 двигатель № 061710 1984 г. 69008 км | в/г Околица, Минский р-н | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 37 | Грузовой КамАЗ-43106 ш. 0006091 дв. 0716664 1990 г. 3 кат. 132620 км | г. Фаниполь, в/ч 30151 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 38 | Мастерская МТО-В № С35113 на ЗИЛ-131 ш. 622930 дв. 313892 1985 г. 3 кат. 1312 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 117 000 000 | 11 700 000 |
| 39 | Мастерская МТО-В № С35112 на ЗИЛ-131 ш. 623716 дв. 319307 1985 г. 3 кат. 1358 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 117 000 000 | 11 700 000 |
| 40 | Мастерская МТО-В № С35114 на ЗИЛ-131 ш. 622003 дв. 311101 1985 г. 3 кат. 1193 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 117 000 000 | 11 700 000 |
| 41 | Мастерская МТО-В № С35121 на ЗИЛ-131 ш. 628366 дв. 339892 1985 г. 3 кат. 1120 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 117 000 000 | 11 700 000 |

Условия и порядок проведения аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 06.02.2014 № 22

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by**

УНП 101099370

---

**Вниманию акционеров!**

## ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции»,

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ «14» марта 2014 года ГОДОВОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Повестка дня:**

**1.** Отчет «Об итогах работы Общества за 2013 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2014 год».
**2.** Отчет Наблюдательного совета о работе в 2013 г.
**3.** Отчет ревизионной комиссии о работе в 2013 г. Заключение ревизионной комиссии по бухгалтерскому отчету Общества за 2013 год.
**4.** Утверждение бухгалтерского отчета Общества и направлений использования чистой прибыли за 2013 год, в т.ч. утверждение размера дивидендов за второе полугодие 2013 года.
**5.** О плане распределения чистой прибыли Общества на 2014 год.
**6.** Утверждение условий материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
**7.** О внесении изменений в Устав Общества
**8.** Выборы членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Собрание состоится по адресу: **г. Солигорск , ул. Л. Комсомола, 42, Дом культуры «Строитель», начало в 16.00.**

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: **г. Солигорск, ул. Козлова, 37 в кабинете бухгалтерии с 07 марта по 13 марта 2014 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв на обед – с 13.00 до 14.00), а в день проведения собрания – в помещении Дома культуры «Строитель».**

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен **по состоянию на 01.03.2014 г.**

Регистрация участников собрания будет производиться **с 15.15 до 15.45 по месту проведения собрания.**

<u>Для регистрации при себе иметь следующие документы:</u> акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНН 600122771 *Наблюдательный совет*

---

**О Б Ъ Я В Л Е Н И Е**

**14 февраля 2014 года СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Камволь»

Собрание пройдет по месту расположения Общества: **г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4-ый этаж главного корпуса.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О согласовании крупной сделки на получение кредита в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 510 от 14.11.2013 года для реализации инвестиционного проекта «Создание нового производства по выпуску конкурентоспособных тканей бизнес- и эконом-классов в условиях ОАО «Камволь».

*Докл. Гавриленко В.В. – генеральный директор.*

2. О согласовании крупной сделки по аккредитивам для расчетов с поставщиками оборудования для реализации инвестиционного проекта.

*Докл. Гавриленко В.В. – генеральный директор.*

**С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, тел.: 223 14 20, 2 97.**

Начало работы собрания — **10.00.**

Регистрация участников собрания — **с 09.30 до 10.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 07.02.2014 г.**

**Для регистрации при себе иметь паспорт.** УНП 100074393.

---

В **суд Лельчицкого района** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим ШЕЙКО Жикр Хун Рашида, 20.01.1985 года рождения, уроженца Алеппо Сирийской Арабской Республики, последнее место жительства: г. Гомель, ул. Советская, д. 104, к. 5-9 (отдел международных связей ГГУ им. Ф. Скорины) с предложением ко всем гражданам и юридическим лицам в течение двух месяцев с момента публикации сообщить о данном гражданине сведения в суд Лельчицкого района.

---

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**(о проекте строительства жилого дома № 21Б (по генплану) объекта «Строительство двух многоквартирных жилых домов серии М464-У1 со встроенным отделением Сбербанка, продовольственным магазином и административным помещением на месте жилого дома № 21 по генплану в микрорайоне Каменная Горка-4»)**

**<u>Информация о застройщике</u>**

Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30 – 17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства – 16 месяцев.
2. Жилой дом № 22 по ул. Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
3. Жилой дом № 26 по ул. Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.

**<u>Информация о проекте строительства</u>**

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома, в том числе с привлечением к строительству 50% дольщиков из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по направлению администраций районов г. Минска и граждан из числа «обманутых дольщиков», пострадавших при заключении договоров создания объектов долевого строительства, 10% дольщиков из числа работников ОАО «МАПИД», состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Положительное заключение государственной экспертизы № 1096-15/12 от 29.11.2012 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Фрунзенский район, жилой дом № 21Б по генплану «Строительство двух многоквартирных жилых домов серии М464-У1 со встроенным отделением Сбербанка, продовольственным магазином и административным помещением на месте жилого дома № 21 по генплану в микрорайоне Каменная Горка-4».

**<u>Характеристика объекта</u>**

Объект – 152-квартирный, 10-этажный крупнопанельный жилой дом серии М464-10-У1 с помещением товарищества собственников и административным помещением, не входящими в состав общего имущества дома. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся с выполнением в полном объеме отделочных, сантехнических и электротехнических работ, предусмотренных проектно-сметной документацией. Остальные квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, – **11 200 000 руб.**

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 4012 от 27 декабря 2012 г., свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 18 февраля 2013 г. № 500/451-6181. Площадь земельного участка – 0,2753 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 152.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности: помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие не несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – август 2014 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решений Мингорисполкома № 4012 от 27 декабря 2012 г., № 2577 от 10 октября 2013 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 3 (три) квартиры, из них 1 однокомнатная общей площадью 40,62 м² жилой площадью 17,10 м², 2 трехкомнатные общей площадью 79,80 м² жилой площадью 47,21 м².

**<u>Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:</u>**

Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет № 1, тел. 207-19-15) ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

---

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**(о проекте строительства «Жилая многоквартирная застройка со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого в г. Минске. 3-я очередь строительства. Жилой дом № 2»)**

**<u>Информация о застройщике</u>**: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник –четверг – 8.30 – 17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства – 16 месяцев.
2. Жилой дом № 26 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
3.Жилой дом № 22 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.

**<u>Информация о проекте строительства:</u>**

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома со встроенными административными помещениями, расположенными на 1-м этаже, каждое общей площадью 107,84 м².

Положительное заключение государственной экспертизы № 1026-15/12 от 16.11.2012 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Фрунзенский район, жилой дом № 2 по генплану в жилой многоквартирной застройке со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого. 3-я очередь строительства.

**<u>Характеристика объекта.</u>**

Объект – 126-квартирный, 19-этажный крупнопанельный жилой дом серии М-111-90 со встроенными административными помещениями и помещением товарищества собственников на первом этаже. Административные помещения и квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, строятся без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий: – **11 200 000** руб., для административных помещений – **13 800 000 руб**.

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс-мажорных обстоятельств и других не зависящих от застройщика причин. При этом застройщик при достройке объекта вправе применять индексацию стоимости выполняемых работ в течение всего дополнительного срока строительства. Изменение цены объекта долевого строительства также возможно в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, если они оказали влияние на цену объекта долевого строительства.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 3531 от 22 ноября 2012 г., свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 29 декабря 2012 г. № 500/1001-1788. Площадь земельного участка – 4,1803 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 126.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие не несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Начало строительства жилого дома – 1-й квартал 2013 г., предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 2-й квартал 2014 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 3531 от 22 ноября 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 3 административных помещения, расположенных на первом этаже жилого дома, каждое общей площадью 107,84 м². Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 3 квартиры: 1 однокомнатная квартира общей площадью 44,92 м² жилой площадью 17,96 м², 1 двухкомнатная квартира общей площадью 60,32 м² жилой площадью 31,09 м² и 1 трехкомнатная квартира общей площадью 77,8 м² жилой площадью 45,1 м².

**<u>Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:</u>**

Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет № 1, тел. 207-19-15), ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник-четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**




# ЗІМА. ПОЎДЗЕНЬ. АЛІМПІЯДА

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

***— Як вы сябе адчуваеце зараз, напярэдадні старту?***

— Пройдзены курс лячэння і рэлаксацыі дапамог эмацыянальна і фізічна аднавіцца. Спіна, бывае, крыху баліць. Але гэта ўсё ў «штатным рэжыме», скачкам не перашкаджае. Так што пік формы падводзім менавіта да Сочы. Такое нетаропкае развіццё сезона было запланавана, і я не разлічваў на тое, каб браць прызавыя месцы на этапах Кубка свету. Хацеў проста трэніравацца, набіраць форму і «стрэліць» менавіта на Алімпіядзе. Здаецца, усё атрымліваецца.

***— Каго, на ваш погляд, трэба найбольш асцерагацца на Алімпіядзе — кітайцаў, расіян, амерыканцаў?***

— Беларусаў *(смяецца)*! Асноўная барацьба — кітайцы, беларусы, канадцы. Можа, нехта з амерыканцаў. У прынцыпе, лыжная акрабатыка — гэта такі від спорту, дзе можна чакаць сюрпрызу ад каго заўгодна. Любы фаварыт можа паслізнуцца, як той казаў, на роўным месцы, а нейкі «цёмны конік» выканае ўсе элементы бездакорна. Тут усё залежыць ад нерваў, ад сілы волі, ад жадання, нарэшце...

***— Сочы знаходзіцца ў субтропіках, зусім не зімовы горад. Як вам здаецца, гэтая акалічнасць можа паўплываць на ход спаборніцтваў?***

— Не думаю. Мы выступалі чатыры гады ў Ванкуверы ў падобных умовах, ды і італьянскі Турын — таксама зусім не паўночны горад. Для спаборніцтваў арганізатарамі створаны ўсе ўмовы. Так што ўсё павінна быць проста выдатна! Веру ў гэта.

***— Хто асабіста вас будзе падтрымліваць у Сочы?***

— Веру, што ўсе вы, уся краіна. Што датычыць родных, сяброў, то яны прыедуць сюды бліжэй да стартаў у нашым відзе праграмы. Цяпер трэба сканцэнтравацца на трэніроўках.

Як бачым, чэмпіён Ванкувера ўпэўнены ў сваіх сілах. І было б вельмі добра, каб такая ўпэўненасць перадалася і яго калегам па алімпійскай дружыне. Хацелася запытаць у Аляксея, як бы ён пракаментаваў рашэнне Дашы Домрачавай адмовіцца ад ролі сцяганосца беларускай дружыны, якая ёй была прапанавана. Але не стаў гэтага рабіць. Гэта — рашэнне Дашы. Двухразовая чэмпіёнка свету па біятлоне паведаміла журналістам, што сапраўды адмовілася ўзначальваць калону беларускіх алімпійцаў на адкрыцці Гульняў у Сочы. «Так, несці сцяг мне прапаноўвалі, сказала яна. Вядома, гэта вялікі гонар для мяне. Але мы з нашым трэнерскім штабам вымушаны былі адмовіцца. Мы і раней планавалі не ўдзельнічаць у самой цырымоніі адкрыцця (яна зацягнулася да поўначы), таму што на наступны дзень у нас — афіцыйная трэніроўка, а праз дзень — і першая гонка».

...Вядома, усе мы будзем перажываць і за Аляксея Грышына, і за Дар'ю Домрачаву, і за Сяргея Далідовіча, і за Антона Кушніра і за ўсіх тых, хто сёння




рыхтуецца да стартаў. Мы спадзяёмся на іх перамогі ў Сочы. Ну а што датычыць розных размоў кшталту «захацела-не захацела», «правільна-няправільна», то хачу нагадаць, што такая падзея планетарнага маштабу, як Алімпійскія гульні, ніколі не абыходзіцца без іх.

Але што б мы рабілі, каб у спорце не было яркіх асоб? Вы паглядзіце, колькі страціў, напрыклад, сусветны біятлон у сваім відовішчы, літаральна «выцвіў», калі вялікі спорт пакінула 25-гадовая Магдалена Нойнер. Немка вырашыла прысвяціць сябе сям'і. А мы страцілі інтрыгу. Бо такога напружання на трасе, калі побач ішлі Нойнер і Домрачава, цяпер няма. Нарвежка Тура Бергер, на мой погляд, наймацнейшая сёння ў жаночым біятлоне, — ідэальная ў сваіх паводзінах і на трасе, і ў жыцці, каб пра яе можна было нешта сказаць.

Чакаем працягу.




**Гэтыя людзі могуць валодаць тэлепатычнымі здольнасцямі і прагназаваць падзеі, таму даволі часта кантралююць любую сітуацыю, накіроўваючы яе ў неабходнае рэчышча. Сярод іх ёсць празорліўцы, якія здольны чытаць думкі іншых і перадаваць свае. Нават самыя звычайныя індывідуумы валодаюць ярка выражаным шостым пачуццём. Перш чым дзейнічаць, яны ацэньваюць сітуацыю з усіх бакоў, каб пазбегнуць памылак. Знешне яны выглядаюць гультаяватымі летуценнікамі, але роўных ім па майстэрстве і таленце цяжка адшукаць.**




**Яны заўсёды знаходзяцца ў гушчыні падзей, але дзейнічаюць там спантанна і даволі нечакана. Яны ўмеюць пераўтвараць негатыўныя сітуацыі ў станоўчыя, таму іх цягне да тых, хто трапіў у цяжкае становішча. Яны заўсёды падтрымаюць і суцешаць, удыхнуць надзею. У эмацыянальным плане яны — натуры ўзрыўныя, бывае, агрэсіўныя, часта даволі непрадказальныя, знаходзяцца ў пастаянней барацьбе паміж цёмнымі і светлымі бакамі саміх сябе. Для іх важна авалодаць здольнасцю стрымліваць сябе і пазбягаць небяспекі «згарэць».**

Даты | Падзеі | Людзі

**1834** год — нарадзіўся Дзмітрый Іванавіч Мендзялееў, рускі хімік, член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук, прафесар Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. У 1869 годзе адкрыў адзін з асноўных законаў прыродазнаўства — закон перыядычнай залежнасці ўласцівасцяў хімічных элементаў ад іх атамных мас. Аўтар больш як 500 друкаваных работ, сярод якіх класічныя «Асновы хіміі» — першае дэталёвае выкладанне неарганічнай хіміі. Яго імем названы вуліцы ў Бабруйску, Гомелі, Гродне, Лідзе, Мінску і іншых гарадах.

**1914** год — нарадзіўся Валянцін Таўлай, беларускі паэт, дзеяч рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.



З 1932 года на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў. У 1934 годзе быў арыштаваны, асуджаны на 8 гадоў турмы. З 1939 года ў раённым перыядычным друку на Гродзеншчыне. Удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1945-47 гг. працаваў у Літаратурным музеі Я.Купалы. Аўтар зборнікаў вершаў, паэм, літаратурна-крытычных артыкулаў пра творчасць Я.Купалы, Я.Брыля, П.Пестрака і інш. Памёр у 1947 годзе.

**1919** год — быў апублікаваны дэкрэт Саўнаркама РСФСР, падпісаны Леніным, «Аб увядзенні вызначэння часу па міжнароднай сістэме часовых паясоў. Краіна была падзелена на 11 часовых паясоў (з другога па дванаццаты). Але з-за тэхнічных цяжкасцяў ажыццяўленне дэкрэта было адтэрмінавана да 1 ліпеня 1919 года. Праз пяць гадоў, 15 сакавіка 1924-га, адпаведнай пастановай Саўнаркама СССР вызначэнне часу па міжнароднай сістэме часовых паясоў было ўведзена ўжо на ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза.

Было сказана

**Эрых Марыя РЭМАРК,
нямецкі пісьменнік:**

***Калі хочаш што-небудзь зрабіць, ніколі не пытайся пра наступствы. Інакш так нічога і не зробіш.***

# ЧЫМ ЗДЗІЎЛЯЮЦЬ СОЧЫ?

**Краіны-ўдзельніцы, спартсмены, фінансы, стадыёны, жарты, медалі і талісманы. «Звязда» склала падборку фактаў, якія варта ведаць кожнаму аматару спорту пра 22-я зімовыя Алімпійскія гульні.**

## Ад Хахенлохе да Банані



Мексіканскі спартыўны доўгажыхар Хубертус фон Хахенлохе.

Як ужо пісала наша выданне, сваіх прадстаўнікоў у Расію накіравалі 88 краін з усёй планеты. Такім чынам сёлетнія Гульні ўжо пабілі рэкорд Алімпіяды ў Ванкуверы, дзе сваіх спартсменаў прадставілі 82 дзяржавы. Цікава, што ў алімпійскай вёсцы знайшлося месца нават для спартсменаў з тых мясцін, якія ў звычайнага заўзятара не асацыююцца з зімовымі відамі. Напрыклад, гарачую карыбскую Дамініку ў Сочы будуць абараняць муж і жонка — лыжнікі Гары і Анжэліка дзі Сільвестры; Пакістан — гарналыжнік Мухамед Карым; Тонга — саначнік Бруна Банані; афрыканскую краіну Тога — лыжніца і гарналыжніца Мацільда-Аміві Пеціджан, Алесія Афі Дыполь, Ямайку — забаўныя бабслеісты Уінстан Уот і Марвін Дзіксан, якія, напэўна, так узрадаваліся ўдзелу ў Гульнях, што па дарозе ў Сочы згубілі свой двухмесны боб. На іх шчасце, груз знайшоўся і наступным рэйсам трапіў у аэрапорт.

Самым высокім удзельнікам Алімпіяды называюць славацкага хакеіста Здэнэка Хару (206 см), самым сталым — 55-гадовага мексіканскага гарналыжніка Хубертуса фон Хахенлохе, наймаладзейшым — японскага сноўбардыста Аюму Хірама. 29 лістапада цінэйджару споўнілася толькі 15 гадоў!

## Талісманы

Апекунамі сочынскіх Гульняў абралі адразу трох талісманаў — Леапарда, Белага мядзведзіка і Зайку. Пачэснае права забаўляць народ у Сочы пералічаныя звяры вырвалі ў барацьбе з Дзедам Марозам, Гілём, Сонейкам, Дэльфінам...



Біяграфіі ў сочынскіх талісманаў багатыя на разнастайныя факты з прыдуманага жыцця. Зайка, між іншым, вучыцца ў Лясной Акадэміі, дапамагае працаваць маці ў рэстаране «Лясная запруда». Леапард жыве на Каўказе і працуе альпіністам-выратавальнікам, а Белы мядзведзь у дзяцінстве гадаваўся палярнікамі і навучыўся ад іх катацца на лыжах і гуляць у кёрлінг. Вышэйзгаданы склад талісманаў выклікаў не толькі дзіцячае захапленне, але і крытыку. Напрыклад, Віктар Чыжыкаў, стваральнік добра вядомага Мядзведзіка, сімвала маскоўскай Алімпіяды, лічыць Белага мядзведзя клонам свайго мастацкага твора. «У яго аблічча ўсё сцягнута з майго: вочы, нос, рот, усмешка. Хоць усё скажонае. Ні ў адным талісмане няма сур'ёзнага падыходу да справы». А Сусветны фонд дзікай прыроды Расіі прапанаваў наогул перамаляваць леапарда, бо, як лічыць фонд, на эмблеме прысутнічае выява снежнага барса, які на Каўказе ніколі не жыў.

## Медалі

Спецыяльна для Гульняў расійская ювелірная кампанія «Адамас» падрыхтавала 1254 каштоўныя кругляшы, агульная колькасць якіх з'яўляецца адмысловым рэкордам Алімпіяды. На адным баку кожнага медаля — выява алімпійскіх кольцаў, а на адваротным баку на англійскай мове адліты від спаборніцтва і лагатып Гульняў. На выраб медалёў пайшло 3 кг золата, 2 тоны серабра і 700 кг бронзы. Цікава, што самі ўзнагароды ў Сочы будуць перавозіць у спецыяльных браніраваных аўтамабілях у суправаджэнні 30 ахоўнікаў.

## Аб'екты

На будаўніцтва спартыўных аб'ектаў і інфраструктуру Расія патраціла 214 мільярдаў рублёў. Толькі адна рэканструкцыя аэрапорта «Сочы» каштавала 690 мільёнаў долараў! Адным з асноўных алімпійскіх аб'ектаў Алімпіяды называюць стадыён «Фішт». Сваю назву арэна атрымала дзякуючы аднайменнай горнай вышыні, якая знаходзіцца ў Галоўным Каўказскім хрыбце. Менавіта тут прайшла цырымонія адкрыцця і адбудзецца цырымонія закрыцця Алімпіяды. Сам стадыён знаходзіцца ў Адлеры, у Алімпійскім парку, і адначасова можа змясціць на трыбунах 40000 гледачоў. Спаборніцтвы па хакеі адбудуцца ў лядовых палацах «Вялікі» і «Шайба». Беларускія біятланісты і лыжнікі аспрэчаць медалі ў комплексе «Лаура», які размешчаным у так званым горным кластары.

А вось вам прыклад суседства, пра якое наўрад ці задумваўся нехта з балельшчыкаў і спартсменаў. Пасярод Алімпійскага парку знаходзяцца... стараверскія могілкі. Яшчэ ў 2008 годзе некропаль хацелі зруйнаваць, аднак старавeры мітынгавалі, кладіся пад тэхніку і месца пахавання прашчураў адстаялі. А схаваць аб'ект, які перад забудовай не быў пазначаны на гарадскіх планах тэрыторый, на час Гульняў вырашылі за буйнымі чырвонымі шчытамі.

## Бяспека

Апошнія тэрарыстычныя акты ў Валгаградзе чарговы раз нагадалі ўсім пра традыцыйныя праблемы Расіі і напалохалі не толькі спартсменаў-удзельнікаў, але і тысячы патэнцыйных турыстаў. Праўда, на думку Дзмітрыя Пяскова, прэс-сакратара Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, меры бяспекі ў Сочы адпрацаваны на ўсе 100%. Узмоцненыя меры ў горадзе-курорце дзейнічаюць яшчэ з 7 студзеня. Працаваць у дні спартыўных стартаў у Сочы будуць 37 тысяч паліцэйскіх. Дапамагаюць расійскім спецслужбам і і замежныя калегі, а дзяжурыць у чарнаморскіх водах падчас спаборніцтваў будзе некалькі амерыканскіх вайсковых караблёў. Пасажырам прыгарадных электрычак забаронена правозіць прадукты і лекі, а ў аэрапорце ўзмоцнены дагляд ручной паклажы і электронных прылад.

## Жарты



Сочынская Алімпіяда толькі стартавала, але ўжо паспела абрасці жартамі і кур'ёзнымі выпадкамі. Асабліва гумарысты любяць пажартаваць з фінансавых выдаткаў, гігантызму алімпійскай будоўлі. Маўляў, «арганізатары Алімпіяды ў Сочы вырашылі зрабіць усё так маштабна, што замест факела два тыдні будзе гарэць Адлер». Не паспелі спартсмены абжыць алімпійскую вёску, як у інтэрнэце пачалі з'яўляцца фотасюжэты пра рускіх «вынаходнікаў», якія спраектавалі кабінкі ў прыбіральнях з двума ўнітазамі, батарэю на ўзроўні столі, разетку, што знаходзіцца пад падушкай. Паглядзім, што будзе далей.

## Падарунак

Нягледзячы на пэўны дыскамфорт, арганізатары падрыхтавалі для спартсменаў выдатныя падарункі. Кожны алімпіец атрымае смартфон Samsung Galaxy Note 3 з 13-мегапіксельнай камерай.

Карацей, добрая дапамога для стварэння сапраўднага алімпійскага фотаальбома. Спадзяёмся, нашы перамогі абавязкова трапяць і ў аб'ектыў беларусаў.

**Факты збіраў Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Медыя-дэбют

# НАШ СПОРТ... НА СТАРОНКАХ ЧАСОПІСА

**Сектар спартыўнай прэсы папоўніўся новым выданнем. Днямі выйшаў першы нумар часопіса «Наш спорт».**




Кіраўнік праекта і галоўны рэдактар выдання — былы супрацоўнік газеты «Звязда», спартыўны журналіст з шматгадовым вопытам Уладзімір Здановіч. У часопісе можна знайсці здымкі вядомых спартыўных фатографаў Генадзя Сямёнава, Сяргея Невяркевіча, Сяргея Шэлега. Дарэчы, ужо першы нумар зацікаўлівае шэрагам эксклюзіўных матэрыялаў, сярод якіх інтэрв'ю з адным з лепшых гандбалістаў свету Сяргеем Рутэнкам, праслаўленым беларускім хакеістам Міхаілам Грабоўскім, легендай расійскага хакея Аляксандрам Авечкіным. На старонках з гэтымі матэрыяламі можна пабачыць пажаданні і аўтографы спартсменаў. Варта адзначыць, што сёння «Наш спорт» — адзін з нешматлікіх спартыўных часопісаў у Беларусі.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■ Здарэнне

## УСПЫХНУЎ ХАЛАТ

Няшчасны выпадак адбыўся ў Дзяржынскім раёне: на 84-гадовай бабулі з-за асабістай неасцярожнасці загарэўся хатні халат... Здарэнне адбылося ўдзень, калі пажылая жанчына гатавала на газавай пліце ежу. Пенсіянерка пражывала з сынам, але на той момант ён знаходзіўся на вуліцы. Жанчыну шпіталізавалі ў рэанімацыю Дзяржынскай ЦРБ з апёкамі рук, ног, спіны, галавы (80 працэнтаў цела). Наступнай раніцай ад атрыманых траўмаў пацярпелая памерла.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УЦЕЧКА МАЗУТУ ЛІКВІДУЕЦЦА

На міні-ЦЭЦ «Заходняя», якая знаходзіцца ў Пінску, у выніку парыву трубы выцекла вялікая колькасць мазуту. Мазут захоўваўся ў якасці рэзервовага паліва. Аварыю заўважыў адзін з работнікаў ЦЭЦ. Пасля гэтага ўцечка была спынена і персанал прыступіў да ліквідацыі наступстваў. Як паведамілі ў абласным упраўленні МНС, надзвычайнай сітуацыі ў сувязі з уцечкай няма. Сабраць каля тысячы тон паліва можна за чатыры-пяць дзён. Магчымы ўрон прыродзе спецыялісты адпаведных службаў вызначаць пасля ліквідацыі наступстваў аварыі.

**Яна СВЕТАВА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ

## Салата «Сэрца»



Спатрэбіцца: *1 курынае філе, 2 цыбуліны, 2 морквы, 3 яйкі, 50 г грэцкіх арэхаў, 1-2 буракі, 150 г сыру, 3-4 ст. л. маянэзу, 1 гранат.*

Загадзя трэба зварыць моркву, яйкі і бурак у звычайнай вадзе, а курынае філе — у падсоленай, і астудзіць. Цыбулю дробна рэжам, абсмажваем на алеі да залацістага колеру. Бурак, моркву і сыр надзіраем на тарцы. Яйкі дробна сячэм ці таксама надзіраем на тарцы. Арэхі дастаткова здрабніць нажом, не расціскайце.

Выкладваем на блюдзе слаямі (адразу сэрца не атрымаецца, таму робім звычайную круглую салату — потым выражам, лішняе з'ядзім, а блюда вытрам сурвэткай) і кожны прамазваем маянэзам. 1-ы слой: курынае філе паперчанае. 2-і: абсмажаная цыбуля. 3-ці: дзёртая морква. 4-ты: яйкі. 5-ты: дзёрты сыр і арэхі. 6-ты: дзёрты бурак. Зверху салаты раскідаць зярняткі граната.

## Бульбяныя ружы



Спатрэбіцца: *бульба, алей, соль, зубачысткі.*

Наразаем тонкія скрылікі з бульбы пры дапамозе агароднінарэзкі. Бульбяныя скрылікі і зубачысткі кладзем у салявы раствор на 10-15 хвілін. Скрылікі становяцца мяккімі і не ламаюцца пры вырабе ружы, а зубачысткі не гараць падчас смажання ў фрыцюры.

Пачынаем рабіць ружу. Бярэм скрылік бульбы і згортваем яго. На першы пялёстак дадаем другі і гэтак далей. Перыядычна сколваем іх зубачысткамі, каб пялёсткі не распадаліся. Выкладваем гатовыя ружы на ручнік, каб сышла вільгаць. Смажым у фрыцюры. Можна смажыць у духоўцы, папярэдне апырскаўшы алеем.



УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## Валянцінкі

### КАВАВАЕ ПАНО



Выразаецца з кардону сэрца. Памер залежыць ад вашых пажаданняў, але аптымальна — не буйнейшы за чайны сподак. Роўным пластом 3-4 мм выкладваецца пластылін чорнага ці карычневага колеру, да якога і мацуюцца кававыя зярняткі. Пачынаць трэба з краёў, каб зярняткі кавы ляглі роўна і прыкрывалі край кардону. Потым па спіралі выкладваем зярняткі да цэнтра. Пасля гэтага абавязкова пакладзіце нарыхтоўку на некалькі хвілін у халадзільнік, каб пластылін зацвярдзеў. Сэрцайка мацуецца на кардон (лепш тэкстурны, а не гладкі) з дапамогай клею, устаўляем пано ў рамачку. Такое прызнанне ў каханні можа ўпрыгожваць пакой ці кухню ўвесь год.

### КУБКІ З ПРЫЗНАННЯМІ Ў КАХАННІ



Набывайце самыя простыя аднатонныя кубкі і каляровыя маркеры для шкла і керамікі (яны ёсць ва ўсіх крамах для творчасці). Малюйце сэрцайкі, пішыце імёны і прыгожыя словы. У любым выпадку атрымаецца кубак, якога больш ні ў каго няма! Да такога кубка і пакецікі чайныя трэба падрыхтаваць.

### ШАКАЛАДКІ-ВАЛЯНЦІНКІ

Зрабіць новую абгортку для маленькай шакаладкі (малюсенькія «Алёнкі» падыдуць) вельмі проста — гэта звычайная палоска паперы. Колькі сэрцайкаў намаляваць і які зрабіць надпіс — вам вырашаць.

### ПЯЧЭННЕ-СЭРЦАЙКІ



З пясочнага цеста раскачаць пласт таўшчынёй 5—7 мм, выразаць формачкай сэрцайкі. Дзірачку для тасьмы трэба зрабіць ДА выпякання печыва трубачкай-саломінкай для сокаў. Выпякаем пячэнне і гатовае ўпрыгожваем стужачкай.

### ВАЛЯНЦІНКІ З ПАПЕРЫ



Уяўляеце, колькі пяшчотных слоў можна напісаць на старонках кніжачкі-сэрца дробным почыркам!..

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 8.44 | 18.04 | 9.20 |
| Віцебск | — 8.37 | 17.50 | 9.13 |
| Магілёў | — 8.34 | 17.54 | 9.20 |
| Гомель | — 8.26 | 17.56 | 9.30 |
| Гродна | — 8.58 | 18.20 | 9.22 |
| Брэст | — 8.54 | 18.25 | 9.31 |

**Месяц**

***Першая квадра 6 лютага. Месяц у сузор'і Блізнятаў.***

**Імяніны**

***Пр.** Марыі, Антона, Аркадзя, Івана, Іосіфа, Пятра, Сямёна.*
***К.** Гераніма, Пятра, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +4..+6°C | КІЕЎ +2..+4°C | РЫГА +2..+4°C |
| ВІЛЬНЮС +3..+5°C | МАСКВА 0..+2°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ -1..+1°C |

## УСМІХНЕМСЯ

— Раней наш сабака займаў першае месца ў сэрцы маёй жонкі. Цяпер гэтае месца заняў я!

— І як жа табе гэта ўдалося?

— Разумееш, сабака не есць тое, што гатуе жонка. А я ем!

**Аб'ява ў бібліятэцы ВНУ:**

**«Паважаныя студэнты! Звяртаючыся да бібліятэкара, паспрабуйце ўспомніць не толькі колер і габарыты патрэбнай вам кнігі, але таксама яе назву і аўтара!».**

— Рабіновіч, а чаму вы з Софай расталіся?

— Дык разумееце, яна два месяцы ныла на тэму: «Ты мяне зусім не кахаеш».

— І такі што?

— Такі пераканала...




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 21.855. Індэкс 63850. Зак. № 473.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 лютага 2014 года.